Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 24 (4467) 13 чэрвеня 2008 г.

У нумары:

Моцныя духам адзінства

Усебеларускі фестываль нацыянальных культур — унікальны дыялог грамадзян Беларусі.

Стар. 5

«...Адрынуўшы глупства паперы»

Агляд майскіх нумароў часопісаў «Полымя», «Нёман», «Маладосць».

Стар. 7

Называць рэчы сваімі імёнамі

Пытанне: «Хто такая Жана Капуста?» — вычарпана.

Стар. 12

Вежы над горадам

Старажытная царква ў Клецку зведала тое ж, што і яе прыхаджане.

Стар. 13

Блакітны спадман, альбо Пагаворым пра душу

Той, хто не глядзеў тэлеспектакль «Паўлінка-нью», — шчаслівы.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6720 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8710 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6820 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Тут — гісторыя роду Луцэвічаў

Да 60-годдзя філіяла ў Вязынцы

20 чэрвеня 1948 года, на былым хутары Вязынка, дзе нарадзіўся беларускі пясняр, быў адкрыты першы філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы. Пра неабходнасць яго стварэння загаварылі адразу пасля вайны. У тыя часы ў доме Луцэвічаў жылі бежанцы са Смаленска, якіх пасля перасялілі ў вёску. У 1945 годзе выйшла пастанова "Аб увекавечанні памяці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы", а ў 1946-м хата Луцэвічаў была пазначана мемарыяльнай дошкай. Запаведнікам радзіма класіка стала пазней — у 1972-м.

Тады ж быў адноўлены дом — па сутнасці ён наноў пабудаваны на старым падмурку. Ад той хаты, куды ў 1881 годзе пераехалі бацькі паэта, засталіся толькі шэсць бярвенняў, якія сёння з'яўляюцца часткай экспазіцыі музея. Акрамя мемарыяльнага дома, на тэрыторыі запаведніка (які займае больш як 20 гектараў) знаходзіцца свіран, сажалка, крынічка, камяні-валуны з выбітымі на іх купалаўскімі радкамі, старыя ліпы і вербы, магутныя 200-гадовыя дубы — маўклівыя сведкі дзяцінства паэта, а таксама помнік песняру, зроблены скульптарам Заірам Азгурам. Дарэчы, гэты бюст перавезлі сюды з мінскага Александрыйскага сквера таксама ў 1972-м.

Сёння ў фондах запаведніка — больш як тысяча экспанатаў. "Луцэвічы жылі ў гэтым доме зусім непрацяглы час, таму аўтэнтычных рэчаў захавалася вельмі мала", — распавядае загадчыца філіяла Ірына Трутнева. Многія экспанаты збіраліся па навакольных вёсках, а самыя цікавыя трапілі ў музей з сямейнага архіва ўдавы Купалы Уладзіславы Францаўны. У музеі захоўваюцца дакументы, аўтабіяграфічныя матэрыялы, фотаздымкі, творы мастакоў, якія адлюстроўваюць дзіцячыя і юнацкія гады Купалы. У той частцы хаты, дзе калісьці жыла сям'я Луцэвічаў, створана атмасфера сялянскага дома канца XIX стагоддзя, узноўлены побыт і традыцыі. У гісторыка-літаратурным раздзеле экспазіцыі адлюстроўваецца гісторыя роду Луцэвічаў — прадстаўлены радавод да XVII стагоддзя.

У вёсцы Вязынка дагэтуль жыве адна з першых супрацоўніц філіяла Аляксандра Антонаўна Тарасік, якая аддала гэтай справе 40 гадоў свайго жыцця. На самым пачатку, калі тут працавала ўсяго некалькі чалавек, яна выконвала ў музеі адразу шмат абавязкаў — і прыбірала, і даглядала за садам, а магла і экскурсію правесці.

Сёння па рашэнні ЮНЕСКА Вязынка ўключана ў міжнародны маршрут турызму. Але колькасць наведвальнікаў гэтага чароўнага месца значна меншая, чым у былыя часы. "Калісьці Вязынка ўваходзіла ва ўсесаюзны турыстычны маршрут, і сюды прыязжала каля ста тысяч чалавек за год", — распавядае І. Трутнева. — Цяпер наведвальнікаў таксама шмат — прыкладна 7 тысяч, але гэта, канечне, цяжка параўнаць з тым, што было раней".

Юбілей плануецца адзначаць на Купалле разам з днём нараджэння паэта. Да самай восені ў былым свіране праходзяць выставы фларыстыкі віцебскага клуба "Анюта" і работ народных майстроў паводле матываў твораў Купалы, прымеркаваныя да 60-годдзя філіяла.

Саша ДОРСКАЯ

Візіт чарадзея

Днём адкрыццяў стаўся для Мінска самы звычайны летні будзень. Тады, 3 чэрвеня, адбылося ўрачыстае адкрыццё пасольства Венгрыі ў нашай краіне. Да гэтай падзеі было прымеркавана і адкрыццё персанальнай выстаўкі выдатнага венгерскага мастака-графіка і мультыплікатара Лівіуса Дзюлаі. А яго вернісаж азнаменаваў адкрыццё новай выставачнай галерэі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Якая рэдкасная магчымасць: не пакідаючы родны горад, спрычыніцца да творчасці аднаго з вядучых прадстаўнікоў еўрапейскай мастацкай эліты! Апроч таго, пабачыць гэтага вялікага сучаснага майстра, які завітаў у Мінск на два дні: удзельнічаў ва ўрачыстым адкрыцці сваёй выстаўкі, сустракаўся са студэнтамі ды выкладчыкамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, знаёміўся з нашай сталіцай. Прыемна ўражаны, Лівіус Дзюлаі выказаў надзею на хуткі працяг і развіццё беларуска-венгерскіх стасункаў у сферы выяўленчага мастацтва.

Наш госць, якому летась споўнілася 70, нарадзіўся ў легендарнай, каб не сказаць містычнай, мясцовасці: Трансільваніі. Скончыў гімназію выяўленчага мастацтва ды Вышэйшую школу выяўленчага мастацтва (аддзяленне графікі) у Будапешце. Ужо ў студэнцкія гады ілюстраваў салідную газету, мастацкім рэдактарам якой тады быў выдатны венгерскі паэт Ласла Надзь: "Літаратура і жыццё" — так перакладаецца яе назва. Да 1975 года Лівіус Дзюлаі займаўся пераважна станковай графікай, ілюстраваў кнігі айчынных і замежных аўтараў (праз яго фантазію прайшлі больш як 500 твораў). А потым захапіўся стварэннем мультыплікацыйных фільмаў, у тым ліку і серыялаў. Сваім настаўнікам у гэтым жанры лічыць вядомага савецкага рэжысёра Вячаслава Кацёначкіна: ім давялося супрацоўнічаць.

"Дон Кіхот" М. Сервантэса з віртуознымі малюнкамі ды іншыя, самыя розныя кнігі, афармленыя Лівіусам Дзюлаі, наведнікі мінскай выстаўкі могуць нават пагартаць. Аматары "мульцікаў" затрымліваюцца ля манітора і са шчырай цікавасцю сочаць за прыгодамі кінагерояў, увасобленых мастаком. А колькі захаплення выклікаюць літаграфіі ды гравюры на лінолеуме, манахромныя і каляровыя: серыя паводле Бальзакавых "Забаўных казак", "Бераг мора нашых бабуль" або "Пейзаж з вадзяным млынам"...

Выстаўка Лівіуса Дзюлаі, уладальніка шматлікіх міжнародных узнагарод, у тым ліку залатых медалёў, рознабаковага майстра, які глядзіць на свет вачамі мудрага, добрага, дасціпнага, часам іранічнага казачніка, прабудзе ў нас да 21 чэрвеня. Зладкавана яна дзякуючы пасольствам дзвюх краін — Венгерскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь ды нашай дзяржавы — у Венгрыі, а таксама пры падтрымцы БДАМ. Прысутны на вернісажы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Венгрыі ў Беларусі Ференц Контра з прыемнасцю адзначыў тую вялікую цікавасць, якую выклікаў першы культурны праект пасольства яго краіны ў Мінску.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: першае мінскае інтэрв'ю Лівіуса Дзюлаі (злева).

Фота аўтара

Стасункі будуць мацавацца

На працягу трох апошніх дзён мая ў Мінску праходзіў 1 Міжнародны форум замежных выпускнікоў беларускіх (савецкіх) вышэйшых навучальных устаноў "Адукацыя без межаў", у якім бралі ўдзел былыя студэнты, якія прыехалі ў нашу краіну з В'етнама і Кітая, Венесуэлы і Палесціны, Індыі і Ірана...

Як падкрэсліў падчас пленарнага пасяджэння форуму намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандр Косінец, менавіта сорак сем гадоў таму першыя замежныя студэнты пераступілі парог беларускіх вышэйшых навучальных устаноў. І з таго часу сустрэч не было. Цяпер такія форумы пачнуць праводзіцца рэгулярна. На адкрыцці пасяджэння Аляксандр Косінец зачытаў удзельнікам форуму прывітальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

Выступаючы перад замежнымі гасцямі — удзельнікамі форуму міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў падкрэсліў, што ў краіне на належным узроўні вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў, якія працуюць у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, на будоўлях, у сферы абслугоўвання. Міністр адукацыі падрабязна расказаў удзельнікам форуму пра развіццё сістэмы адукацыі ў вышэйшых навучальных і сярэдніх спецыяльных установах краіны.

Перад былымі замежнымі выпускнікамі беларускіх ВНУ выступілі таксама намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Віктар Гайсёнак, намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Андрэй Тур, намеснік міністра прамысловасці Рэспублікі Беларусь Генадзь Свідэрскі, генеральны дырэктар Міжнароднай асацыяцыі выпускнікоў беларускіх ВНУ Махато Упендра, ганаровы консул Лівана Слім Гефара Алі і іншыя.

На пасяджэнні падкрэслівалася, што Беларусь нават у самыя крызісныя гады знайшла і адстаяла свой, беларускі шлях развіцця, змагла падняць на высокі ўзровень многія галіны прамысловасці, сферы аховы здароўя і адукацыі. А аўтарытэт Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі вельмі эфектыўна спрацаваў на паступленне замежных інвестыцый. Цесная сувязь у гэтых адносінах усталявалася, напрыклад, з Нідэрландамі, Аўстрыяй, Венесуэлай ды іншымі краінамі свету. Новы імпульс атрымаў і экспарт навукоўтэхнічнай прадукцыі. Інтэнсіўна развіваюцца ў гэтым кірунку адносіны з Расіяй, Кітаем, Індыяй.

У многіх выступленнях замежных выпускнікоў, якія на сённяшні дзень працуюць у прамысловасці і бізнесе, аховe здароўя і сферы паслуг у розных краінах свету, падкрэслівалася, што Мінск, як яны пераканаліся, — мегаполіс, дзе жывуць і вучацца людзі многіх нацыянальнасцей, якія выхоўваюцца ў атмасферы дружбы, узаемаразумення і талерантнасці.

Прадстаўнікі 56 краін свету прыгадвалі гады вучобы, цікавіліся жыццём беларускіх выкладчыкаў, уражваліся зменамі, якія адбыліся ў Мінску з таго часу, калі яны спасцігалі таямніцы навукі ў беларускіх вышэйшых навучальных установах.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Край талентаў і славы

Творчая справаздача Брэсцкай вобласці, што адбылася ў Палацы Рэспублікі, паказала: берасцейцы нездарма любяць сваю зямлю і ганарацца ёю.

Моц берасцейскага мастацтва

Распачалося мерапрыемства адкрыццём выставы работ майстроў народнай творчасці і прафесійных мастакоў "Край Берасцейскі — наша натхненне, гонар, любоў і краса". Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матвейчук ва ўрачыстым звароце да прысутных зазначыў, што захаванне і развіццё народнай культуры — адзін з асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі. А перспектыва Брэсцкага краю з'яўляецца перспектывай і для ўсёй рэспублікі.

Затым адбылася міні-экскурсія па экспазіцыі, дзе можна было ўбачыць творы берасцейскіх майстроў у разнастайных жанрах. Роспіс па дрэве (Д. Цубер), вырабы з саломкі (В. Гаўрылюк, Ю. Піваварава), разьба (І. Кушнярук), пісанкі, вышыванкі, берасцяны посуд, народныя строі з Кобрынскага, Пружанскага, Жабінкаўскага раёнаў... Такое багацце шматформнай прыгажосці не магло не захапляць. Людзі пераходзілі ад аднаго экспаната да другога, дзяліліся сваімі ўражаннямі і меркаваннямі.

Сапраўдным музычным падарункам стаў канцэрт калектываў "Брэстчына — край талентаў і славы", які склалі шэсць частак: "Зямля мая, зямля бацькоў святая", "Ты ў сэрцы маім, Беларусь", "Святая музыка душы", "Зліваюцца славянскія вытокі", "Юнацтва сонечныя прамяні", "Зямлі палескай галасы". Кожная з гэтых частак мела сваю кампазіцыю і ідэю, адлюстроўвала класічную, эстрадную, народную творчасць, а часам і іх сінтэз. Расказвала пра глыбокую даўніну, пра мужную барацьбу супраць фашысцкіх захопнікаў, пра любоў да роднай краіны і клопат пра яе будучыню. Нездарма ў зале было шмат людзей розных узростаў.

Спазнаць Брэстчыну

Добрай магчымасцю даведацца болей і пра вобласць, і пра Беларусь ўвогуле сталі інфармацыйныя буклеты, прысвечаныя Берасцейшчыне, якія кожны прысутны мог узяць бясплатна. І прачытаць, што Нацыянальны парк "Белавежская пушча" і геадэзічныя аб'екты Дугі Струвэ рашэннем ЮНЕСКА ўключаны ў спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны чалавецтва. Што з Брэстчынай звязаны цэлы шэраг выбітных асобаў: Іван Фёдараў, Лаўрэнцій Зізаній, Тадэвуш Касцюшка, Напалеон Орда, Рыгор Шырма, Пётр Клімук... Што Брэсцкая вобласць шмат разоў станавілася месцам правядзення такіх літаратурных мерапрыемстваў, як Блокаўскія дні паэзіі, Дні беларускага пісьменства, імпрэз ў гонар "палескай ластаўкі" Яўгеніі Янішчыц... Тут праходзіць Рэспубліканскі фестываль духавой музыкі "Беларускія фанфары". Прыхільнікаў камернай музыкі тут збірае Міжнародны фестываль класічнай музыкі "Студзеньскія вечары". На Берасцейшчыну з'язджаюцца дзіцячыя калектывы, каб прыняць удзел у Міжнародным фестывалі-конкурсе "Пралескі". Аматары тэатральнай творчасці імкнуцца трапіць на Міжнародны тэатральны фестываль "Белая вежа". Ну, а хочаш атрымаць асалоду ад народнага мастацтва розных краін — едзь на "Палескі карагод"! Акрамя таго, на берасцейскай зямлі дзейнічаюць 14 дзяржаўных музеяў, а таксама сусветна вядомы мемарыял "Брэсцкая крэпасць — герой".

«Залатыя» людзі

Як праходзіла падрыхтоўка да творчай справаздачы і што сёння адбываецца ў галіне народнай творчасці Брэстчыны, распавёў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар.

— Выстава "Брэстчына — край талентаў і славы" ў Палацы Рэспублікі — гэта не толькі творчая справаздача, прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта прэзентацыя брэсцкай зямлі, на якой працуюць таленавітыя прафесіяналы. Як сказаў Прэзідэнт краіны, пабываўшы ў нашай вобласці, тут жывуць людзі, якія не адвыклі працаваць, "залатыя" людзі.

На жаль, тэхнічныя магчымасці памяшкання ў Палацы Рэспублікі не дазволілі нам выставіць усе экспанаты, якія былі падрыхтаваныя для выставы. Цалкам іх, у тым ліку і вырабленыя сто гадоў таму, можна пабачыць у музеях Берасцейшчыны.

Сёння некаторыя віды народнага мастацтва пачынаюць знікаць. Значыць, трэба своечасова рыхтаваць вучняў — каб была пераемнасць пакаленняў. Таму зараз у нас распаўсюджваецца практыка запрашэння жанчын, што ўмеюць шыць, вязаць, ткаць, у школы, дзе нашы дзеці вучацца захоўваць тое, што было напрацавана нашымі прадзедамі і прабабкамі. На нашай зямлі дзейнічае каля 4 тысяч самадзейных аматарскіх калектываў. Больш як 8 тысяч народных майстроў працуе ў розных жанрах. Ёсць, напрыклад, выдатныя майстры, што робяць філігранныя экспанаты адной сякерай! Мы імкнемся падтрымліваць таленавітых людзей. Не так даўно, да прыкладу, у рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва" мы выпусцілі ў свет кнігу пра народнага майстра з Пружаншчыны, які стварае сапраўдныя шэдэўры з саломкі і дрэва.

Ганна КОТ

На здымку: старшыня аблвыканкама К.Сумар уручае міністру культуры У.Матвейчуку кнігу "Сялянская Энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка".

Слова павінна гучаць

Адбылося пасяджэнне рэдакцыйнай калегіі старэйшага ў нашай краіне літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса "Полымя". На мерапрыемстве прысутнічалі ўсе супрацоўнікі выдання на чале з галоўным рэдактарам Міколам Мятліцкім, а таксама амаль у поўным складзе рэдкалегія.

Адкрываючы пасяджэнне, М.Мятліцкі зрабіў невялікі экскурс па этапах станаўлення і развіцця часопіса. Мікола Міхайлавіч падкрэсліў, што сучасная літаратура на старонках выдання павінна быць шматтучнай і шматжанравай, публіцыстыка — вострай, крытыка — аб'ектыўнай, абавязковая прысутнасць навуковай думкі. Галоўны рэдактар часопіса распавёў таксама пра супрацоўніцтва з НАН Беларусі, навучальнымі ўстановамі і бібліятэкамі краіны, адзначыў таленавітых аўтараў і іх творы.

Для абмеркавання былі вылучаны дзве асноўныя тэмы: узгадненне творчых планаў на другое паўгоддзе 2008 года і супрацоўніцтва паміж часопісам, установамі і органамі адукацыі.

Дырэктар РВУ "Літаратура і Мастацтва" Алесь Карлюкевіч расказаў пра дзейнасць установы і, у прыватнасці, часопіса "Полымя", пра выданне кніг (да слова, у гэтым годзе ў РВУ "Літаратура і Мастацтва" пабачылі ўжо свет адзінаццаць найменняў кніг), акрэсліў праблемы рэкламы ў СМІ часопісаў і газеты, а таксама падпіскі на іх. Алесь Мікалаевіч выказаў упэўненасць, што рабочая структура рэдкалегіі агулам і кожнага яе члена паасобку стане дзеючай і ініцыятыўнай.

Намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў выказаўся за больш цеснае супрацоўніцтва часопіса з Акадэміяй навук.

Слова таксама бралі такія знаныя асобы, як Уладзімір Гніламёдаў, Алесь Савіцкі, Таццяна Шамякіна, Зіновій Прыгодзіч, Іван Саверчанка, Навум Гальпяровіч, Зоя Мельнікава, Лада Алейнік... Творцы выказвалі свае заўвагі, думкі, пажаданні і прапановы. Марыя Захарэвіч, народная артыстка Беларусі, закранула тэму незапатрабаванасці беларускага слова, а яно — слова — павінна гучаць і на вуліцы, і ў тэатры, і на радыё, і на тэлебачанні...

Начальнік упраўлення друкаваных СМІ Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матусевіч зазначыў, што сённяшні часопіс "Полымя" з'яўляецца захавальнікам і прадаўжальнікам славутых традыцый вядучага акадэмічнага, грунтоўнага выдання і аб'ядноўвае вакол сябе лепшыя літаратурныя сілы краіны.

В. К.

Свята ад «Гошы»

Паводле статыстыкі сёння ў Беларусі больш як 30 тысяч дзяцей жывуць у дзіцячых дамах і інтэрнатах. І дзевяноста працэнтаў з іх — гэта сацыяльныя сіроты. На жаль, яны з-за многіх прычын не маюць бацькоўскай ласкі і лічаць сваім родным куточкам дзіцячы дом. Мы не можам кардынальным чынам змяніць сітуацыю, аднак у нас ёсць шанц крышку палепшыць іх жыццё.

Вось і кампанія "Марозпрадукт" па вытворчасці смачнага і любімага нашымі дзеткамі марожанага "Гоша", Арт-студыя "ІДЭЯ фікс" і забаўляльны парк "DREAMLAND" вырашылі аб'яднаць свае намаганні і падарыць сапраўднае свята дзецям са школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў нашай сталіцы. Вырашылі — і зрабілі. Напрыканцы мая тэрыторыя парку, што месціцца на маляўнічым беразе ракі Свіслач у раёне вуліцы Арлоўскай, віравала. На працягу трох гадзін адміністрацыя адзінага ў Беларусі парку італьянскіх атракцыёнаў дазволіла дзецям-сіротам бясплатна карыстацца самымі неверагоднымі забавамі. А гэта і надзіманыя казачныя замкі і горкі, дзе вясёлыя кампаніі, не зважаючы на сваіх выхавацеляў, без перапынку скакалі і куляліся. А для аматараў акрабатычных забаў і палётаў працавалі батуты. Перад самым уваходам дзяцей сустракалі забаўныя клоуны, якія падчас мерапрыемства не давалі ім сумаваць і падтрымлівалі добры настрой.

Апроч вышэйпералічаных задавальненняў, дзеці бралі ўдзел у шматлікіх жартоўных конкурсах і спаборніцтвах, дзе атрымлівалі прызы і ўзнагароды. На тэрыторыі парку была арганізавана своеасаблівая фотастудыя, дзе кожны ахвочы мог сфатаграфавацца з брэндам кампаніі "Марозпрадукт" — лялькай вялікіх памераў — папугаем Гошам. Яе паменшаная копія была падаравана кожнаму мінскаму дзіцячаму дому. Да таго ж атмасферу свята фіксавалі на відэастужку, запіс пасля мантажа таксама падаравалі дзецям.

Але, як вы разумееце, дзеці больш за ўсё чакалі абяцанага ласунку. Нездарма вядомая кампанія па вытворчасці больш як 50-ці відаў марожанага брала ўдзел у акцыі. І вось, нарэшце! Напрыканцы свята прыехала доўгачаканая машына з каштоўным грузам — у 30-і вялікіх скрынках знаходзілася паўтары тысячы порцый марожанага "Гоша".

Намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу кампаніі "Марозпрадукт" Вікторыя Відзевіч паведаміла, што сёлета прадпрыемству спаўняецца 10 год, і ўсе гэтыя гады яно заўсёды імкнулася дапамагчы і падтрымаць, як сваёй прадукцыяй, так і грашыма самых малазабяспечаных дзяцей-сірот, хоспісы, інвалідаў. А сённяшняя акцыя з'явілася своеасаблівым святкаваннем Дня народзінаў любімага дзіцячага ласунка. Арт-дырэктар студыі "ІДЭЯ фікс", якая па сутнасці выступіла ініцыятарам правядзення сацыяльнай акцыі, нядаўні выпускнік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Сяргей Забалоцкі шчыра прызнаўся, што хаця сам і не з'яўляецца выхаванцам дзіцячага дома, але з маленства адчуваў недахоп бацькоўскай увагі і ласкі. Таму цудоўна разумее, што дзецям-сіротам проста неабходныя любоў і падтрымка. Ён упэўнены, што чалавек не можа быць шчаслівы, калі вакол яго знаходзяцца гаротныя людзі. Дарэчы, ягоная арт-студыя адкрылася толькі ў лістападзе 2007 года, і мерапрыемства такога сацыяльнага і гарадскога маштабу, як гэтае, — яе дэбют.

Ірына ЗАНЕЎСКАЯ

Фота аўтара

Пачуццё сям'і адзінай

Напрыканцы мая ў Мемарыяльнай зале пісьменнікаў Беларусі адбылася вечарына з нагоды 70-годдзя лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, аднаго з аўтараў тэксту Дзяржаўнага гімна нашай краіны Уладзіміра Карызны. Павіншаваць юбіляра сабраліся шматлікія прыхільнікі яго творчасці, калегі-літаратары і даўнія сябры.

Распачаў урачыстасць старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец. Ён павіншаваў Уладзіміра Карызну і пажадаў юбіляру, каб яго творчы шлях і ў далейшым быў плённы, напоўнены новымі паэтычнымі знаходкамі. Мікалай Чаргінец зачытаў віншаванне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нагоды 70-годдзя паэта, у якім у прыватнасці адзначалася: *"...Сваім шматгранным талентам і шчырай любоўю да Радзімы вы заслужылі глыбокую павагу прыхільнікаў мастацкага слова. У нашай краіне і за яе межамі шырокую папулярнасць набылі вашы цудоўныя патрыятычныя і лірычныя вершы, сотні з якіх пакладзены на музыку і выконваюцца праслаўленымі майстрамі, гучаць на радыё і тэлебачанні.*

Адметнай з'явай у грамадска-палітычным жыцці краіны стала стварэнне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, адным з аўтараў тэксту якога вы з'яўляецеся. Мы высока цэнім вашу грамадскую дзейнасць, звязаную з захаваннем і ўзбагачэннем лепшых традыцый беларускай літаратуры, заснаванням Саюза пісьменнікаў Беларусі і арганізацыяй актыўнай работы гэтага аб'яднання...".

Таксама старшыня СПБ зачытаў урадавую тэлеграму ад намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Косінца, віншаванні ад прэм'ер-міністра нашай краіны Сяргея Сідорскага, іншых афіцыйных асоб і ўручыў Уладзіміру Іванавічу дыплом, які сведчыць пра тое, што яму надаецца званне ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Прадстаўнік прафсаюзаў Анатоль Суша зазначыў вялікі ўнёсак У. Карызны ў нацыянальную культуру і літаратуру і яго актыўную грамадскую дзейнасць. А Мікалай Шаўцоў, старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, ад імя прэзідыума ўзначальваемай ім арганізацыі і ад сябе асабіста пажадаў юбіляру творчых поспехаў і ганараваў Уладзіміра Карызну вышэйшай узнагародай Беларускага прафсаюза работнікаў культуры — ганаровым знакам.

Падчас імпрэзы гучалі віншаванні ад старшыні Мінскай гарадской арганізацыі СПБ, галоўнага рэдактара часопіса "Нёман" Міхася Пазнякова, акадэміка Уладзіміра Гніламёдава, дырэктара і галоўнага рэдактара выдавецтва "Мастацкая літаратура", адпаведна, Уладзіслава Мачульскага і Віктара Шніпа, супрацоўніка часопіса "Вясёлка" Уладзіміра Мазго. Прывітанне ад Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" агучыў намеснік дырэктара Алесь Бадак.

Мікалай Улаховіч, вярхоўны атаман Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Беларускае казацтва", уручыў Уладзіміру Карызну медаль "За службу казацтву" ў сувязі з 70-годдзем і за асабісты ўнёсак у справу патрыятычнага выхавання моладзі.

Своеасаблівым лірычным адступленнем сталася выступленне пісьменніка і акцёра Анатоля Жука, які пранікнёна чытаў вершы юбіляра. Да яго з віншаваннямі далучыліся дырэктар радыёстанцыі "Беларусь" Навум Гальпяровіч, пісьменнікі Алесь Савіцкі, бацька і сын Скарынкіны, Яўген Каршукоў, Сяргей Трахімёнак...

Пры канцы ўрачыстага мерапрыемства Уладзімір Карызна падзякаваў усім прысутным за цёплыя словы і пажаданні і падкрэсліў, што толькі шчырая, вялікая, ціхая, як матчына песня, любоў да роднай зямлі, да спадчыны, гісторыі народа і дае права паэту ўзяцца за пяро. А ўсім творчым людзям трэба мець "пачуццё сям'і адзінай", у якой спалучаюцца *сапраўдныя* музыка, мастацтва, паэзія, проза.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: віншаванне ад Прэзідэнта краіны зачытвае старшыня СПБ Мікалай Чаргінец.

Фота аўтара

Наіўнае? Ды не — народнае!

Творчасць Мікалая Тарасюка, жыхара вёскі Стойлы Пружанскага раёна, дзе ён стварыў музей "Успаміны Бацькаўшчыны", вядомыя далёка за межамі нашай краіны. Ён, прадстаўнік так званага наіўнага (інсітнага) мастацтва, — удзельнік шматлікіх міжнародных выстаў народнай творчасці, пераможца і дыпламант прадстаўнічых конкурсаў. У 2002 годзе яго мастацтва было адзначана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва ў намінацыі "Народная творчасць". У Палацы Рэспублікі патомны селянін і народны майстар разьбы па дрэве Мікалай Тарасюк атрымаў узнагароду з рук Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі. Па творах майстра, як па сялянскай энцыклапедыі, можна вывучаць усе этапы жыцця вяскоўцаў-беларусаў мінулага стагоддзя: праехаць з маладымі ў вясельным вазку на конях, пабыць на вянчанні ў царкве, папрысутнічаць падчас вынасу каравая, паспяваць песні на каляднай вячэры, даведацца, як будуецца хата і што робіць вясковы чалавек на млыне...

Мастацтвазнаўца Вольга Лабачэўская добра ведае і даўно папулярызуе творчасць выдатнага майстра. Яна стала аўтарам тэксту і ўкладальнікам кнігі "Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка", якая выйшла ў РВУ "Літаратура і Мастацтва". Прэзентацыя гэтага выдання, якое стала пераможцам на Нацыянальным конкурсе "Мастацтва кнігі-2008" у спецыяльнай намінацыі за ўнёсак у захаванне духоўнай спадчыны, адбылася ў Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў. На імпрэзе разам з В. Лабачэўскай выступілі дызайнер і мастак альбома У.Шоўк, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар Р.Шаура, аўтар кнігі "Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі" Ю. Малаш. Кніга выдадзена пры фінансавай дапамозе фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва і Брэсцкага аблвыканкама.

Вераніка МАРУК

Сувязі

Між Стакгольмам і Мінскам

Швецыя пашырае сваю прысутнасць у культурнай прасторы Беларусі. Цягам мінулага года як у Мінску, так і ў рэгіёнах часцей сталі з'яўляцца прадстаўнікі тамтэйшага мастацтва. Ды і Дні культуры Швецыі сёлета праходзяць надзвычай маштабна.

Распачаліся яны літаратурнай часткай — сумеснымі шведска-беларускімі літаратурнымі чытаннямі, якія адкрываліся ў Полацку.

— Мы і раней вельмі шмат ездзілі па абласцях Беларусі, але ў гэтым годзе вырашылі: цікава было б пачаць чытанні ў самым старажытным горадзе Беларусі, з якога, прынамсі, паходзіць шмат вядомых літаратараў, — сказаў кіраўнік аддзялення Пасольства Швецыі ў Мінску Стэфан Эрыксан.

Пасля Полацка скандынаўскія госці ў складзе пісьменніцы і журналісткі Сілы Наўман (Cilla Naumann), паэтаў Іды Бёр'ель (Ida Börjel), Солы Крапу (Solja Krapu) ды перакладчыка з польскай і французскай моў Андэша Будэгорда (Anders Bodegerd) выступілі ў Мінску, а потым накіраваліся ў Лунінец і Баранавічы.

Наступны складнік Дзён культуры Швецыі — дэманстрацыя твораў фотамастацтва — сёлета прадстаўлены ажно дзвюма выставамі. Да 29 чэрвеня ў сталічнай галерэі "Мир фото" (вул. Прытыцкага, 10) працуе экспазіцыя ўжо знаёмага беларусам шведска-дацкага фатографа Енца Ластхейна "Белае мора — Чорнае мора". Мастак здымае людзей, жыццё і краявіды ў краінах, якія мяжуюць з Еўрасаюзам з Усходу. Дваццаць работ Енца прадстаўлены на цяперашняй выставе ў Мінску. Пасля яе заканчэння, паводле прадстаўнікоў аддзялення Пасольства Швецыі, экспазіцыя, магчыма, павандруе па беларускіх гарадах і мястэчках.

14 чэрвеня ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва сумесны беларуска-шведскі праект прадставіць выставу маладых шведскіх фатографаў "Балансуючы паміж Мінскам і Стакгольмам". Экспазіцыя, у якой будуць прадстаўлены дыпломныя работы шведаў і здымкі беларускіх фатографаў-пачаткоўцаў, будзе працаваць да 5 ліпеня.

Шведскія музыкі часта наведваюць Беларусь — узгадайма хоць бы выступленні знакамітых LOWE, The Cardigans, Europe на мінскіх пляцоўках. Гэтым разам шведская музыка арганічна ўплеценая ў праграму Дзён культуры канцэртам гуртоў Lowood і Tikkle Me, а таксама выступленнем дзіджэя Сюзаны Муніцыо з суполкі дзіджэяў Furious Fiesta.

— Імпрэза будзе цікавая тым, што на ёй прадстаўлена сучасная музыка ад сучасных жанчын: мы прывозім дзве групы з выключна жаночым складам, — гаворыць прадстаўнік аддзялення Пасольства Алена Каско. — Групы двух розных музычных кірункаў вельмі маладыя, але ўжо дастаткова вядомыя ў Швецыі. Беларускім складнікам канцэрта стане група "Індыга" з вядомай выканаўцай Русяй.

Амаль немагчыма ўявіць Дні культуры Швецыі без кіно: фестываль сучаснага шведскага кіно пройдзе да сярэдзіны чэрвеня ў кінатэатры "Цэнтральны". Драмы, меладрамы, камедыі і нават адзін трылер — усе гэтыя стужкі ўжо былі паказаныя ў мінулым годзе ў Маскве, Санкт-Пецябургу і Калінінградзе. Гэтым разам фільмы дэманструюцца з субцітрамі на рускай мове.

Мікалай АНІШЧАНКА

Гаварылі пра Багдановіча

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча прайшла літаратурна-музычная імпрэза "Сны аб Радзіме", прысвечаная 91-м угодкам з дня смерці Страціма-лебедзя беларускай паэзіі.

Галоўны рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Віктар Шніп узгадаў сваю першую вандроўку ў Ялту да магілы класіка, а таксама прачытаў верш, напісаны падчас яе. Пра выпуск у наступным годзе ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" серыі кніг пра памятныя мясціны Максіма Багдановіча, ягоны радавод, сяброўскія стасункі паведаміў Міхась Шавыркін. Да таго ж у 2010—2011 гадах павінна пабачыць свет вялікае ілюстраванае выданне пра жыццёвы і творчы шлях паэта.

Дарэчы, сёлета было прынята рашэнне па аднаўленні працы над энцыклапедыяй Максіма Багдановіча, якая была распачата яшчэ ў 1988 годзе. Пра гэта паведаміла вядучы навуковы рэдактар выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" Алена Крамко, якая запэўніла ўсіх прысутных, што энцыклапедыя пабачыць свет акурат да 120-годдзя з дня нараджэння класіка.

Досыць незвычайна і цікава прагучалі на імпрэзе пераклады вершаў Багдановіча на нямецкую мову ў выкананні Васіля Ермаловіча, а таксама ўласныя пераклады Максіма з мовы Шылера і Гётэ. Прачулыя словы пра класіка беларускай літаратуры сказалі Ніна Загорская, Васіль Жуковіч і Зміцер Арцюх. Музычны настрой імпрэзы стварылі бард Алесь Камоцкі і салістка тэатра "Жывое слова" Алеся Сівохіна.

Ян АКУЛІН

Фота аўтара

Музычным шляхам

У гэтым годзе Маладзечанскаму музучнаму вучылішчу імя Агінскага спаўняецца 50 год. З гэтай нагоды ва ўстанове адбыўся юбілейны канцэрт. А пачаўся ён са студэнцкага "капусніка", які падрыхтавалі выпускнікі 1995 — 2007 гадоў.

Ва ўрачыстай частцы мерапрыемства абмяркоўваліся найважнейшыя падзеі апошняга перыяду, такія, як пастаноўкі "Іяланты" і "Травіяты", ажыццёўленыя маладзёжным музычным тэатрам пры музвучылішчы, і аднаўленне работы аддзялення фартэпіяна.

Таксама адбылася канцэртная праграма, на якой прысутнічаў вядомы кампазітар Алег Елісеенкаў. Спявалі маладыя выканаўцы, выпускнікі вучылішча: Эла Андрэенка, Дарыя, Віталь Скадорва... Іскрынкай імпрэзы стала выступленне эстраднай студыі "Спяваем разам" пад кіраўніцтвам Алены Атрашкевіч.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

Фота Віктара Кавалёва

Наш госць — «Мурзилка»

Нядаўна рэдакцыю часопіса "Вясёлка" наведалі супрацоўнікі дзіцячага часопіса "Мурзилка". Маскоўскія калегі — адказны сакратар Ірына Антонава і галоўны мастак Наталля Халендра — падзяліліся вопытам сваёй работы, расказалі пра пошукі і знаходкі расійскай дзіцячай літаратуры.

Госці пазнаёміліся з музеем "Вясёлкі", узялі ўдзел у шчырым і змястоўным дыялогу з галоўным рэдактарам часопіса Уладзімірам Ліпскім і іншымі вясёлкаўцамі.

Вынікам гэтай сустрэчы стаў сумесны творчы праект. У чэрвеньскім нумары "Вясёлкі" ў перакладзе на беларускую мову друкуюцца творы расійскіх аўтараў. Адпаведная публікацыя беларусаў чакаецца ў хуткім часе ў часопісе "Мурзилка".

Уладзімір ПРАХАРЭНКАЎ

№ 24 13 чэрвеня 2008 г. Літ

Не баяцца выглядаць белай варонай

Аднойчы мне давялося віртуальна ліставацца з маладым чалавекам, які нарадзіўся ў Піцеры, больш як 10 гадоў жыве ў Нямеччыне, ніколі не быў у Беларусі, але самастойна вывучыў нашу мову, цікавіцца беларускай культурай, проста так, для сябе, таму што яна здаецца яму прыцягальнай. Ва ўмовах сённяшняй непапулярнасці беларускага слова сярод суайчыннікаў такія людзі выклікаюць ледзь не шокавую рэакцыю, культурнае трапятанне, адчуванне цуду. Прыкладна такія ж эмоцыі ўзніклі і пры знаёмстве з прафесарам Лонданскага універсітэта, спадаром Арнольдам МакМілінам, які нядаўна наведаў Мінск. Ён ужо доўгі час даследуе беларускую літаратуру, мае шмат сяброў сярод нашых пісьменнікаў, крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Кожны яго прыезд у Мінск насычаны нефармальнымі сустрэчамі і інтэрв'ю. Рыхтуецца да выхаду пятая яго кніга пра беларускую літаратуру, якую ён спадзяецца прывезці ў Мінск падчас ужо свайго наступнага візіту.

— Мінулы раз вы былі ў Беларусі, здаецца, два гады таму. Ці можаце вылучыць нейкія значныя і цікавыя беларускія кнігі, новыя імёны, якія з'явіліся за гэты прамежак часу? Наогул, якую апошнюю беларускую кнігу вы прачыталі?

— Шмат кніг з'явілася за гэты час. З апошніх прачытаных мной — "Каб неба сагрэць" Валеры Куставай, "Сатырыкон" Юрыя Станкевіча і пераклад Рыгора Барадуліна чачэнскага паэта Зелімхана Яндарбіева. Я таксама перачытваю шмат кніг, асабліва п'ес, бо завяршаю сваю манаграфію. Увогуле, канечне, за апошнія два гады з'явілася намнога больш цікавых твораў, чым я згадаў.

— Як прайшоў сёлетні візіт у Мінск? З кім сустрэліся, якія месцы наведалі?

— Мінск пусты для мяне пасля смерці майго сябра Васіля Быкава, і мяне засмуціла, што сёлета не пабачыў Рыгора Барадуліна, які знаходзіўся ў шпіталі. Як заўсёды, сустрэўся з пісьменнікамі, крытыкамі і літаратуразнаўцамі, але час прабег яшчэ хутчэй, чым звычайна, за размовамі з многімі сябрамі, у тым ліку з новымі знаёмымі, якія дапамаглі мне з некаторымі момантамі для маёй кнігі, гэтаксама як і я дапамог ім з дысертацыямі.

— Рыхтуецца да выхаду ваша пятая кніга. Распавядзіце, калі ласка, пра яе. Які будзе наклад? Які перыяд яна ахоплівае (хто самы сталы і самы малады аўтары)? З якімі цяжкасцямі вы сутыкнуліся пры падрыхтоўцы кнігі?

— Мая кніга называецца "Пісьменніцтва ў халодным клімаце: беларуская літаратура з 1970-х да сённяшняга дня" *("Writing in a Cold Climate: Belarusian Literature from the 1970s to the Present Day")*. Я нічога не ведаю пра наклад — гэта інфармацыя не паведамляецца ў Англіі нават для тых кніг, якія ўжо выйшлі. Калі мая праца будзе поўнасцю скончана, я тэрмінова буду шукаць англійскага ці іншага еўрапейскага альбо амерыканскага выдаўца. Я спадзяюся, што кніга будзе ў друку прыкладна праз год. З 178-мі аўтараў, згаданых у кнізе, старэйшы нарадзіўся ў 1935-м (Рыгор Барадулін), а самы малады — ў 1984-м (Валерыя Кустава). Мая галоўная праблема з працай у беларускай літаратуры, прынамсі, сучаснага перыяду — гэта недаступнасць некаторых неабходных мне тэкстаў (нягледзячы на выдатныя бібліятэку імя Францыска Скарыны і Брытанскую бібліятэку). Нездарма поўных слоўнікаў таксама з'яўляўся праблемай, хаця я атрымліваў добрую дапамогу ад беларусаў у Англіі і Беларусі. Я працую над кнігай прыкладна з 2002 года. Яна заняла нашмат больш часу, чым разлічваў, калі пачынаў пісаць.

— Кніга трапіць у нашы бібліятэкі? І ці будзе яна з часам перакладзена на беларускую мову?

— Мая кніга па літаратуры 50-х—60-х знайшла свой шлях у БДУ, і мне вельмі прыемна, што яна даступная для студэнтаў. Я вельмі спадзяюся, што мая апошняя манаграфія ў свой час з'явіцца ў Беларусі (я ўжо знайшоў чалавека, якога лічу здольным яе перакласці).

— Два гады таму ў інтэрв'ю Леаніду Галубовічу вы казалі, што з'яўляецеся "белай варонай", таму што беларушчына "не адыгрывае абсалютна ніякай ролі ў брытанскіх універсітэтах". Ніколі не шкадавалі, што ўзяліся за такую непапулярную працу? Атрымліваецца, што наяўнай аўдыторыі вашых кніг у Англіі амаль няма. Значыць, можна сказаць, што вы пішаце іх нібыта ў будучыню, разлічваючы, што калі-небудзь яны будуць ацэнены належным чынам?

— Больш за тое, думаю, я адзіны чалавек у брытанскіх універсітэтах, хто вывучае беларускую літаратуру, пасля сыходу на пенсію Джыма Дзінглі і смерці Пітэра Майа. Затое я знаёмы з калегамі з Францыі, Германіі, ЗША і Канады. Мне пашчасціла стаць прафесарам у маладым узросце (у 34 гады), і я атрымаў магчымасць займацца тым, чым хацеў. Было б складаней (калі ўвогуле магчыма) на пачатку сваёй кар'еры даследаваць "непапулярны" прадмет, а выкладаць іншы (я з'яўляўся выкладчыкам і часткова даследчыкам рускай літаратуры). Канечне, ніколі не шкадаваў, што абраў беларускую літаратуру, асабліва апошнія дзесяць гадоў. Менш за ўсё звяртаў увагу на тое, ці з'яўляюся я "белай варонай", калі ласка, толькі не крумкачом... Гэта няпраўда, што няма чытачоў маіх кніг у Англіі ці ўвогуле на Захадзе. Калі б гэта было так, ніхто б не стаў друкаваць і рэцэнзаваць іх! Але з іншага боку, мае пераклады маюць нашмат больш шырокую аўдыторыю. У любым выпадку навукоўцы, якія цікавяцца "непапулярнымі" прадметамі, заўсёды з'яўляюцца, рана ці позна.

— Наколькі вялікая беларуская дыяспара ў Англіі, і ці сочаць яе прадстаўнікі за вашымі працамі?

— У Лондане ёсць беларусы, старыя і маладыя, хаця яны складаюць невялікую групу ў параўнанні са шматлікасцю рускіх. Спадзяюся, што яны зацікаўленыя тым, што я раблю. Некаторыя дапамагаюць утрымліваць бібліятэку імя Францыска Скарыны ў парадку.

— Вы з'яўляецеся прэзідэнтам асацыяцыі навукоўцаў, якая займаецца літаратурамі і мовамі Еўропы. Ці распавядаеце вы на пасяджэннях альбо канферэнцыях пра беларускую мову і культуру?

— Так, я сапраўды быў прэзідэнтам Гуманітарнай асацыяцыі сучасных моў, але толькі адзін год — з 2005-га па 2006-ты. Асацыяцыя дапамагае маладым навукоўцам і даследчыкам і выдае значную колькасць акадэмічных часопісаў. Прэзідэнт атрымлівае права выступіць з прамовай, і я скарыстаў магчымасць распавесці маім калегам пра Беларусь і яе культуру. Гэта прамова, надрукаваная ў Англіі, пазней была перакладзена і апублікавана ў "Arche", нягледзячы на тое, што яна напісана хутчэй для непрафесійнай брытанскай аўдыторыі, чым для беларускіх чытачоў. Пачынаючы з 70-х гадоў спрабаваў рабіць даклады на беларускія тэмы (па-беларуску) на міжнародных канферэнцыях. Іншымі словамі — уздымаць беларускі сцяг.

— Што сёння чытаюць англічане? Які самы модны і вядомы сучасны англійскі пісьменнік?

— Я не магу распавесці вам шмат пра сучасную англійскую літаратуру і ўвогуле нічога пра тую літаратуру, якая лічыцца моднай. Як чукча ў непаліткарэктным анекдоце, Арнольд МакМілін пісьменнік, а не чытач... Нягледзячы на гэта, апошнім часам я прачытаў (большасць у цягніках) наступныя небеларускія кнігі: "Незалежныя людзі" ісландскага пісьменніка Халдара Лакснэса, "Імперыум" Роберта Харыса, "Лотэ ў Веймары" Томаса Мана, "Спеў птушкі" Себасцьяна Фолкса, "Мора" Джона Банвіла, "Ньютон" Пітэра Акройда і "Той, хто бяжыць за паветраным змеем" Халеда Хасэйні. Я не чытаў кніг пра Гары Потэра. У паэзіі мне асабліва падабаюцца Тэд Хьюз, Шэймас Хіні, Роберт Фрост і Роберт Лоўэл .

— Беларусы з нейкай абвостранай увагай сочаць за сусветнымі конкурсамі і прэміямі. Шмат размоў ідзе пра нашых нобелеўскіх намінантаў. Як вы ставіцеся да іх творчасці?

— Нобелеўская прэмія — гэта латарэя. Паколькі Васіль Быкаў не атрымаў яе, у мяне знікла надзея на іншых беларускіх пісьменнікаў. Гэта асабліва складана для паэтаў, бо пераклад паэзіі — гэта штосьці на мяжы немагчымага. Святлана Алексіевіч для мяне напаўжурналіст, але ў латарэі можа здарыцца ўсё, што заўтодна. Тым не менш, не ўсе прэміі з'яўляюцца латарэямі, і Ганна Кісліцына заслужана атрымала прэмію Зоры Кіпель за сваю апошнюю (2006 года) кнігу літаратурнай крытыкі.

— Здаецца, вывучаючы літаратуру, трэба быць у курсе пэўных абставін, каб бачыць усе адценні, слоўныя гульні, жарты, намёкі, алюзіі і рэмінісцэнцыі. Як вам здаецца, вы добра разумееце беларускі менталітэт і унікальны кантэкст? Ці бывалі вы калі-небудзь у беларускіх вёсках, у гістарычных мясцінах? Ці сочыце за падзеямі, якія адбываюцца ў Беларусі?

— Я прыкладаю ўсе высілкі для таго, каб сачыць за ўсімі падзеямі, якія тут адбываюцца, станоўчымі і адмоўнымі. Безумоўна, пагаджуся, што кантэкст унікальны. Я ніколі не быў у беларускай вёсцы (акрамя Вязынкі), але ў мяне быў шанц наведаць некаторыя з галоўных гістарычных мясцін. Канечне, замежнік не можа зразумець усіх нюансаў мовы і літаратуры, але пастаяннае чытанне дапамагае бачыць большасць алюзій. У новай кнізе я спрабую патлумачыць некаторыя жарты і слоўныя гульні маім англійскім чытачам (складаная задача).

— Магу адзначыць, што вы добра валодаеце беларускай мовай, нават лепей за многіх беларусаў. Але, напэўна, калі не размаўляць, мова паступова забываецца?

— Я расцэньваю ваш камплімент як сумніўны, бо мне здаецца, шмат людзей у Беларусі не могуць ці не хочуць размаўляць па-беларуску. Дома я размаўляю па-руску і па-англійску 51 тыдзень на год і толькі адзін тыдзень па-беларуску, таму, зразумела, гэта складана — у мяне асабістая версія трасянкі. Я жадаю ўсім сэрцам, каб больш людзей размаўляла па-беларуску на вуліцах і ў публічных месцах, і мяне падбадзёрвае тое, што павялічваецца колькасць беларускамоўных людзей сярод інтэлігенцыі і моладзі.

— Існуе меркаванне, што многія з'явы "даходзяць" да нас з вялікім спазненнем, калі ў еўрапейскай літаратуры яны ўжо неактуальныя (напрыклад, постмадэрнізм). Як вы думаеце, у чым прычына такой закансерваванасці нашай літаратуры, запавольвання літаратурнага працэсу?

— Няма асаблівай заслугі ў тым, каб быць у авангардзе ці, наадварот, быць кансерватыўным. Згадайце Моцарта, які быў вельмі кансерватыўны ў параўнанні з Гайднам. Што да постмадэрнізму, то, на мой погляд, гэтая плынь такая ж бескарысная, як перакладанне паэзіі, асабліва калі з'яўляецца ў такіх гратэскных формах, як прымітыўны выкід нядаўна ў «Arche». Дарэчы, канцэпт "літаратурнага працэсу" не распаўсюджаны і рэдка калі ўвогуле выкарыстоўваецца на Захадзе.

Як адзначаў нябожчык Янка Брыль у іншым кантэксце, беларуская літаратура, як упартая расліна, якая прабівае сабе шлях паміж камянямі.

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: І Шаўлякова, А. МакМілін, А. Халопік (Саша Дорская), і Л. Галубовіч.

Фота Кастуся Дробава

Дзе расце тая кветка?

Не так даўно ў Мінску адбыўся першы адкрыты студэнцкі PR-форум "ПаPRаць кветка", удзел у якім прыняло больш як дзве сотні сённяшніх і будучых спецыялістаў.

Арганізатарамі мерапрыемства сталі студэнты чацвёртага курса факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кафедра тэхналогій камунікацыі і Інстытут PR.

"PR-спецыялісты — людзі актыўныя, крэатыўныя і адкрытыя. Для любога прафесіянала ў галіне камунікацыі важным з'яўляецца наяўнасць шырокага кола зносін, вялікай колькасці кантактаў. Нашы студэнты выступілі ініцыятарамі правядзення форуму, бо ўжо сёння ім недастаткова ўзаемадзеяння толькі ў межах факультэта", — адзначыў загадчык кафедры тэхналогій камунікацыі Віталь Вашкевіч.

Дзевяць каманд з беларускіх і ўкраінскага ВНУ на працягу чатырох дзён выконвалі разнастайныя індывідуальныя і групавыя заданні, якімі была насычана праграма «ПаPRаць кветкі». Падчас навукова-практычнай канферэнцыі "PR — прафесія трэцяга тысячагоддзя" студэнты разгледзелі тэмы, датычныя карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, выстаў як інструмента грамадскай камунікацыі, карпаратыўных рэлігій і г.д. У гэтай частцы першае месца заняла работа "Памылкі ў беларускіх прэс-рэлізах" А. Юдчыц і В. Капачэні (факультэт журналістыкі БДУ). Адзінаццаць работ склалі конкурсную праграму кірмашу студэнцкіх PR-праектаў. Лепшым у сацыяльнай сферы прызналі праект С.Ціханенкі "Піце малако", у адукацыйнай галіне — "Student's Drive" Т.Пугачовай, В. Лапуцкай і М. Салтыкова, асобным дыпломам за ідэю адзначылі праект сайта А. Іванова. Аўтары работ — студэнты Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.

Грамадскую значнасць PR пацвердзіла заданне распрацаваць імідж горада. За два дні студэнты склалі праграмы паўнавартасных кампаній па фарміраванні рэпутацыі Мінска, Гродна ды Нікалаева (Украіна). У намінацыі "Прафесіяналізм плюс крэатыў" перамагла каманда з Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

Падчас форуму прайшлі майстар-класы, дзе будучыя спецыялісты public relations маглі навучыцца выкарыстоўваць тэхналогіі PR пры кантакце са сродкамі масавай камунікацыі, у сацыяльнай сферы, у Інтэрнеце і г.д.

"Форум "ПаPRаць кветка" — гэта вялікі крок у развіцці студэнцкага PR-грамадства. Тут удзельнікам з розных ВНУ і гарадоў была прадастаўлена унікальная магчымасць пазнаёміцца з досведам сваіх калег, завязаць цікавыя і неабходныя кантакты. Тое, якім будзе PR у Беларусі, залежыць у многім ад будучых спецыялістаў у гэтай галіне. Таму такая камунікацыя павінна стаць штогадовай", — падкрэслілі каардынатары форуму.

Ганна КОТ

“Я вам прывяду такі прыклад — у плане нацыянальнай свядомасці... Аднойчы ад сваёй далёкай сваячкі з вёскі пачуў: “Валодзька, — кажа, — ты доўга так жывеш у Мінску, калі па-руску навучышся гаварыць?” Вось праблема з праблем: мовы, бывае, цураюцца нават тыя, хто з'яўляецца яе носьбітам, хто штодзённа гаворыць на ёй. І тут не трэба ківаць на некага — быццам нехта вінаваты... Вёска пераважна гаворыць на сваім дыялекце. А што мы робім з літаратурнай моваю? Мне дарагая тая мова, якая тут, на радзіме, мова Купалы, Коласа. А мы самі сабе часта шкодзім, робячы выбар паміж так званымі наркамаўкай і тарашкевіцай. Але ж пачынаць гаварыць па-беларуску трэба з дзіцячага садка. Мы суверэнная дзяржава — і трэба любоў да беларускай літаратурнай, дзяржаўнай мовы выхоўваць, аддаючы перавагу ёй у штодзённым побыце. Сядзіць у генах беларус у нас, а мы на яго не зважаем...”

З намеснікам ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Уладзімірам Ламекам мы гаворым пра культуры розных народаў і той досвед, які яны маюць па захаванні сваёй культурнай спадчыны. З нагоды Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур, які адбываецца гэтымі днямі ў Гродне, згадваем тое, чым мы сёння адметныя як народ і што адметнага прыўносяць у наш побыт грамадскія аб'яднанні іншых нацыянальнасцей, сфарміраваныя на гэтай зямлі.

Моцныя духам адзінства

— Уладзімір Барысавіч, фестываль нацыянальных культур з'явіўся тады, калі існаваў ужо “Славянскі базар у Віцебску”, калі ва ўсю моц гучала беларуская песня ў Маладзечне і быў на дзяржаўным узроўні абвешчаны Дзень беларускага пісьменства. Славянскія народы, наша беларуская культура маглі быць прадстаўленыя даволі шырока. Што, паводле задумы, павінен быў сцвердзіць гэты новы фэст?

— Вы правільна адзначылі, што Усебеларускі фестываль нацыянальных культур — гэта ўжо наша гісторыя. 10 гадоў мы адзначылі з часу першага фестывалю ў 2006-м годзе (першы адбыўся ў 1996 годзе). Сталіцай абралі Гародню і па сённяшні дзень яна так і застаецца ёю. Былі прапановы зрабіць так, каб, як на Свяце беларускага пісьменства, сталіцы мяняліся. Але Гародня адстаяла сваё права на такі форум. Мяркую, невыпадкова: гэта самы нацыянальна, інтэрнацыянальна насычаны рэгіён. Прадстаўнікі некаторых нацыянальнасцей найбольш кампактна там размяшчаюцца, шмат прадстаўнікоў розных канфесій. Сёлета з 13 па 15 чэрвеня праходзіць заключны этап VII фестывалю, які намнога раней распачаўся ў рэгіёнах.

— Ён прымеркаваны да пэўнай даты?

— Традыцыйна ўжо ладкуецца на пачатку чэрвеня раз на два гады. Як толькі заканчваецца адзін фестываль, адразу ўвесну наступнага года абвяшчаецца пачатак падрыхтоўкі да чарговага. Падрыхтоўка да сёлетняга фестывалю была абвешчана ў мінулым годзе ў маі — яе прымеркавалі да Сусветнага дня культурнай разнастайнасці ў імя дыялога і развіцця. На міжнародным узроўні такое свята адзначаецца 21 мая. І мы ў Беларусі таксама святкуем гэтую дату. У кожнай вобласці праходзяць мясцовыя і рэгіянальныя фестывалі, журы адбірае лепшыя нумары, вылучае нацыянальныя кухні, промыслы, іншае — бо прадстаўлена цэлая палітра, і ў віры падзей — розныя нацыянальныя падворкі. У Гродне, на заключным этапе разгортваецца шырокая панарама падворкаў: яўрэяў, татар, літоўцаў, іншых — на сённяшні дзень у нас афіцыйна зарэгістравана 25 нацыянальных супольнасцей, якія маюць 124 свае арганізацыі.

— Зараз у Гродне, які перажывае рэстаўрацыю сваёй гістарычнай часткі, размова пра нацыянальныя культуры можа загучаць досыць надзённа...

— Сапраўды, гэта адзін з нашых адметных цэнтраў па захаванні культурных каштоўнасцей. Тут у гістарычнай частцы захавалася шмат помнікаў культуры. І для нацыянальных супольнасцей падбіраюцца адпаведныя месцы. Скажам, калі падворак немцаў — дык ёсць у Гародні і гістарычны будынак кірхі. На падворках можна пачаставацца нацыянальнымі стравамі, патанчыць, песні паслухаць. І вершы пачытаць, і народныя промыслы пабачыць. На думку многіх нашых гасцей гэты фэст унікальны для ўсёй Еўропы. Гэта адна з візітовак на ніве духоўнага адраджэння.

— Міжканфесійная, міжнацыянальная згода і мір — аснова асноў прагрэсу: эканамічнага, культурнага, палітычнага. Але 25 нацыянальных суполак — гэта як мінімум 25 розных характараў. Як іх аб'яднаць, каб мацавалася сяброўства?

— Так, 25 — гэта найбольш масавыя, якія маюць свае юрыдычна зарэгістраваныя аб'яднанні. А калі наогул пра нацыянальную палітру гаварыць, то ў Беларусі маецца звыш 140 нацыянальнасцей. Ёсць прадстаўнікі, напрыклад, па адным чалавеку — але гэта таксама іншая нацыянальнасць. Рэгіструюцца звычайна там, дзе ёсць кампактнае пражыванне. Паводле статуту яны маюць права на захаванне сваёй гісторыка-культурнай спадчыны. І выконваюцца адукацыйныя, культурна-асветныя, інфармацыйныя праграмы, вядзецца адукацыя на роднай мове. У такіх супольнасцях, як палякі, літоўцы нават па дзве школы на нацыянальных мовах працуюць: польская школа ў Гродне і Ваўкавыску. У Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці ў вёсцы Рымдзюжа ёсць школа на два паверхі: на адным вучацца на беларускай мове, а на другім — на літоўскай; прыватная школа з літоўскай мовай навучання знаходзіцца ў вёсцы Пеляса Воранаўскага раёна. Там, дзе нельга школу цалкам адкрыць — ёсць магчымасць сабраць клас. Альбо можна арганізаваць гуманітарны цыкл з этнакампанентам — нават пры пазашкольнай рабоце. Ёсць такая форма, як школа нядзельная, школа выхаднога дня.

Апошнім часам па ўсёй Еўропе паўстала тэма інтэграцыі цыганскага насельніцтва ў дзяржаўны лад жыцця. Уявіць сёння наш свет без цыганскай песні, танца немагчыма. Мову сваю захавала — гэта унікальна! З АБСЕ да нас прыязджалі, з тым, каб вывучыць наш досвед у гэтым кірунку. І ў нас ёсць што паказаць — цяпер цыганы практычна перайшлі ад вандроўнага да аселага ладу жыцця, імкнуцца стварацьсвае адукацыйныя, культурна-асветныя, інфармацыйныя праграмы. Маюць сваю газету і пры падтрымцы ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей са снежня 2004 года раз на квартал выходзіць бюлетэнь “Романо лав”, першае друкаванае выданне ў гісторыі цыганоў Беларусі.

А як усіх паяднаць? Галоўны клопат дзяржавы ў гэтым плане — выхоўваць нацыю, адзіны народ (хоць і шматнацыянальнае, многаканфесійнае грамадства), каб кожны ганарыўся, што ён — грамадзянін гэтай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

— Якраз дыялог культур — гэта характэрная адзнака грамадства, якая існавала ва ўсе часы...

— І сёння пад дыялогам культур мы разумеем не стыхійнае спасціжэнне адно аднаго, а свядомае асэнсаванне гісторыка-культурнай спадчыны народаў, засваенне цвёрдых правіл: павага да традыцый і побыту любога з народаў, прадвызначэнне адрознасці яго пераканаццяў, роўнасць пазіцый у працэсе дыялога. Відаць, толькі пры такіх правілах можна пераадолець недавер, які застаўся нам у спадчыну ад мінулых часоў, навучыцца шанаваць па-сапраўднаму набыткі адно аднаго, ісці насустрач.

— Варта, відаць, згадаць пра наша супрацоўніцтва на літаратурнай глебе. У нас ёсць імёны творцаў, якія належаць многім народам. Як сцвердзіць тыя каштоўнасці, пра якія дбалі нашы вядомыя асветнікі?

— Сапраўды, у 1998 годзе мы шырока святкавалі 200-годдзе Адама Міцкевіча. Геній польскай, беларускай, сусветнай літаратур. Але яго дала свету Беларусь. На гэтай зямлі ён нарадзіўся, тут яго вытокі. Зямля і неба, увесь беларускі Космас уплываў на гэтую асобу. І калі мы чытаем “Пана Тадэвуша”, пазнаём Беларусь, Навагрудчыну. І калі мы гаворым, што “Новая зямля” — гэта энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства, то “Пан Тадэвуш” — гэта энцыклапедыя жыцця дваранства, шляхты. Гэта наша літаратура!

У нас ёсць месцы, звязаныя з імем Пушкіна. Таму невыпадкова ўрачыста святкавалі ў 1999-м яго 200-годдзе. У нас ёсць мясціны, звязаныя з нашчадкамі паэта. Гэта і Навагрудчына, і вёска Цялуша ў Бабруйскім раёне, дзе жыла ўнучка Пушкіна і многа зрабіла нават для нацыянальнай культуры. У вёсцы дзейнічае царква, на яе сродкі пабудаваная. І школа там некалі была, заснаваная ёю, але не захавалася.

Альбо згадайма Марка Шагала, які выйшаў на ўзровень сусветнай культуры! Але найперш — гэта культура Віцебска, беларускага народа. І такіх прыкладаў багата.

Паглядзіце: нас у цэнтры Еўропы дратавалі, замешвалі на крыві захопнікі, ідучы з Захаду на Усход, з Поўначы на Поўдзень. А мы выжывалі: таму што былі моцныя духам адзінства.

— Сярод тых, хто ўмацоўваў гэты дух, — Канстанцін Астрожскі, 400-годдзе памяці якога мы святкуем у гэтым годзе. І спадчына якога належыць чатыром народам як мінімум: гэта беларусы, украінцы, літоўцы, палякі...

— Мы вельмі хораша святкуем угодкі Канстанціна Астрожскага — тут вялікая падзяка праваслаўнай царкве. Гэта асоба з кагорты Гусоўскага, Скарыны, бо датычыць асветніцкай і выдавецкай дзейнасці таксама. Уявіце сабе толькі Астрожскую Біблію, выдадзеную пры намаганнях Канстанціна Астрожскага, што перададзена Беларускай царквой нашай Нацыянальнай бібліятэцы, — гэта яскравы, унікальны гістарычны помнік, аналагаў якому не было па тым часе ва ўсходнеславянскім свеце!

— Нацыянальныя супольнасці, якія добра ведаюць гісторыю, спадчыну народаў, могуць актывізаваць захады па вяртанні нашых каштоўнасцей на Радзіму. Знакамітыя слуцкія паясы прывезлі ў наш Нацыянальны мастацкі музей з Дзяржаўнага гістарычнага музея Расіі). Яны будуць экспанавацца ў нас не менш як год...

— У гэтым плане наша ведамства знаходзіць узаемаразуменне з Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі. Дзяржаўныя ўстановы і ведамствы, музеі ды бібліятэкі нам падказваюць, як трэба дзейнічаць. Адам Іосіфавіч Мальдзіс — ён, так бы мовіць, як энцыклапедыя ў справах па дыяспары... Мы супольна працуем з усімі, каго ведаем, бо калі не мы зробім, то хто ж?

— Вядома пра замову вашага ведамства геаграфічнаму факультэту Белдзяржуніверсітэта наконт адмысловага атласа «Канфесіі і культавыя пабудовы Беларусі». Што ўжо зроблена?

— Работа над атласам канфесійнай сферы завершана ў мінулым годзе. Яна вельмі высока ацэнена на дзяржаўным узроўні. Ёсць яе электронная версія і на папяровых носьбітах маем. Па кожным раёне, вобласці ёсць карта, дзе геаграфічна пазначаны помнікі, гісторыка-культурныя каштоўнасці розных канфесій. На турыстычных маршрутах пераважна пазначаны рэлігійныя забудовы, а зараз плануем распрацоўваць маршруты па нацыянальных святынях. Зноў жа згадаем Віцебск, найперш Шагала, у Гродне, Паставах — Тызенгаўза, Ажэшку, Міцкевіча, Манюшку... Для мяне самога, да прыкладу, сталася адкрыццём вёска Мосар Глыбоцкага раёна, дзе ўзвышаецца каталіцкі касцёл Ганны 1792 года. Ксёндз Ёзас Булька, сам літовец, асабіста нямала зрабіў, каб звярнулі ўвагу на старажытную пабудову, і тое, якая ў ёй і вакол яе высокая культура! Альбо згадайма касцёл у Гервятах Астравецкага раёна, такія слынныя помнікі, як Жыровіцкі манастырскі комплекс, наш старажытны Полацк...

— Ведаю, што працягваецца супрацоўніцтва нацыянальных супольнасцей з многімі сталічнымі і абласнымі бібліятэкамі па фарміраванні кніжных фондаў літаратуры розных народаў...

— Калі першым разам у маі 2004 года на базе Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы ладзілі “круглы стол” з нагоды Сусветнага дня культурнай разнастайнасці ў імя дыялога і развіцця, то зладкавалі вялікі дыялог культур.

Праз бібліятэчныя зборы кніг сваім дарункам дзеляцца з намі творцы — вучоныя, пісьменнікі, мастакі. Менавіта праз кнігу мы спазнаём гісторыі і лёсы усіх народаў свету. У нас ёсць базавыя бібліятэкі, дзе працуюць нацыянальныя супольнасці. Скажам, у 4-й бібліятэцы Мінска — аддзел малдаўскай літаратуры, у 20-й — украінскай і літоўскай, у “талстоўцы” — грэчаскай літаратуры. Не кажучы пра Нацыянальную бібліятэку Беларусі, дзе багата перспектыў для супрацоўніцтва. Можа, нам ніхто так, як бібліятэкары, не дапаможа ў гэтай справе, бо яны — першыя нашы дарадцы і памагатыя пры сустрэчы з кнігай, з напісаным. А напісанае — гэта ж абагульненае. І яно застаецца.

Ірына ТУЛУПАВА
Фота аўтара

Шляхі да храма

Псіхолагі кажуць, што калі чалавек бачыць нешта незнаёмае, то перш за ўсё вока акрэслівае сілуэт, контур. А ўжо потым — дробныя часткі, дэталі. Успомнілася гэта таму, што пры пад'ездзе да любога паселішча яшчэ здалёк, як нейкі арыенцір, як своеасаблівую пуцяводную зорку, бачыш сілуэты купалоў і вежаў храмаў, што ўзнімаюцца над забудовай. І адразу ахоплівае адчуванне спакою, упэўненасці і ў сённяшнім, і ў заўтрашнім дні.



Нейкія падобныя пачуцці ўзнікаюць пры знаёмстве з новымі выданнямі выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі". Дзве новыя кнігі, прысвечаныя архітэктуры культавых збудаванняў, убачылі свет пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (А. М. Кулагін Праваслаўныя храмы Беларусі; А. М. Кулагін Каталіцкія храмы Беларусі).

Кнігі, падрыхтаваныя гэтым выдавецтвам, заўсёды прапануюць цудоўную вандроўку па Беларусі. Але ж тут справа асаблівая. Найперш шукаеш назвы родных мясцін ці тых паселішчаў, дзе пашчасціла пабываць, у надзеі паглядзець на знаёмую царкву ці касцёл. І вось, калі адгорнеш старонку з назвай сваёй вёскі ці свайго горада і бачыш гэты храм дагледжаным, прыгожым, а не прыстасаваным пад нейкія патрэбы, як гэта было калісьці, то ахоплівае разуменне тых зменаў, якія адбыліся.

У параўнанні з папярэднімі выданнямі вядомага даследчыка гісторыі беларускай архітэктуры Анатоля Кулагіна пра беларускія храмы ў новых кнігах больш дакладнымі сталі звесткі пра тыя будынкі, што з'явіліся на Беларусі ў апошнія гады. І хаця гэтыя звесткі яшчэ няпоўныя (напрыклад, пададзены не ўсе прозвішчы архітэктараў, нават дастаткова значных і найбольш удалых будынкаў, і інфармацыя выкладзена не заўсёды роўна, усё ж адчуваецца вялікі працэс абуджэння, які ахапіў беларускае грамадства.

Да станоўчых бакоў кнігі можна аднесці ўстрыманне аўтара ад тэрмінаў, якія былі народжаны ў савецкія часы на хвалях адмоўных адносін да гістарычнага мінулага. На старонках ранейшых выданняў можна сустрэць словазлучэнні "несапраўдная готыка", "несапраўдны рускі стыль" і г.д. Гэта было імкненнем панізіць гістарычную і мастацкую значнасць дойлідства таго часу. А тэрміны "неаготыка" ці "рэтраспектыўна-рускі стыль" — ставяць усё на свае месцы.

Звярнітае на сябе ўвагу тое, што аўтар не абмінуў каплічак — гэтых неад'емных часцінак беларускага краявіду. Яны звычайна заставаліся па-за полем зроку даследчыкаў, таму толькі некаторыя з іх, і то выпадкова, маглі апынуцца на старонках якіх-небудзь выданняў. А менавіта гэтыя невялічкія пабудовы захоўваюць не толькі народныя будаўнічыя традыцыі, але і традыцыі адносін беларусаў да сваёй духоўнай спадчыны.

Выданні добра забяспечаны ілюстрацыямі. Важна тое, што гэта найноўшы матэрыял, які адлюстроўвае рэальны стан будынкаў. Фотаздымкі красамоўна распавядаюць аб працэсах рэканструкцыі. Здымкі сучасных культавых збудаванняў сведчаць, што стварэнне матэрыяльных умоў для іх аднаўлення магчымае, а сродкі для гэтага могуць быць розныя. Таму трэба адзначыць руплівую працу тых, хто за досыць кароткі час змог аб'ездзіць усю краіну і склаці своеасаблівы фундаментальны звод цікавага факталагічнага матэрыялу.

Як і ўсялякая вялікая справа, гэтыя выданні маюць не тое што памылкі, а хутчэй патэнцыял для далейшага паляпшэння. Напрыклад, уступная частка занадта маленькая. Справа ў тым, што чытач можа мець розную падрыхтоўку: нехта добра ведае гісторыю, працэсы развіцця веравызнання ў Беларусі, разбіраецца ў архітэктурных стылях, а хтосьці ўпершыню, дзякуючы гэтым выданням, зразумеў, што культура беларускага народа складаецца са шматлікіх пластоў. Таму ўступ, які азнаёміў бы чытача з асноўнымі кірункамі развіцця культавай архітэктуры ў Беларусі, з асноўнымі мастацкімі стылямі, што вызначаюць асаблівасці знешняга выгляду цэркваў і касцёлаў, быў бы, на мой погляд, карысны. Тэрміналагічны слоўнік — неабходная частка кожнага з абодвух тамоў, аднак гэта не здымае дадзеную праблему.

Здаецца, патрэбны асобны ўступ і да раздзела "Страчаная спадчына". Можна зразумець і нават пагадзіцца з тым, што калісьці знік будынак, які мае шматвяковую гісторыю. Прыйшоў час, і яго разабралі, а драўляны мог і наогул згарэць. Але чаму зніклі новыя будынкі 1920—30-х гадоў? Не простым было жыццё культавых збудаванняў і ў больш старадаўнія часы, у XVII—XVIII стагоддзях. Тлумачэнне гэтых працэсаў дазволіла б чытачу зразумець, чаму на пэўныя часы заціхала будаўніцтва, і больш паважліва ставіцца да тых храмаў і капліц, якім пашчасціла захавацца.

Можна было б даць спіс выкарыстанай літаратуры альбо кніг, да якіх аўтар рэкамендуе чытачу звярнуцца, каб нешта ўдакладніць ці пашырыць свае веды. Справа ў тым, што ў звестках пра асобныя збудаванні сустракаюцца спасылкі на літаратуру альбо архіўныя матэрыялы. І незразумела, чаму толькі асобныя. Напрыклад, тэкст пра касцёл у Камаях "падтрымліваюць" спасылкі на ранейшыя выданні, а артыкул пра такі значны помнік, як царква ў Мураванцы, — не.

На жаль, сустракаюцца і дробныя недарэчнасці, якія ўсё ж засмучаюць. Пасля дзесяцігоддзяў замоўчвання і хлусні наконт усяго, што звязана з рэлігіяй, хацелася б мець дакладныя звесткі. Архітэктарам храма ў Горках пазначаны Анжэла Кампіоні, але на 1863 год ён даўно ўжо ў Горках не працаваў. Ёсць і некаторая блытаніна ў назвах храмаў. Але трэба ўлічваць той перыяд, які перажыло наша грамадства, калі ніхто не вёў сваіх радаводаў, не пісаў праўдзівай гісторыі сваіх мясцін і вёсак, таму такія памылкі і недарэчнасці цалкам заканамерныя. Аўтар кнігі выканаў такі аб'ём працы, які робяць цэлыя калектывы, таму зусім пазбегнуць недакладнасцей — проста фізічна немагчыма.

Цяпер мала хто ведае, што ў царкве Успення Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Косіна Лагойскага раёна ў далёкім 1812 годзе армія, якой камандаваў М. Кутузаў, правяла ўрачыстае набажэнства ў гонар вядомай перамогі на Бярэзіне. Але гэта толькі паданне, што жыве ў мясцовай памяці. А ці было гэта на самай справе? Калі так, дык па-іншаму пачне ўспрымацца будынак царквы, які шмат чаго пабачыў у сваім жыцці. Ды вось недарэчнасць: у кнізе пра праваслаўныя храмы гэтая царква азначана як пабудаваная ў 1865 годзе. А як тады быць з гэтым паданнем? Калі звесткі пра падзеі 1812 года — не перабольшванне, звычайнае для народных паданняў, то і дата заснавання царквы патрабуе ўдакладнення. А можа быць, гэта сапраўды толькі легенда, да якой мела дачыненне папярэдняя царква гэтай вёскі? Дык і яна заслугоўвае ўвагі. Напрыклад, вельмі прыемна было даведацца ў адной з вышэйзгаданых кніг пра тое, у якім касцёле хрысцілі будучага народнага паэта Янку Купалу. І такіх цікавых звестак пра наша мінулае, пра нашых вядомых продкаў вельмі многа.

Усё зазначанае можа быць дададзена да таго, што пачаў рабіць А. Кулагін. І тады наша сучаснасць стане яшчэ больш разнастайнай і прывабнай. А кнігі гэтага даследчыка — добрая дапамога тым, хто імкнецца больш ведаць пра родны край, сваіх продкаў.

Сяргей СЕРГАЧОЎ

Рэцэпт добрага non-fiction

Жанравая палітра сучаснай літаратуры вельмі стракатая. Аднак усё большым попытам карыстаецца сумяшчэнне жанраў.

Нячасты госць у Мінску (усё больш у Магілёве), Уладзімір Казлоў нарадзіўся ў Магілёве. Скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт і школу журналістыкі пры Універсітэце штата Індыяна ў Блумінгтане, ЗША. Вядзе калонку "Culture Watcher" ("Назіральнік за культурай") у газеце "Moscow News". Выдаў кніжкі: "Гопнікі", "Варшава", "Плацкарт", "Попс", "Эма". Нядаўна прыязджаў у сталіцу з прэзентацыяй сваёй новай кнігі "Эма". Назва можа выклікаць усмешку: маўляў, бачылі, ведаем падлеткаў з касымі чубкамі, апранутых у чорнае ды ружовае. Цікавасць выклікае жанр твора — нон-фікшн.

Англійскае слова *fiction* азначае "выдумка" і супрацьпастаўляецца слову "факт". Фікшн — гэта мастацкая літаратура, белетрыстыка, плод фантазіі. Адсюль non-fiction — літаратура непрыдуманая, заснаваная на з'явах рэальнага жыцця.

— *Словы фікшн і нон-фікшн у мове з'явіліся адносна нядаўна. Такая літаратура не ўпісваецца ў традыцыйныя рамкі — у ёй моцны элемент журналістыкі, таму яна цікавая. Але увогуле ў катэгорыю тэкстаў нон-фікшн трапляе літаральна ўсё: ад інструкцыі да пыласосу і да мемуараў.*

У літаратуры — гэта гібрыд журналістыкі і прозы. Элементы рэпартажу, інтэрв'ю, факты і меркаванні аўтара змешваюцца ў розных прапорцыях. Узнікненне нон-фікшн тлумачыцца пазіцыяй выдаўцоў: мастацкая кніга павінна інфармаваць. Так было з кнігамі Дэна Брауна, Артура Пэрэс-Рэвэртэ, Анры Левенбрука. Па сутнасці, чытач займаецца самападманам: маўляў, якія каштоўныя звесткі я атрымаў з тэалогіі, гісторыі мастацтва і сярэднявечнай Еўропы.

Але гэта прадаецца.

— *Спалучаць глянцавы часопіс, пазнаваўчую перадачу і мастацкую прозу не зусім правільна. У Амерыцы нешта падобнае з'явілася яшчэ ў 60-я, калі Хантэр Томпсан напісаў "Анёлаў пекла". Так журналістыка наблізілася да літаратуры.*

Уладзіміру Казлову таксама прапанавалі напісаць у жанры нон-фікшн пра эма. І ён выразшыў паглядзець, што з гэтага атрымаецца.

— *Я не ведаў пра гэту субкультуру абсалютна нічога, кнігу трэба было пачынаць з нуля. Сам паставіў сабе жорсткія ўмовы — максімум паўтара месяца. Пагаварыў з піцерскай эма-групай "Арыгамі" і зразумеў, што сабранага матэрыялу на кнігу не хопіць. Не той калібр асобы, не той калібр з'явы. Кніга была б цікавая толькі прыхільнікам групы. Таму я вырашыў стварыць даведнік, які б уключыў усю інфармацыю пра гэту субкультуру. Я разбавіў яго цытатамі з форумаў, блогаў, сваімі назіраннямі на канцэртах, каб ён не здаваўся занадта сухім.*

Паводле слоў Уладзіміра Казлова, "*кніга трапіла ў кантэкст*". Без папулярнасці субкультуры *эма* нічога б не атрымалася.

Вольга ГРУША

Кніжная паліца

У выдавецтве "Беларусь" выйшла навукова-літаратурнае ілюстраванае выданне для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту "*Малая дзіцячая чырвоная кніга*" **Віктара ГАРДЗЕЯ**. Як напісана ў прадмове, "у займальнай і дасціпнай форме, часта з усмешкай і гумарам аўтар апавядае пра біялогію рэдкіх і знікаючых відаў фаўны Беларусі, прычым праз цеснае спалучэнне верша і празаічнай замалёўкі ".

Выйшаў у свет першы за 2008 год выпуск альманаха "*Гоман літаратуры*". Па сутнасці гэта працяг папярэдніх пяці выпускаў альманаха "Гоман". Новы альманах больш кампактны і арыгінальны. Як піша ва ўступным слове яго галоўны рэдактар **Мікола ТРАФІМЧУК**, у ім "захаваны лепшыя раздзелы, рубрыкі, якія атрымалі прызнанне ў аўтараў ды чытачоў пробных выпускаў. Застаецца традыцыйным і штогадовы конкурс на лепшага аўтара альманаха ў намінацыях "Паэзія" і "Проза".



У выдавецтве "Чатыры чвэрці" пабачыла свет кніжка вершаў і песенных тэкстаў **Надзеі САЛОДКАЙ** "*Апошняя квадра*". Як напісана ў анатацыі, "*жыццё і пачуцці — гэта мы, гэта не проста заўсёднае, гэта вечнае. Пра тое і чарговы зборнік паэзіі. А таксама — песні, якія гучаць і будуць гучаць доўга*".

У Таварыстве беларускай культуры ў Літве (Вільня, 2007) выйшла кніжка **Мар'яна ПЕЦЮКЕВІЧА** "*Мой дзённік*" (пра падарожжа ў Рым). Гэта нататкі вядомага вучонага-беларуса, які жыў у Торуні (Польшча) і працаваў загадчыкам беларускага аддзела музея этнаграфіі.

У Лунінцы выйшаў у свет чацвёрты выпуск бюлетэня творчага клуба "Муза" "*Выток*". У нумары: інфармацыя пра сустрэчы, творчыя вечарыны, імпрэзы, нізкі вершаў. Змешчана грунтоўная рэцэнзія на кніжку прозы М. Купрэева **"*Палеская элегія*"** вядомага крытыка М. Тычыны.

У Гомелі, у ААТ "Палесдрук", выйшаў чарговы зборнік мясцовай пісьменніцы **Ганны АТРОШЧАНКІ** "*Дома і салома ядома*" (казкі і вершы). Кніжачка прызначана для школьнікаў малодшых і сярэдніх класаў. У ёй чытачы знойдуць цікавыя беларускія прыказкі і прымаўкі, а таксама творы, якія вучаць мудрасці, дабрыні і любові да сваёй Айчыны. Зборнік аздоблены самабытнымі малюнкамі аўтаркі.



«ПОЛЫМЯ» № 5

Нумар атрымаўся надзвычай багаты і разнастайны. Безумоўна, увагі заслугоўвае публікацыя нізкі сучасных сербскіх паэтаў, ваенных вершаў І. Шамякіна, аповесці Б. Немцавай "Бабуля" і вершаў Ю. Свіркі. Крытыка і літаратуразнаўства прадстаўлены артыкуламі А. Яскевіча, З. Драздовай, Д. Бугаёва, М. Яфімавай, Г. Зяневіч. Аднак найбольш глыбокае ўражанне робяць усё-ткі празаічныя творы.

Апавяданні А. Кажадуба прыкметна вылучаюцца на фоне сучаснай беларускай прозы — нязвыклыя героі, нязвыклыя сюжэты... А самае нязвыклае — своеасаблівая недагаворанасць, непразрыстасць аўтарскай задумы. Так, "Качка па-пекінску" — турыстычная замалёўка, "Ганна" — навагодняя казка. У абодвух апавяданнях аўтар не пакідае аніякіх зачэпак для разгадкі ідэі твора: гісторыі расказвае займальныя, цікавыя але... без канцоўкі і развязкі. Трэба прызнацца, што ў некаторай ступені гэта нават імпануе — сучасны чытач не прагне дыдактычнасці і будзе ўдзячны аўтару за лёгкасць стылю.

Зусім іншае ў апавяданнях І. Канановіча "Вяртанне" і "Зора і Канарац": сур'ёзныя тэмы і драматычныя высновы. "Вяртанне" — твор глыбокіх псіхалагічных кантрастаў. Спачатку аўтар стварае сцэну імянін галоўнай гераіні Алены, на якія збіраецца вялікая сям'я, калі ўсім весела, добра і ўтульна, адным словам, сямейная ідылія. Аднак ідылія гэтая аказваецца даволі хісткай і не вытрымлівае праверкі сур'ёзнымі праблемамі... Безумоўна, тэма апавядання выходзіць за межы лёсу сям'і і адзіноты старога чалавека пры наяўнасці вялікай колькасці блізкіх сваякоў. Гэта асэнсаванне захавання духоўнага пачатку ў чалавеку, зменлівасці пераканання і жыццёвых прыярытэтаў, што становіцца надзвычай актуальным у наш час. Лаканічнасць аўтарскай манеры ў апавяданні "Зора і Канарац" спрыяе большай мастацкай выразнасці, кампенсуючы тым самым недастатковую распрацаванасць вобразаў.

Рубрыка "Школьныя далягляды" прадстаўленая артыкуламі І. Кірвель, М. Шамякінай, Л. Алейнік, а таксама аповесцю В. Гапеева "Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці". Аповесць заслугоўвае асобнай гаворкі, паколькі сапраўды з'яўляецца яркім і бясспрэчна цікавым творам юнацкай літаратуры. Варта зазначыць, што аповесць цалкам пабудавана на камп'ютэрнай лексіцы, у пачатку твора аўтар нават прыводзіць своеасаблівы слоўнічак з дасціпнай заўвагай: "калі што дарослым застанецца незразумелым, варта папытаць аб тым у дзяцей". Верагодна, такая "камп'ютэрызацыя" спатрэбілася В. Гапееву для набліжэння да жыццёвай канкрэтыкі сучасных падлеткаў, чаго ён сапраўды дасягнуў. Разам з тым, В. Гапееў закранае вельмі сур'ёзную праблему — зразумела, за вонкавай гумарыстычнасцю, не нагружаючы чытача маралізатарствам, — страты навыкаў жывога ўзаемадачынення, калі маўленне і мысленне пачынаюць будавацца паводле законаў скарочанай электроннай перапіскі. Галоўны герой — замкнуты і сарамлівы хлопец Лёшка — становіцца ахвярай жарту свайго сябра Юрыса, які заводзіць з ім на форуме перапіску пад дзявочым нікам "Ксенка". Неўзабаве небарака Лёшка закахаўся ў фантом, створаны яго ж сябрам. А вось заканчэнне твора выклікае

«...Адрынуўшы глупства паперы»

"Калі лірыка падобная да любоўнай прыгоды, то навела нагадвае хутчэй камерцыйны кантракт, згодна з якім аўтар абавязвае сябе распавесці нешта цікавае, а чытач згаджаецца гэтаму паверыць і прыняць усё за рэальнасць, прынамсі, на час чытання. Дык вось, каб скласці такі кантракт, трэба "мати чим торгувати". Сістэматычна распавядаць самога сябе, як гэта робяць лірычныя паэты, у прозе немагчыма, у прозе гэта можна зрабіць толькі аднойчы.

Майк Ёгансен

заканамернае чытацкае абурэнне: аповесць заканчваецца, як кажуць у такіх выпадках, на самым цікавым месцы. Юрыс выпраўляецца шукаць Лёшку, які не вярнуўся ўвечары дадому, аднак вынікаў гэтых пошукаў чытач не даведваецца. Але тут якраз і пачынаецца другая частка аповесці: кожны чытач мае магчымасць прапанаваць свой варыянт развязкі.

«НЁМАН» № 5

Майскі нумар "Нёмана" прысвечаны Дню перамогі, што і вызначыла асноўную тэматыку як мастацкіх, літаратурна-крытычных, так і публіцыстычных тэкстаў.

Пачатак рамана В. Ткачова "Паміж ноччу і днём" (пераклад М. Пазнякова) робіць дваістае ўражанне: некаторыя эпізоды чытаюцца надзвычай цікава, тым больш, што асэнсаванне вострых сацыяльна-грамадскіх супярэчнасцей нядаўняй гісторыі (1990-я гады) — тэма сапраўды актуальная і недастаткова асветленая ў нашай літаратуры, аднак твору відавочна нестае цэласнасці, зладжанасці сцэн і эпізодаў, і справа не ў частых рэтраспектыўных адступленнях, але ў адсутнасці дынамічнага сюжэта, які б знітоўваў усе падзеі ў адно цэлае.

Яркасцю, нават кінематаграфічнасцю сюжэта ўражвае апавяданне Г. Фёдаравай "Пароходов гудки прощальные..." Дзеянне адбываецца падчас Вялікай Айчыннай вайны. У вёску прывозяць эвакуіраваных дзяцей, даглядаць якіх падахвочваецца і галоўная гераіня — маладая дзяўчына Паліна. Нечакана ў яе з'яўляецца маленькі сябар — хлопчык Карык, які пазнаў у Паліне сваю былую суседку Лесю. Каб не траўміраваць расчараваннем псіхіку дзіцяці, Паліна не спяшаецца тлумачыць яму, што ён памыліўся, пераблытаў яе з некім іншым, і прымае гэтую своеасаблівую гульню.

Г. Фёдарава з вялікім псіхалагічным майстэрствам апісвае перажыванні Карыка, яго дзіцячую рэўнасць, яго пачуцці да Паліны, якую ён называе Лесяй. У апавяданні няма разгорнутых унутраных манолагаў, у якіх бы напоўніцу раскрываўся ўнутраны свет герояў, аднак гэта і не патрабуецца: аўтарцы ўдаецца некалькімі штрыхамі стварыць такую трапную характарыстыку, што дадатковыя апісанні былі б лішнія. Падтэкставая насычанасць твора настолькі моцная, што ледзь не кожнае выказванне герояў і кожнае слова аўтара выглядае шматзначным. Сапраўды, пісьменніца не дае каментарыяў адносна таго, што значыць для маленькага хлопчыка сустрэча з Палінай-Лесяй і як успрымае гэтую гульню сама галоўная гераіня, хаця мастацкі патэнцыял гэтых эпізодаў надзвычай вялікі. Мы сустрэнем толькі некалькі фраз: "Полинка всё поняла, но не знала, что ответить и как вести себя: принять ли то, во что верил мальчик, или сказать ему правду, объяснить, что ошибся?.. Но это значит — порвать последнюю ниточку, которая связывала его с кем-то или чем-то родным и за которую он так крепко держался". Ствараецца ўражанне, што Г. Фёдарава наўмысна пакідала некаторую незавершанасць у выказваннях, каб зрабіць іх больш уражвальнымі. Аднак самым важным у гэтым апавяданні падаецца ненавязлівасць, адсутнасць дыдактычнасці і адцягненага філасофствавання на патрыятычныя тэмы, што вельмі часта сустракаецца ў творах ваеннай тэматыкі і што адштурхоўвае ад іх прадстаўнікоў найменш маладзейшага пакалення.

Заўважае гэтую праблему і Р. Радчанка, які прадставіў нізку замалёвак "Деды". Асэнсоўваючы светапоглядную бездань паміж пакаленнямі "бацькоў" і "дзяцей", аўтар прапануе шлях збліжэння: "Почаще рассказывайте своим детям об их дедушках, прадедушках, бабушках. Старайтесь не приукрашивать жизнь стариков. Пусть наши "малята" знают, что их предки были обыкновенными людьми со своими достоинствами и слабостями, жившими в сложное, тяжелое, а порой и страшное и жестокое время". Падаецца, што менавіта такі "шчыры падыход" акурат і мог бы даць пэўны выхаваўчы плён, таму што шчырасць заўсёды выклікае зацікаўленасць і водгук.

Паэзія прадстаўлена вершамі Р. Сакалоўскага, Э. Зубрыцкага, В. Норынай, І. Журбіна, М. Стрыгалёва, Ю. Салаўёва; крытыка і літаратуразнаўства — артыкуламі В. Максімовіча, У. Гніламёдава, К. Камейшы, А. Карлюкевіча. Даволі цікавы матэрыял прадстаўлены ва ўспамінах Л. Казловай "Моя жизнь и моя война".

«МАЛАДОСЦЬ» № 5

Спрэчная гэта думка ці вядомая ісціна — тое, што пра паэзію пісаць цяжэй? Праўда, большая ўвага да прозы ў аглядных артыкулах тлумачыцца іншай прычынай: па адным-двух апавяданнях пра аўтара меркаваць можна, а вось па адным-двух вершах — далёка не заўсёды, высновы могуць быць выпадковымі і несправядлівымі. Але ж хіба не большая несправядлівасць у тым, што паэзія нібы адсоўваецца на другі план: калі друкуецца апавяданне, аповесць, раман, то тут і герой, і час, і аўтарскае бачанне рэчаіснасці, калі выходзіць падборка вершаў, то заслугоўвае адно канстатацыі факта прысутнасці на часопісных старонках.

Імкнучыся хаця б у некаторай ступені выправіць дысгарманічнасць гэтай сітуацыі, я спынюся на аглядзе маладосцеўскіх вершаў.

Нізка В. Чайкоўскай адкрываецца дзёрзкім вершам "Новае":

Шукаю форму, што
Па-за нормай.
У якой без словаў
Сэнсу хапае <...>
Каб стварыць
ад канца
да пачатку
Па нескладзеным шчэ
парадку —
НОВАЕ.

Верш у пэўным сэнсе праграмны для сучаснай маладой паэзіі: усе шукаюць тую самую "форму, што паза нормай". Праўда, падчас пошуку рэдка хто спыняецца — азірнуцца, ацаніць, параўнаць, каб зразумець, што не толькі "без словаў" сэнсу не хапае, але і са словамі разабрацца цяжкавата. Вось, напрыклад:

Ты толькі сваімі пальцамі
прамяністымі
у мае валасы выстралі.

Можна прыдумляць розныя эстэтычныя формулы ў якасці ключа да ўспрымання такіх метафар, можна распрацаваць нават якуюсьці тэорыю "эстэтыкі недарэчнасці", што яскрава выяўляецца ў творах В. Чайкоўскай і характарызуе маладую паэзію ўвогуле... Толькі гэта будзе не аналіз паэзіі, а спроба апраўдання яе бессэнсоўнасці, бо рэч не ў эстэтызме, арыгінальнасці і наватарстве, а ў тым, што паэзія страчвае зрок і слых — адмяжоўваецца ад усяго жывога і скіроўваецца на шлях недарэчнага (бо арыгінальнага) спалучэння слоў. Самамэтная ўвага да гульні са словам пераўтвараецца ў павярхоўнае стаўленне да тых культуралагічных сэнсаў, якія яно нясе:

На неба залезла.
Паблукала.
Пашукала анёлаў там
апосталаў, Бога.
Не знайшла нікога.
І назад знікла дарога.
Во нябога!

Ды што казаць пра сэнсы, калі паэты могуць заблытацца і ў націсках? У В. Чайкоўскай, безумоўна, ёсць вельмі цікавыя і адметныя вобразы, якія пакуль яшчэ не сталі вершамі.

Зусім іншае стаўленне і да зместу, і да формы слова прадстаўляюць вершы Н. Кудасавай — паэткі, ад якой заўсёды чакаеш паэтычнай правакацыі: завядзе чытача ў лабірынты патаемнага... і раптоўна кіне, не растлумачыўшы, як вярнуцца назад.

Безумоўна, і тут — гульня са слоўнымі абалонкамі (такі ўжо час!), але ў Н. Кудасавай гэта не недарэчнасць дзеля арыгінальнасці, а сапраўднае паэтычнае чарадзейства, вершы чытаюцца як замовы — на адным дыханні, адной фразай. Разам з тым, насычанасць хрысціянскімі матывамі арганічна ўпісваецца ў паэтычны свет Н. Кудасавай, не адштурхоўваючы ні павярхоўнасцю, ні зададзенасцю:

Нема, каб тут —
у нямашакім свеце —
Не разгубляць, як анёлы,
як дзеці,
Не разгубіцца
ў паўсюдных назовах,
Гэта ў пачатку
яны былі — Слова.

("Нема")

Сэнсавасць ад свядомага стварэння "фанетычнага шаржа" не толькі не траціцца, але набывае шматзначнасць:

Іншы настолькі
прарок карэннем —
пацягні і Расея ўся
з таго карэння высеецца...

("Аляксандру Башлачову")

У сціплай нізачцы Ганны Лукашэвіч вельмі сімпатычнымі, хаця і не пазбаўленымі паэтычных штампаў, падаюцца вершы "Забытая святыня" і "*** Апошні ліст глядзіць з календара" — найперш праз імкненне бачыць далей за вонкавасць слова. Хочацца, праўда, верыць, што тэму Г.Лукашэвіч выбірала сама і шчыра, а не з нечай дарослай падказкі.

Нізка вершаў У. Карызны выразна кантрастуе з творамі маладых паэтаў і лексікай, і вобразамі, і тэматыкай — больш ураўнаважанымі і жыццёва канкрэтнымі. Нічога дзіўнага ў гэтым няма, тым больш, што ладная частка датаваная 1970—1980-мі гадамі. Аднак калі напаўненне вершаў няспынна і заканамерна змяняецца, то некаторыя матывы застаюцца актуальнымі для ўсіх. Адным з такіх матываў з'яўляецца восень: у В. Чайкоўскай "Лісты восеньскія чыпсамі / рыфлёнымі пад нагамі крышацца", у Ю. Нератка "спадніцамі клёш / Легла лісце ў чаканні зімы...", ва У. Карызны таксама ёсць "Сухі лісток". Нягледзячы на тое, што восеньскія матывы маюць не адну сотню гадоў паэтычнага стажа, паэты і да нашага часу надаюць ім адметнае гучанне: безумоўна, восень стала паэтычнай алегорыяй, але ў кожнага алегорыя свая:

Як бы ўсхадзіўся жоўты акіян!
Як бы магутны заіграў арган!
І вось пад гэты шум, бы незнарок,
Зляцеў і той —
даўно сухі — лісток...

("Сухі лісток")

Вершы Ю. Нератка заслугоўваюць асаблівай увагі сваёй шчымлівай, скрайняй, незамаскіраванай шчырасцю. З аднаго боку, паэт не выказвае нічога новага: жыццё, адзінота, наканаванне, восень, каханне... Аднак усё гэта ў такім ідэальным суладдзі перажытага асабіста, вядомага спакон веку, укарэненага ў сутнасныя асновы быцця і напісанага наноў, што вершы не становяцца банальным пераказам жыццёвых ісцін — але хвалююць адкрытасцю духоўнага свету аўтара:

Цвільна, як спёкай
у затхлай запрудзе,
Вусцішна,
быццам на глеістым дне.
Дзе і якая аказія будзе?
Хто і калі падпільнуе мяне?

("Вусціш")

Звяртаецца Ю. Нераток і да паэтычнага паклікання. Праўда, калі ў асэнсаванні гэтай тэмы апошнім часам пераважаюць песімістычныя ноткі, то Ю. Нераток прапануе іншы ракурс: больш "празаічны", іроніяй і досціпам нібыта здымаючы гэтую песімістычнасць, але сэнс акурат вось у гэтым "нібыта":

Ты не злуйся, паэце,
На пустую кішэню:
З ёй, па вернай прыкмеце,
Лепш жывецца натхненню

("Беспрытульнае")

* * *

Заклікаючы радкамі Н. Кудасавай "адрынуць глупствы паперы", я заклікаю разам з прыслухоўваннем да сваёй мастакоўскай волі прыслухоўвацца і да пульсу навакольнага жыцця.

Жана КАПУСТА

Генадзь АЎЛАСЕНКА

ПОРЫ ГОДА

Секстыны

Студзень

Сярэдзіна зімы. Вакол пануе сцюжа.
Ды гэта не заўжды ў апошнія гады.
Дажджы змываюць снег,
і вераб'і ля лужын
Не хочуць гараваць,
што зніклі халады.

Ім хочацца вясны, але ж вясны няма.
Бо студзень на двары і вернецца зіма.

Люты

У лютым маразы. Зіма ізноў лютуе.
Сумёты намяла, сцяжынкі замяла.
Ды маразы зіму наўрад ужо ўратуюць,
Яна ўжо тэрмін свой
амаль што адбыла.

І з ранку на двары спяваюць капяжы:
— Дрыжы, зіма, дрыжы!
Бяжы, зіма, бяжы!

Сакавік

Самотны сон бяроз
прагнаў раўчук з усмешкай.
Салодкі сок бяроз
бруіцца раўчукамі.
Пралескавы блакіт па сцежках
і па ўзмежках
Пасеяла вясна пяшчотнымі рукамі.

І дружна жаўрукі
над полем узлятаюць,
І песнямі шпакі
прыход вясны вітаюць.

Красавік

Змянілася за ноч чаромха-чараўніца
І чарамі яе спавіта зноў зямля.
Світанак п'е расу з нябеснае крыніцы
І чорны небакрай святлее спакваля.

І ўспыхнуў далягляд
ад краю і да краю,
Бо сонца край
глядзіць з-за небакраю.

Травень

Праз водар веснавы,
праз ветрыка павевы
Апошні водблеск дня хаваецца ў траве,
Выводзяць салаўі пяшчотныя напевы
І месяц малады,
у срэбры ўвесь, плыве.

Ён ведае адзін, як хуткаплынна гэта.
Ён бачыць, як вясна спяшаецца
да лета.

Чэрвень

Уецца, як змяя, сцяжынка сярод бору
І цягнуцца ў блакіт
мядзяныя ствалы.
Сунічны водар траў,
духмяны пах чабору
І ледзь прыкметны пах
сасновае смалы.

Знаёмы бор ізноў змяніў сваё аблічча.
І ўсё далей,
далей мяне сцяжынка кліча.

Ліпень

Дождж паступова сціх, звініць раўчук
вясёлы. Вясёлкавы паўкруг над рэчкаю
ўстае.
Над галавой маёй
гудуць-шчыруюць пчолы.
Ім ліпа-гаспадыня мёд дае.

Ды ўсіх пачаставаць
яна не паспявае...
А ў лесе шмат грыбоў. Маліна
паспявае.

Жнівень

Начныя туманы
бялейшыя за вату,
Начныя халады —
яшчэ не халады.
Апошні летні дзень...
хіба ж ён вінаваты,
Што лета разам з ім
знікае ў нікуды?
Зямны кругазварот
спыніць ніхто не можа,
І верасень ужо стаіць
на раздарожжы.

Верасень

Ад ранку грыбнікі шыбуюць
за грыбамі.
У верасні амаль усе мы грыбнікі.
Сядзяць баравікі пад елкамі, дубамі...
Куды не зазірні —
адны баравікі!

І я ў суседні лес трымаю накірунак —
Ад лета атрымаць
апошні падарунак.

Кастрычнік

Кастрычніцкая ноч
вятрамі адспявала,
Апошніх журавоў адправіла ў палёт,
У колер залаты лясы афарбавала,
На жоўтую траву
паклала першы лёд.

Адыдзе ноч, за ёй світанак адляціць
І шэранню трава на сонцы зіхаціць.

Лістапад

Апошні жоўты ліст
самотна адлятае,
Стракатым матылём
імчыцца ў нікуды.
І самы першы снег кладзецца і не тае,
На лужынах... яны нібыта са слюды.

І вось вакол —
адна бялюткая пустэча.
Тут восені з зімой
прызначана сустрэча.

Снежань

Люляюць маразы знямелую прыроду,
А дні ўсё карацей, а ночы ўсё даўжэй.
І Новы год ідзе, і да яго прыходу
Бліжэй чым да вясны,
у шмат разоў бліжэй.

Ён будзе мішурой
на ёлках зіхацець,
І будуць дні даўжэць,
а ночы карацець.

Сяргей БАРАХОВІЧ

Нарадзіўся ў 1983 годзе ў пасёлку Заастравечча Клецкага раёна. Калі прабабка першы раз мяне ўбачыла, то адразу ж зрабіла выснову: "паэтам будзе, от пабачыце...", чым вельмі насмяшыла родных. Ці не першая спроба пяра – верш з нагоды смерці Уладзіміра Калесніка, студэнткай якога была мая мама. Школу скончыў са срэбраным медалём, паступіў у лінгвістычны універсітэт, падчас акадэмічнага адпачынку працаваў на будоўлі, грузчыкам у краме. Цяпер — студэнт пятага курса БДПУ імя М. Танка... Пішу на патрэбу душы.

Аўтар

* * *

Пакуль не трыццаць тры,
Пакуль што не распяты.
І хочацца кахаць,
І хочацца пажыць.
Далёкае святло
Акна бацькоўскай хаты
Над галавой маёй
Маладзіком дрыжыць.
Нясу грахі свае,
Нясу грахі чужыя...
А з глыбіні вякоў,
Ля Лысае гары,
Узняўшы галаву,
На поўню
З крыжа вые
Мой цень стары.

Мроя

Прашаптала: "Мой харошы"
Як нікому, як ніколі.
Пазбірала зоркі ў кошык
І пайшла паволі.
— Азірніся! Азірніся!
А яна ўсе вышай, вышай...
Знікла. Толькі вецер лісце
Нада мной калыша.

Атлантыда

(трыпціх)

За туманам нічога не відна...
(З народнага)

1

Там неба цвіце васілёк,
Там сонца саспелы колас,
Буслянкі адвечнае "клёк"
І нечый знаёмы голас.

Там песня, якая ў душы
Не раз адгукалася рэхам,
Там месяц святло патушыў,
Скаціўся ў кішэню арэхам.

Пад корч залягла туга
І цень абдымае за плечы,
А ў лесе стары пугач
Усё плача і плача аб нечым.

2

Там нехта знаёмы ў сне
Збялелымі вуснамі шэпча:
"...бывай, мой скрыпучы снег.
бывай, мой марозны вечар..."

Там нехта ляціць у пралёт,
Там нехта глядзіць з эшафота,
А трэці злева прылёг
На скрыжаванні дарог
І не відно ўжо, хто там.

І колькі такіх, як ён!..
Ад іх уся горыч палыну.
Над хатай схіліўся клён,
У хаце той плачуць па сыну.

3

Там, куды я іду,
Неба блізкае-блізкае —
Месяц упаў у ваду,
Некаму стане калыскаю
Там, куды я іду.

Там, куды я іду,
У жыта вясёлкі ўплецены
І васількі ў лебяду.
Шэпча таемнае вецер
Там, куды я іду.

Там, куды я іду,
Сонца цвіце гарлачыкам,
Пчолы-аблокі гудуць.
І перапёлка не плача
Там, куды я іду...

Надзея СТАХОВІЧ

Надзея Стаховіч жыве і працуе ў Оршы, яна — аўтар трох паэтычных зборнікаў. У мінулым месяцы паэтэса адзначыла свой 50-гадовы юбілей. Рэдакцыя "ЛіМа" шчыра віншуе яе са знамянальнай датай, жадае поспехаў і новых здзяйсненняў.

* * *

На ўсю акругу —
скруха-скруха,
Вакол ні звера, ні душы.
Ды плачуць ноччу завірухі,
І совы стогнуць у глушы.

Хацін забытых не палічыш.
Двары дзічэюць і сады.
Сяло —
стагоддзяў папялішча —
Губляе прадзедаў сляды.

І вокан чорныя вачніцы
Крычаць пра скон і хат і сёл.
З вадой празрыстую крыніцу
Дзень пераступіць, нібы вол.

За мною рыпнуць
рэзка дзверы.
І за паўкрока ад бяды
Скажу сялу,
што шчыра веру:
Тут будуць новыя сады!

* * *

Вецер, мокрадзь, мінус восем,
На нішто сыходзіць восень.
Цёмна ў небе,
ззяюць лужы
Серабром ад першай сцюжы.
Ў хаце холад ходзіць доўга,
Каля ног цярэцца догам.
Свеціць мне сярпасты месяц.
За акном кастрычнік месяц.

* * *

Ты чадзіў-жыў
Без барацьбы,
Агонь мой
Спёкі-варажбы
Цябе крануўся
Незнарок, —
Ты ў ім згарэў,
Як матылёк.

* * *

Даруй мне, Божа, грэх і страх!
Пакінула я зорны шлях,
І збілася ўначы з дарогі, —
У пісягах душа і ногі.
Перад табою, Божа, каюся,
Іду і зноўку спатыкаюся.
А голас мне праз звона медзь:
"Табе на споведзь бы паспець!"

Пераклад з рускай мовы
Васіля МАКАРЭВІЧА

Фота Кастуся Дробава

Міхаліна

Юлія ЗАРЭЦКАЯ

Апавяданне

З цыкла "Дунілавіцкія былі"*

— Слухай, Сцёпка, а ці памятаеш ты тую жанчыну?

Мужчыны, расчырванелыя і вясёлыя, сядзелі за сталом. Пасля лазні, дзе яны ўдосталь нахваставаліся венікамі з дубу, бярозы ды нейкіх зёлак (венікі, паводле сваёй навукі, вязаў заўсёды сам гаспадар) і дзе чорныя камяні з печкі аддалі даастатку свой жар, гаспадар запрасіў іх да сябе. Мужчыны нетаропка кульнулі чарку-другую самагонкі, закусілі стравамі, што прыгатавала рухавая Лёдзя, Сцяпанава жонка, і вось тады Болюсь, невысокі, жвавы, хоць і сівы ўжо чалавек, раптам вытыркнуўся са сваім гэтым "а ці памятаеш?".

Вацак з Лявонам недаўменна пераглянуліся, а спакойны, разважлівы Антось, пачуўшы, як Лёдзя знарок гучна бразнула даёнкай за сцяной, у сенцах, прабасіў:

— А і праўда, Болюсь, смачная каўбаса. Добрая ў Сцяпана гаспадыня!

— Ну дык, налівай! — знайшоўся Вацак і па-змоўніцку падмігнуў гаспадару. — За тваю маладзіцу!

Не паспеў Сцяпан узяць у руку бутэльку, як Лёдзя зноў моцна ляпнула. Гэтым разам — дзвярыма.

Сцяпан уздыхнуў. Лявон хмыкнуў:

— Раўнуе, ці што? Памяраць пара, а ў іх — любоў!

Болюсь ледзь не падскочыў на месцы. Перадражніў:

— Любо-о-оў!.. Многа ты разумееш. У яго вунь цэлая камедзь з любоўю была, — і крутнуўся да Сцяпана: — Ну, раскажы ўжо мужыкам пра кабету тую. Столькі гадоў мінула.

Сцяпан ускіпеў:

— Адчапіся ты ад мяне! Пра сваіх жанчын расказвай!

— Хэ! — хмыкнуў Болюсь. — Каб была такая — даўно б расказаў. — І, паправіўшы на носе акуляры, дадаў: — А гэты маўчыць, як партызан.

— Ты маё партызанскае мінулае не чапай! — не на жарты ўскіпеў Сцяпан.

— А што яго чапаць, калі і ты, і я пузам па балотах поўзалі ды па лесе немцаў нішчылі, — паблажліва прамовіў Болюсь. — Думаеш, я пра вайну забыўся?

— Хлопцы, давайце вып'ем! — махнуў рукою Вацак і наліў у чаркі. — А ну яе!..

І нельга было зразумець, каго ён меў на ўвазе — вайну ці жанчыну...

— Ну, дык дзякуй гаспадару за лазню, за моцны пар, — заварушыўся за сталом Антось. — Пойдзем мы ўжо дахаты. — Вылазь, Болюсь! — злёгку таўхануў ён суседа пад бок.

Той крэкнуў і неахвотна ўстаў.

— Ну было, малады быў, дурны, — ціха прабубніў Сцяпан і, адчайна махнуўшы рукой, рашыў: — Добра! Слухайце, — трохі памаўчаў. — Ну, партызаніў я, самі ведаеце. 16 гадкоў было, як вайна пачалася. Дабілі мы немцаў праклятых, скончылася вайна. Хто куды падаўся, а мне — хоць плач. Вёску маю фашысты спалілі. Разам з людзьмі. Загінулі маці з брацікам, а пахаронка на бацьку яшчэ ў сорак першым прыйшла. Сваякоў ніякіх...

Быў у нас у атрадзе адзін балака такі, Нікадзімам звалі. Дык ён мне і кажа: "Куды ты пойдзеш па свеце бадзяцца? Паехалі са мной. Неяк жыццё наладзіцца". А што, думаю, і праўда, чаго мне бадзяцца? Нікадзім — чалавек вопытны, сямейны, не прападу з ім. Ну, і рушылі мы да яго на радзіму.

Вёска ягоная вялікай аказалася — двароў з паўтары сотні. Месца прыгожае: узгоркі невялікія, сасоннічак, рэчка праз вёску цячэ, возера... Сям'я ў Нікадзіма была: жонка Рэня, дзеткі — Валік з Віцькам. Узрадаваліся страшэнна, што жывы і здаровы гаспадар дахаты вярнуўся... Словам, сталі мы жыць. Усё чыста я па гаспадарцы памагаў: і араць, і касіць — з вёскі ж. Месяц мінуўся, другі... Ды бачу я, што замінаю ім. Не, ніхто мне слова не сказаў. Ды ці я сляпы? Хатка — ведама, не палац — невялічкая, з гаспадаркі — куры ды каза. Ды і так, заснуць хлапчукі, захоча Нікадзім жонку прыгалубіць, а тут — я... — Уздыхнуў Сцяпан. — Што казаць?..

Дык адным разам мне сябар мой і кажа: "Сцёпка, братка, я цябе аднаго ў бядзе не кінуў, узяў з сабою. Харошы ты хлопец, гаспадар з цябе будзе добры, дык вось я і падумаў. Ты толькі не кіпі. Паслухай. Ёсць у нас у вёсцы, бачыў, відаць, старая дзеўка — Міхаліна. Кабета заможная: і хата ў яе вялікая, і гаспадарка — не раўня нашай, і грошы маюцца. Ад бацькоў багацце дасталося. А што, калі прысватаем мы цябе да яе, га?.. Работы ты не баішся. А баба яна ладная, хоць і пярэстарка. Га, Сцёпка!.. Ды толькі не падумай, што я цябе з хаты выганяю. Гэта я табе так, да слова кажу..."

— І што ты?

— А што я? Меркаваць не выпадала. Добра, кажу, пойдзем "у сваты"... Відаць, папярэдзіў Нікадзім яе, намякнуў неяк, бо як прыйшлі мы ўдвух да Міхаліны, не здзівілася, не збянтэжылася, быццам так і трэба. А мо таму, што не дзеўка ўсё-ткі была — чацвёрты дзесятак памяняла — чаго чырванець? Мы — бутэльку на стол, яна — хуценька закусь на стол. Слова за слова, карацей, дамовіліся.

Пайшоў я ў прымы. Вяскоўцы пагаварылі крыху, цёткі папляткарылі, ды і перасталі. Цікавалі, вядома, за намі спадцішка. Але што ты ўгледзіш, калі паказваць не хочуць?..

— Ну дык ты пра любоў кажы! — улез зноў Болюсь. — Як ты там спраўляўся? — і падмігнуў мужчынам.

— Што ты ўсё пра любоў ды пра любоў, — пацвеліў яго Вацак.

— А пра любоў я, мужыкі, вам адно скажу: такіх салодкіх начэй у мяне ні з адной жанчынай больш не было...

Мужчыны, як згаварыўшыся, уздыхнулі. Нават Болюсь. І рашуча пастанавіў:

— Вып'ем!

Выпілі. Закусілі. І зноў першым не вытрымаў Болюсь:

— Дык якой халеры тады табе яшчэ трэба было?!

— А такой, што мне ад яе любові чым далей, тым больш моташна рабілася! Я на поле араць — яна праз гадзіну ўжо там: паснедай, міленькі!.. Раніцою кашулю апрануў — у абед ужо здымае мыць. Толькі боты купілі — просіцца-моліцца, паехалі на кірмаш, купім табе яшчэ адны... Залюбіла яна мяне, мужыкі!..

— А што, каб не так, каб менш любіла, застаўся б? — спытаў маўчун Лявон.

— Ды, відаць, застаўся б... Дагэтуль з ёю жыў бы.

— Цьфу ты, дурыла! — ажно сплюнуў Болюсь. — Любоў яму завялікая была! Мо-о-отаршна... Баба лістом слалася, вяроўкі з яе ві, а ён — уцёк!

— Тут ты праўду кажаш — уцёк, — кіўнуў Сцяпан. — Ад фрыца так не драпаў, як ад бабы.

— Ага, тут вось цэлая камедзь! — усміхнуўся Болюсь. — Кажы-кажы.

— Дык я і кажу: не было ў мяне больш сіл з ёю жыць. А Міхаліна яшчэ іншае ўздумала. Не хачу, кажа, каб цябе прымам, прыжывалам дражнілі. Давай паедзем у раён, пісацца. Будзем жыць, як муж з жонкаю.

Што рабіць? Пабег да Нікадзіма. Расказаў усё, як ёсць. Пакумекаў ён, памеркаваў і кажа: "А што, паедзем!" Я ўзмаліўся: "Пашкадуй ты мяне!" А ён, гіцаль, зубы скаліць: не палохайся, зробім як мае быць. Толькі спачатку я адзін у раён з'езджу, а пасля — ты з Міхалінай. І праўда, неўзабаве прыходзіць да нас і кажа: "Хопіць вам туляцца! Заўтра ж з раніцы едзьце ў раён, распісвайцеся і жывіце, як людзі".

Міхалінка мая аж расцвіла, узрадавалася, збірацца ўзялася. А на раніцу, яшчэ цёмна было (не цярпелася ёй) запрог я каня, і пакіраваліся мы ў раён.

Прыехалі ў цэнтр. Знайшлі будынак, як Нікадзім казаў: вялікі, з чырвонай цэглы і прыступак шмат. Зайшлі туды. Сядзіць службовы чалавек у акулярах, піша нешта. Зірнуў нарэшце на нас:

— Вы да мяне, таварышы?

— Кажуць, у вас тут запісацца можна? — кінулася да яго Міхаліна. — Ну, каб як муж і жонка жыць.

— З ім? — кіўнуў ён на мяне. — А не малады?

— Малады, — зачырванелася Міхаліна, — калі ўжо так казаць. А я — маладая. Хоць і не вяселле ў нас.

Хмыкнуў той чалавек, крутнуў галавою і кажа:

— Ну добра, маладыя, распішу вас.

Спытаў, як мяне завуць, як яе, адкуль мы, калі нарадзіліся. Запісаў усё ў нейкую вялікую кніжку, што на стале ляжала, і руку мне паціснуў:

— Віншую вас, Сцяпан і Міхаліна! Едзьце дахаты. Жывіце цяпер па законе.

І, пакуль Міхаліна слёзы выцірала, чамусьці мне падмігнуў...

Сцяпан зірнуў на Болюся. Той толькі плячамі перацягнуў.

— І што далей?

— А тое, што далей — болей. Міхалінка ад шчасця не ведае, што рабіць, а я — куды дзецца. Пайшоў зноў да Нікадзіма. Кажу: "Я ў цябе помачы папрасіў. Паслухаў, зрабіў, як ты сказаў. А цяпер што? Яшчэ горш". "Не горш, — адказвае ён, — а лепш. Ці ведаеш ты, дзе вы распісваліся?" "Чаму не, — паціскаю я плячамі ды ні пра што не здагадваюся, — у цагляным доме на плошчы". "А ці ведаеш, што гэта за дом? — скаліць ён зубы. — То ж нарыхтоўчая кантора! Сябар мой там працуе, дык я яго і папрасіў запісаць вас. У кніжку, дзе прыём тавару запісваюць!.."

Тут я і не ведаю, што рабіць — ці смяяцца, ці плакаць? І рады, што жаніцьба гэтая — мана, і Міхаліну шкада.

Замаўчаў Сцяпан.

— Ну, а далей вы ведаеце: збег я ад яе. Сюды трапіў. Ажаніўся з Лёдзяю. Дзяцей выгадавалі. Унукаў прычакалі...

— А тая, Міхаліна, што? Няўжо не шукала цябе?

— Ведама, шукала! — працяжна прамовіў Болюсь. — Ды што толку? Кінулася да Нікадзіма. "Скуль я ведаю? — кажа той. — Быў, ды сплыў..." Паляцела ў раён. А там — ні чалавека таго, ні запісу: тую старонку ён, не дурань жа, назаўтра пасля запісу і вырваў. "Кабета", кажуць ёй, — вы, відаць нешта пераблыталі. Тут вам не ЗАГС, тут — нарыхтоўчая кантора..." Яна — у слёзы, ды хіба слязьмі дапаможаш?..

— Слухай, Болюсь, а ты адкуль пра таго чалавека так ведаеш? — ускінуў бровы Вацак. — І што не працаваў ён ужо, і як запіс зніштожыў?

Уздыхнуў Болюсь ды мусіў прызнацца:

— Дык гэта ж я быў. Я запісваў. Нікадзім-балагур — мой сябар, вось і папрасіў мяне... Эх, наліваі, хлопцы! Кульнём за нашы маладыя гады!..

Калі прыкусілі, Лявон спытаў, асцярожненька так:

— Сцёпка, а ты пра Міхаліну ніколі больш нічога не чуў?

— Чаму ж, чуў, — адказаў Сцяпан. — Нікадзім расказваў. Пагаравала яна, паплакала... А потым замуж выйшла. Па-сапраўднаму. І дзіця шчэ паспела нарадзіць, дзяўчынку. А вось бачыць яе больш ніколі не давялося...

Зноў грукнулі дзверы: у сенцах знарок гучна гаспадарыла Лёдзя.

— А яна ведае? — чамусьці шэптам спытаўся Вацак і кіўнуў на дзверы.

— Не, — крутнуў галавою гаспадар. — Калі толькі нешта здагадваецца.

Гэтым разам у сенцах нешта так гучна ляснула, што мужчыны, як па камандзе, падскочылі і, нават не выпіўшы "аглаблёвай", даліся ў дзверы.

— Дабранач, Лёдзечка! — пачуў Сцяпан у сенцах салодкі Болюсеў галасок і нібы ўбачыў, як той, старая ліса, злёгку кланяецца кабеце. — Дзякуй за вячэру.

Што адказала яму жонка, Сцяпан не чуў, бо пасунуўся ў іншы пакой. Там ён (хоць даўно ўжо кінуў курыць) скруціў цыгарку з тытуню, што, уцякаючы, забыўся Болюсь, і моўчкі запыхкаў.

Вечарэла...

---

* Дунілавічы — вёска ў Пастаўскім раёне, радзіма аўтара.

Закулдычкі

Аляксандр ВАШЧАНКА

Жыў некалі ў суседняй вёсцы дзядзька Віталь. Яшчэ маладым хлопцам ён трапіў у няволю "за каласкі". Памяць у яго была выдатная, і за доўгія гады жыцця вязня ён вывучыў процьму ўзораў "блатнога фальклору". Пасля хрэстаматыйных вершаў школьнай праграмы гэта было падарожжам у забаронены пакой Сіняй Барады. З тае пары ў мяне пачаўся этап збіральніцтва. На зэканомленыя грошы я купляў бутэльку "чарніла" і шпацыраваў да дзядзькі Віталя. Ён выпіваў шклянку віна, закурваў велізарную самакрутку, закідваў нагу на нагу, хітра прымружваў вочы і пачынаў... У асабліва "забойных" месцах ён падымаў вочы і патрабавальна глядзеў на мяне, патрабуючы "зацаніць" гэтую перліну красамоўя. Я ўздымаў вочы ўгору, выстаўляў вялікі палец і прыцмокваў, выказваючы найвышэйшую ступень захаплення. Задаволены, дзядзька Віталь працягваў. Так я спісаў два агульныя сшыткі. Але маці, настаўніца рускай мовы і літаратуры, якая амаль кожны вечар чытала мне вершы Пушкіна і Някрасава, аднойчы знайшла мае "скарбы" і, прачытаўшы ўсяго адну страфу, спаліла сшыткі ў печы. Цэнзура — яна і ў роднай хаце цэнзура...

Але гэта прэамбула. Дзядзьку Віталю падабалася злавіць якога-небудзь хлопчыка і, заціснуўшы між пальцаў пасму валасоў, крутануць некалькі разоў. Гэта ў яго называлася "зрабіць закулдычку" (у гэтым дзействе мне бачыцца агульнае з тым, калі знахары рабілі "залом" у жыце). Хлопчык чухаў патыліцу і, адбегшыся, лаяўся на свайго крыўдзіцеля. Больш уражлівыя і маленькія плакалі. Задаволены Віталь смяяўся тоненькім залівістым смехам, які так не пасаваў да яго каржакаватай постаці. Усё-такі турэмнае выхаванне выдавала сябе... Цяпер гэтыя "закулдычкі" ўспамінаюцца са смехам, бо ў краіне дзяцінства няма фізічнага болю...

Свае абразкі мне захацелася назваць "закулдычкамі", бо ў іх і ўспаміны, і смех, і цэрпкая горыч ягад чаромхі, якімі мы так любілі ласавацца ў дзяцінстве...

* * *

Тым летам мне вельмі карцела сфатаграфаваць вясёлку. І вось аднойчы ліпеньскім ранкам я выйшаў на вуліцу і... збянтэжыўся: палову неба расквечваў сяміколеравы цуд (як заўважыў адзін песіміст: "На гэта ў іх грошай хапае!"). Я схапіў свой "Canon", навёў яго на доўгачаканае дзіва, але мне не спадабалася, што будынак загароджваў частку кадра. Я пабег, каб абмінуць хату. Тады дрэвы пачалі закрываць палову кадра. Карацей, пакуль я дабег да чыстага месца, вясёлка знікла. Засмучаны, нетаропка вяртаўся пад цёплым грыбным дожджыкам дамоў і думаў: "Так заўсёды ў жыцці: трапляецца, нарэшце, сапраўднае шчасце. Вось яно, бяры! А мы працягваем шукаць нешта лепшае...

* * *

Пасля некалькіх спякотных дзён пайшоў доўгачаканы дождж. Я схаваўся ў прылазніку і з задавальненнем назіраў, як лісты яблынь і груш пад струменямі вады змывалі надакучлівы шэры пыл. Са здзіўленнем убачыў, што ластаўкі, насуперак народнай прыкмеце, не лёталі каля зямлі, збіраючы машкару, а луналі высока ў небе. Яны то "віселі" ў паветры, то чорнымі маланкамі пранізвалі аблокі. Здагадваўся: гэта ж птушкі прымаюць нябесны душ! Як усё жывое радуецца вадзе!..

* * *

Бабуля Зося любіць прыдумваць новыя словы. Аднойчы зайшоў да яе прыгожа апранутым і пры галыштуку. Акінуўшы мяне ўважлівым позіркам і прыцмокнуўшы, яна выдала: "Ну, ты хлопец фінцікляпісты!" Коратка і трапна!

* * *

Апошнім часам, калі "мабільнікі" ёсць амаль у кожнага, міжволі даводзіцца чуць тэлефонныя размовы ў грамадскім транспарце. Цікава, што большасць з іх заканчваецца аднолькава : "Ну, давай!" Не "Бывай!", як гэта было раней, а менавіта: "Давай!" Задумаўся: адкуль гэта ў нас? Пэўна, такі зварот прыйшоў ад гандляроў з паўднёвых краін, якія даўно валадараць на нашых рынках, і мы, славяне, якія заўсёды дзяліліся апошнім, цяпер патрабуем: "Давай!"

* * *

У лютым недзе падчапіў вірус грыпу. Пяць дзён тэмпература была пад 39. Цяжка валяцца ў ложку, адчуваючы сваю бездапаможнасць перад нябачным ворагам. Старэнькая матуля, даведаўшыся пра маю хваробу, заплакала, прыгаворваючы: "Ой, што ж гэта робіцца на белым свеце, калі ўжо нават ты, малады, хварэеш!.." Я, якому ўжо не так доўга да пенсіі, адразу неяк узбадзёрыўся і пайшоў на папраўку. Покуль жывуць нашы матулі, мы будзем заставацца маладымі...

Арт-пацеркі

Шэраг мемарыяльных выставак, а таксама выпуск у 2007 годзе выдавецтвам "Кнігазбор" альбома-каталога "Аляксандр Ісачоў" прымеркаваныя да дваццатых угодкаў з дня смерці мастака, чыё імя набыло вядомасць пры канцы 1980-х. Як ужо неаднойчы паведамлялася, творчасць А.Ісачова не атрымала шырокага прызнання ў Беларусі. Найбольш поўная калекцыя работ гэтага жывапісца знаходзіцца на яго роднай Гомельшчыне — у Рэчыцкім краязнаўчым музеі. Чарговая экспазіцыя

твораў Аляксандра Ісачова пры ўдзеле прадаўжальніка яго традыцыі, мастака з багатым рэстаўрацыйным досведам, Алега Арлова сталася супольным праектам Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі ды культурна-дабрачыннага фонду "Адраджэнне". Выстаўка прабудзе ў Мінску да 29 чэрвеня.

Пра новую работу Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" — лірычную камедыю "На спіне ў чорнага ката" мы распавялі ў "ЛіМе" за 9 мая. Амаль праз месяц, 6 чэрвеня, адбылася прэм'ера новай стужкі. Яе невыпадкова наладзілі ў аграгарадку Ляскавічы, што ў Петрыкаўскім раёне, бо, як ужо ведаюць чытачы "ЛіМа", у тым прыгожым кутку Палесся, і нават з удзелам мясцовых жыхароў, праходзілі здымкі вясковых эпізодаў фільма. Нагадаем, што зняў яго рэжысёр Іван Паўлаў, а галоўныя ролі сыгралі заслужаны артыст Расіі Міхаіл Жыгалаў ды народны артыст Расіі Валерый Прохараў (для яго роля ў стужцы "На спіне ў чорнага ката", на жаль, стала апошняй у жыцці). Днямі прайшла прэм'ера ў Мінску, і неўзабаве па ўсёй краіне разгорнецца пракат навінкі, якая, між іншым, паспела ўжо атрымаць дзве ўзнагароды. На XI Міжнародным кінафестывалі "Золотой Бриг" (прайшоў у маі ва Украіне) беларуская стужка ганараваная дыпломам "За захаванне нацыянальных традыцый у кіно", а работа нашага вядомага кампазітара Уладзіміра Кандрусевіча адзначаная спецыяльным прызам — за лепшую музыку да фільма.

І ў самабытным беларускім народным мастацтве ёсць свая экзотыка. У гэтым пераконваюцца наведнікі выставачнай галерэі Беларускага дзяржаўнага універсітэта фізічнай культуры, дзе да 20 чэрвеня экспануюцца творы унікальнага разьбяра Івана Будзіча. А экзотыку знаўцы народнай творчасці бачаць у тым, што ўсе аб'ёмныя элементы сваіх твораў гэты мастак выразае з адзінага, цэласнага кавалка драўніны, ствараючы складаны разнапланавы сюжэтны барэльеф. Іван Будзіч лічыцца адзіным у Беларусі майстрам, які працуе ў такой тэхніцы. Многія работы самабытнага мастака, у якіх арганічна спалучаюцца жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладная творчасць, упрыгожваюць прыватныя калекцыі ў Германіі, Даніі, Расіі.

С. ВЕТКА

Фота Кастуся Дробава

Пра бясслоўныя спектаклі

Свет перанаселены словамі да такой ступені, што патрабуе ад нас ужо не кароткасці паводле Ежы Леца, а бясслоўя. Тэатральнае мастацтва пакуль што вынайшла толькі адзін сродак ратавання — пластычны спектакль. І на вечары сучаснага пластычнага спектакля ў Тэатры-студыі імя Еўсцігнея Міровіча (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) усё было зразумела без слоў.

Пластычныя пастаноўкі сёння вельмі папулярныя. Прынамсі, спектакаль Яўгена Карняга "Не танцы" ў рэпертуары таго ж Тэатра-студыі імя Е. Міровіча ўжо год, але ажыятаж не змяншаецца і пра квіткі гледачам даводзіцца клапаціцца загадзя. Ды і новы спектакль Яўгена Карняга "Бесконечно..." таксама сабраў поўную залу. Але на вечары, пра які тут гаворка, былі прадстаўлены іншыя пастаноўкі. І невыпадкова я спаслалася на афарызм польскага аўтара. Мінскія гледачы мелі магчымасць пазнаёміцца з дзвюма пастаноўкамі польскіх тэатраў — "Песня-паэма для суставаў і звязак " (Тэатр сучаснага танца "Арка", г. Вроцлаў) і "48/4" (Люблінскі тэатр танца).

Іх лепш назваць нават не пластычнымі, а танцавальнымі спектаклямі. Гэты новы напрамак з'явіўся ў тэатральным мастацтве Польшчы не так даўно — гадоў 15 — 20 таму, але паспеў ужо заваяваць папулярнасць і знайсці свойго гледача. Яго адметнасць — сінтэз танца і драматургіі. Азначэнне "танцавальны спектакль" падаецца вельмі трапным. Бо неяк язык не паварочваецца назваць проста танцам 40-хвілінную пастаноўку з моцным драматургічным падмуркам ці вызначыць як спектакль дзеянне без слоў, звышзадачай якога часта з'яўляецца проста рух.

«48/4» з Любліна

На сцэне чатыры чалавекі (гэта ўся трупа тэатра, уключаючы рэжысёра Рычарда Каліноўскага). Дзве жанчыны, двое мужчын. Мінімальны грым, зусім простыя касцюмы — калі апрануць на босыя ногі персанажаў чаравікі, яны нічым не будуць адрозніваца ад гледачоў, якія прыйшлі на спектакль. З дэкарацый — толькі белая канапа пасярод сцэны. Але гэты сцэнаграфічны аскетызм знікае, як толькі акцёры пачынаюць рухацца. Рух займае ўсю прастору сцэны, рух — гэта і касцюм, і грым.

Ад самага пачатку дзве пары завалодваюць увагай гледача і не даюць ёй аслабнуць да канца спектакля. Ты сядзіш у сваім крэсле і напружана сочыш: ці будзе мець нейкі працяг акцёрскі жэст, скіраваны да партнёра. І ўрэшце робіцца зразумела: не будзе. Увесь час ты ў напружаным чаканні, вынік якога заўсёды адваротны прыдуманаму табой: вось ты чакаеш, што гераіня павернецца да героя тварам, а яна паварочваецца спінай; табе здаецца, што зараз герой павінен спыніцца і паглядзець у вочы партнёру, а ён наадварот — сыходзіць; ты думаеш, што мужчына пацалуе жанчыну, але яна раптам апускаецца долу і мужчына цалуе паветра. І дзіву даешся: якое ж яно адладжанае, гэта бязладдзе на сцэне!

Ты ўсё перажываеш разам з акцёрамі — дыхаць, існаваць пачынаеш у такім рытме, які табе дыктуюць са сцэны рух, музыка, святло. Тры кіты, на якіх і трымаецца ўсё ў гэтай пастаноўцы. І ніводнага, ніводнага слова.

Пластычны спектакль — гэта абстракцыя. Мастацтвазнаўцы кажуць, што глядач здольны ўспрымаць абстракцыю на трох узроўнях: мікракасмічным, макракасмічным і сусветным. "48/4" — абстракцыя рухаў, якая паказвае нашы макракасмічныя праблемы: адзінота, агрэсія, барацьба за месца пад сонцам, барацьба за асабістую прастору і пакута ад гэтай прасторы, барацьба за зносіны і пакута ад гэтых зносін.

«Песня-паэма для суставаў і звязак»

Так было напісана ў афішы. У каментарыі перад спектаклем прагучаў іншы пераклад: "Песня-паэма для суставаў і гартані". Канечне, менш паэтычна, але больш дакладна перадае сэнс пастаноўкі.

"Песня-паэма..." нагадала мне сваёй эстэтыкай футурыстычную плынь. Не, ніхто не патрабаваў скінуць Пушкіна з парахода сучаснасці і не чапляў радыс да лацканаў. Проста адчувалася, што для гэтых траіх мужчын у шэрых гарнітурах-тройках мінулае зрабілася цесным і яны імкнуцца ў будучыню, у якой існуе толькі адна рэч: рух. Я сцвердзілася ў сваіх думках і ўражаннях, калі пасля спектакля аўтар ідэі, рэжысёр і акцёр Яцэк Гейнбура зазначыў, што гукі ў спектаклі — з'ява другасная, галоўнае рух, у тым ліку і нябачны, але наяўны, — рух галасавых звязак.

Пастаноўка як бы падзеленая на тры часткі, і у кожнай ідуць пошукі гарманічнага суіснавання гуку і руху. Першая пачынаецца з гіпербалічнага несупадзення росту герояў і мікрафонных стоек і праходзіць амаль моўчкі: толькі дзеянне. Другая — існаванне разам гукаў і рухаў: шчоўканне суставамі ля мікрафона, спевы, магічны танец спіны ў бронзавым святле, проста танец. Кожны рух адбіваецца гукам. Трэцяя — гук, які ствараецца рознымі дзіцячымі цацкамі, і мінімалістычныя рухі аднаго героя для таго, каб мы змаглі пачуць яго. Адзіная форма існавання для акцёра — рух. Як эстэтыка будучыні.

І ведаеце, мне здаецца, што гэтыя футурысты з Вроцлаўскага тэатра танца "Арка" маюць рацыю. У пластычнага спектакля вялікая будучыня. Ён не хутка страціць сваю папулярнасць, бо свет сапраўды перанаселены словамі, часта спалучэнні гукаў нічога не вартыя, і мы шукаем іншых шляхоў зносін, якія не страцілі яшчэ свой сэнс. Да таго ж танцавальны пластычны спектакль задавальняе патрэбу сучаснага творцы і гледача ў сінтэзе мастацтваў, у пошуках новых форм. (Новыя формы, звязаныя з пластыкай і танцам, пачынае асвойваць і польскае кіно).

♦

Пластычны спектакль здаецца адным са спосабаў дасягнення адкрытасці тэатральнага працэсу. І не столькі для тэатразнаўцаў ды крытыкаў, колькі для простых аматараў, для пераважнай большасці як іх моўны бар'ер у тэатры застаецца праблемай. З выдатнага шведскага монаспектакля "Імгненні рэальнасці" на мінулым Міжнародным фестывалі тэатральнага мастацтва "Панарама", нягледзячы нават на сінхронны пераклад, сышло паўзалы. Я не адмаўляю таго, што з пластычнага спектакля глядач таксама можа сысці, але ж гэта здарыцца зусім па іншых прычынах. Рух не вымагае перакладу. Пластычны спектакль у нейкім сэнсе — сродак тэатральнай глабалізацыі. І хутка мы ўжо, мажліва, прычакаем бясслоўнай рухавай будучыні.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Сталічныя прэм'еры



Ведаеце, што кажуць пра спектакль, які нядаўна папоўніў рэпертуар тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм"? Яго называюць "вельмі чэхаўскай гісторыяй пра прыгожых самотных людзей". Хтосьці нават пазнае ў гэтых людзях сябе. Пакручастая і няроўная жыццёвая дарога, суровыя акалічнасці лёсу не здатныя зламаць сапраўднага чалавека, у якім ёсць духоўны стрыжань, унутраная радасць і прага жыцця, дабрыня і талент любові. Прэм'ера "Механічны чалавек" пастаўлена паводле п'есы Міхаіла Варфаламеева. Гэта новая рэжысёрская работа народнага артыста Беларусі Уладзіміра Гасцюхіна і, дарэчы, ужо другі яго зварот да драматургіі М. Варфаламеева на сцэне тэатра-студыі кінаакцёра. Без малога паўтара дзесятка гадоў тут з поспехам ідзе і спектакль "Міленькі ты мой..." паводле таго ж аўтара, які У. Гасцюхін паставіў разам з мастацкім кіраўніком тэатра А. Яфрэмавым. Над "Механічным чалавекам" працавалі таксама сцэнограф Андрэй Меранкоў, мастак па касцюмах Юлія Бабаева, кампазітар Алег Елісеенкаў. У ролях можна пабачыць Уладзіміра Мішчанчука, Алену Адзінцову, Алу Проліч, Юлію Палубінскую, Анатоля Цярпіцкага ды іншых вядучых акцёраў тэатра.

♦

Зноў на музычнай сцэне — "Маленькі прынц". Чвэрць стагоддзя таму вядомы сюжэт французскага пісьменніка Антуана дэ Сент-Экзюперы натхніў класіка беларускай музыкі Яўгена Глебава на

стварэнне аднайменнага балета. А вось кампазітар Андрэй Мдзівані разам з аўтарам лібрэта Вадзімам Яканюком перачытаў і пераставіў улюбёную кніжку многіх дзяцей і дарослых у жанры оперы-прыпавесці. Прэм'ера, ажыццёўленая вядомым музычным калектывам — капэлай "Санорус" пад мастацкім кіраўніцтвам дырыжора Аляксея Шута (рэжысёр пастаноўкі Ягор Легкін, стваральнік сцэнаграфіі і касцюмаў Андрэй Меранкоў), адбылася на сцэне сталічнага Клуба імя Ф. Дзяржынскага, выклікаўшы цікавасць як самых маленькіх гледачоў, так і іх старэйшых родзічаў. У ролі галоўнага героя выступіла салістка "Саноруса" лаўрэат міжнародных конкурсаў Таццяна Пятрова.

♦

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага паказаў прэм'еру спектакля "Ідэальны муж" паводле бліскучай аднайменнай камедыі Оскара Уайльда. Пастаноўку ажыццявіў даўні творчы партнёр горкаўцаў — заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі Аркадзь Кац і маскоўскі сцэнограф Таццяна Швец.

Класіка ніколі не страчвае сваёй актуальнасці. І сённяшні глядач, безумоўна, атрымлівае асалоду ад непаўторнай дасціпнасці ды тонкасці уайльдаўскіх дыялогаў.

Гэтыя дыялогі, вострыя рэплікі, каламбуры, дынамічнасць сцэнічных падзей надаюць захапляльную непаўторнасць гісторыі пра ідэальную сям'ю, бездакорнай рэпутацыі, устойлівай рэспектабельнасці ды суладдзю якой пагражае... выкрыццё таямніцы. Тую таямніцу ведае і прагне паведаміць ўвішная авантурыстка. Аднак сямейную ідылію ўдаецца ўратаваць ад, здавалася б, немінучага разбурэння... Сярод акцёраў, якія іграюць у спектаклі "Ідэальны муж", — такія майстры, як Аляксандр Ткачонак, Бэла Масумян, Ганна Маланкіна, Аксана Лясная, Аляксей Шадзько.

Я. КАРЛІМА

Фота Аляксандра Дзмітрыева і Кастуся Дробава

Беражэ і яднае...

Як ужо вядома чытачам "ЛіМа", сёлета Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня" пройдзе ў гарадскім пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці пяты раз. Заснавальнікі — Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Беларусі, Гомельскі абласны выканаўчы камітэт, Акцябрскі райвыканкам і грамадскае аб'яднанне "Беларускі фонд культуры". Фестываль пройдзе пад эгідай ЮНЕСКА.

Каля сямісот аматараў фальклору з усіх абласцей Беларусі, а таксама госці з Польшчы, Прыбалтыкі, Малдовы, Украіны і Расіі з'едуцца на свята, каб паказаць сваё майстэрства, прадэманстраваць багацце фарбаў і вопыт народнага мастацтва. Будзе нямала прыемных сюрпрызаў для тых, хто займаецца вывучэннем і пераемнасцю культуры краю.

"Берагіня" — хай вечна гучыць гэта слова,
Беражэ, навучае і яднае ўсіх,
"Берагіня" — як жа гэта цудоўна:
Бачыць росквіт мастацтва ў дзецях тваіх.

На чатыры дні, з 19 па 22 чэрвеня, гарадскі пасёлак Акцябрскі стане сцэнічнай пляцоўкай фестывалю. Асноўныя яго ўдзельнікі — дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы. Праграма будзе насычанай і цікавай: фестываль ахапіў асноўныя і найбольш грунтоўныя жанры народнай культуры. Да ўвагі гледачоў — конкурсы выканаўцаў побытавых танцаў, калектыўнай танцавальнай творчасці, музычнага мастацтва, народнай прозы, а таксама дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва з прэзентацыяй рэгіянальных выстаў. Сваю творчасць прадэманструюць пераможцы мінулых фестывальных імпрэз, госці фестывалю, адбудуцца святы "Купалле на Рудабелцы" і народнага мастацтва Падняпроўска-Паўночнапалескага памежжа. І гэта толькі невялічкая частка праграмы сёлетняй "Берагіні".

Іта ГРЫНКЕВІЧ

Душа квартэта

Нядаўна музычная грамадскасць Беларусі павіншавала з 80-годдзем прафесара Мікалая Шчарбакова. Калісьці ён, зусім яшчэ малады ніжагародскі музыкант, паехаў следам за сваім легендарным настаўнікам — віяланчэлістам Аляксандрам Стагорскім у Беларусь. Пачаўшы працаваць асістэнтам у яго класе, стаў пераемнікам. І сёння Мікалая Шчарбакова слушна лічаць адным з пачынальнікаў сучаснай беларускай школы віяланчэльнага выканальніцтва. У памяць пра Настаўніка і з мэтай прапаганды яго дзейнасці, якая застаецца жывым унёскам у асновы айчыннай музычнай педагогікі, М. Шчарбакоў ажыццявіў выданні творчай спадчыны А. Стагорскага.

А сярод соцень сваіх вучняў, якія раз'ехаліся па ўсім свеце, Мікалай Сямёнавіч называе, напрыклад, Уладзіміра Перліна: гэта знаны віяланчэліст, педагог, маэстра, стваральнік і мастацкі кіраўнік знакамітага Струннага аркестра Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Сам жа М. Шчарбакоў увайшоў у гісторыю айчыннага выканальніцтва як ініцыятар стварэння ў студзені 1963 года Квартэта Саюза кампазітараў БССР. Калектыў музыкантаў-энтузіястаў працаваў на грамадскіх асновах, рэгулярна выступаў з канцэртамі ў Мінску, шмат гастраляваў па гарадах Савецкага Саюза. Прычым, прапагандаваў Квартэт не толькі лепшыя ўзоры сусветнай класікі, але і музыку беларускіх кампазітараў, у тым ліку найноўшую. Дзейнасць гэтых падзвіжнікаў стымулявала творчасць айчынных аўтараў у квартэтным жанры. Адмыслова для нястомнай чацвёркі, душою якой быў віяланчэліст М. Шчарбакоў, пісалі майстры розных пакаленняў: ад Мікалая Аладава да Кіма Цесакова.

Мікалая Сямёнавіча можна яшчэ назваць і стваральнікам шчаслівай музычнай сям'і. Жонка, Таіса Шчарбакова, — вядомая музыказнаўца, прафесар БДАМ; даследаваннямі ў галіне музычнай творчасці займаюцца і абедзве дачкі; музычныя прафесіі абралі ўнукі...

Лана ІВАНОВА

Гожы палёт

Звычайная дзяўчына. Прывабная, сціплая, негаваркая. У свае дзевятнаццаць гадкоў, што паспела зрабіць, — дык гэта скончыць Акцябрскую СШ № 1 ды Бабруйскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны мастацкі каледж і паступіць завочна вучыцца на юрфак у маскоўскую ВНУ. А яшчэ — папрацаваць майстрам-метадыстам у Цэнтры гісторыі і культуры Акцябрскага раёна.

Звычайная і незвычайная дзяўчына. Менавіта гэтак скажуць у райцэнтры пра Наталлю Галавачэнку. Тут яе ведаюць і як мастака. З яе творчасцю знаёмыя ў Акцябрскім ужо многія. І пасадзейнічала гэтаму выстава карцін Н. Галавачэнкі пад кідкай назвай "Дзявочых мар палёт" у Цэнтры гісторыі і культуры.

Палёт удалы. Палёт цікавы.

У раздзеле "Аплікацыя", з якім найперш знаёмішся, выстаўлены чатыры работы. Кветкі і птушкі на іх — што жывыя. Глядзіш, і нібыта водар удыхаеш. І чуеш, чуеш вясёлы напеў птушак.

У карцінах "Туманны вечар", "Летні акорд", "Зімовае покрыва" ў мастачкі сваё, толькі ёю ўбачанае. А "Родныя мясціны" і "Бярозавы гай" — нашанскія, акцябрскія краявіды. Падаецца, што завітаў у спёку сюды, каб пад шатамі дрэў адпачыць, а мо, каб грыбкоў назбіраць ды ягад пакаштаваць. І такое ўражанне, што не раз тут быў.

З цікаўнасцю разглядаеш графіку і жывапіс мастачкі.

І ўсё ж, думаецца, што карціна "Дзяўчына з пісталетам", а можна назваць і "Дзяўчына з разбітым сэрцам", паводле задумкі, фантазіі і стылю выканання — самая ўдалая творчая знаходка Наталлі Галавачэнкі.

Як кажуць, у глебу кінутыя першыя зерні. І трапілі яны ў глебу дабрадатную, падрыхтаваную нашым незабыўным земляком, знакамітым мастаком Леанідам Дробавым. То няхай добрымі будуць і парасткі, і Наталля Галавачэнка парадуе нас новымі карцінамі.

Віктар ЛОЎГАЧ,
член Гомельскага абласнога Саюза пісьменнікаў Беларусі

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь прайшла буйная персанальная выстаўка твораў Рыгора Сітніцы. "Гаспода. Суб'ектыўная рэчаіснасць" — такую незвычайную назву даў ёй мастак. Экспазіцыя прымяркоўвалася да 50-годдзя гэтага шырока-вядомага графіка, а таксама паэта, этнографа, выкладчыка Рэспубліканскага каледжа мастацтваў імя І. Ахрэмчыка, першага намесніка старшыні Беларускага саюза мастакоў і наогул — яркай, нешараговай асобы ў найноўшай беларускай культуры.

«Гаспода» Рыгора Сітніцы

Творы гэтага самабытнага майстра знаходзяцца ў фондах розных дзяржаўных мастацкіх і літаратурных музеяў нашай краіны, Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўным гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Заслаўе", у мастацкім зборы царквы св. Пятра і Паўла ў Мінску. Яны годна прадстаўляюць Беларусь за мяжой — у Музеі беларускай культуры ў Гайнаўцы і Муніцыпальным мастацкім цэнтры г. Бельска-Бяла (Польшча), галерэі Франца Салеса Грыля ў Мюнхене (Германія), мастацкіх зборах Міністэрства марскога гандлю Грэцыі і манастыра св. Георгія на грэчаскім востраве Касас, упрыгожваюць шматлікія прыватныя калекцыі...

Калі ўпершыню пабачыш графічныя аркушы-карціны Рыгора Сітніцы (а іх экспанавалася каля 60-ці ў дзвюх музейных залах), міжволі апаноўваюць супярэчлівыя пачуцці: у душы становіцца неяк і сумна, і светла адначасна, шчымліва — перад вачамі так выразна, натуральна, вялікім планам "праплываюць", як кадры ў кінахроніцы, сівыя стагоддзі, архітэктурныя шэдэўры-помнікі, лёсавызначальныя падзеі, тагачасныя рэчы матэрыяльна-культурнага побыту... Але галоўнае ўсё ж тут — самі людзі, нашы суайчыннікі, сведкі і творцы гісторыі! Як пранікнёна, з якой павагай і пяшчотай трактуецца ў творах Р. Сітніцы кожны "тутэйшы" чалавек, незалежна ад яго сацыяльнага статусу!.. Беларусы, наша родная зямля, яе мінуўшчына і сучаснасць — асноўныя тэмы творчага роздуму мастака-патрыёта.

Шматлікія графічныя цыклы найбольш поўна характарызуюць прынцыпы яго мастакоўскага мыслення і адлюстроўваюць разнастайныя індывідуальныя творчыя пошукі, адметны аўтарскі стыль. Зацікаўлена, з цеплынёй, распрацоўваюцца тэмы і вобразы нацыянальнай культуры, савецкай гісторыі ўжо ў ранніх творах Р. Сітніцы — аркушах серыі "Імгненні памяці" пра Вялікую Айчынную, у каляровых літаграфіях (з дамалёўкай) "Кліч матчынай песні. Г. І. Цітовіч, народны артыст СССР" і "Вечны вандроўнік. Мастак Язэп Драздовіч", у графічным трыпціху "Вянок пашаны паэту", прысвечаным Максіму Багдановічу, і родных краявідах. Змястоўныя творы Р. Сітніцы з'яўляліся тады амаль на ўсіх значных рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках, экспанаваліся ад Беларусі на выстаўках у іншых саюзных рэспубліках і за мяжой (польскія гарады Люблін, Гайнаўка, Асвенцім, Катавіцы, Кракаў, Лодзь; Германія, Грэцыя ды інш.).

Асаблівыя натхненне і поспех прыйшлі да пасталелага майстра ў новы для краіны суверэнны час, 1990-я — 2000-я гады. Штогод на суд гледачоў пачалі прадстаўляцца ўсё новыя мастакоўскія вынаходствы-адкрыцці Р. Сітніцы. Гэтыя чароўныя высокамастацкія рэчы вызначаныя ў крытыцы, напрыклад, як "допінг", што актывізуе цікавасць да надзённых праблем сучаснай выяўленчай культуры, і як сапраўднае мастацтва, лексіка якога не перакладаецца на строгую мову мастацтвазнаўчага аналізу. Мастаком "магічнага рэалізму" назваў Р. Сітніцу нямецкі мецэнат заходнееўрапейскага і сусветнага мастацтва Ф. Салес Грыль Аўтар жа характарызуе сваю манеру як "графічны джаз".

Сярод грунтоўных гісторыка-асацыятыўных работ, "пераходных" — ад пачатковага перыяду творчасці Р. Сітніцы да больш сталага, самастойнага, — найперш вылучаецца яго літаграфічны "раман-эпапея" — трыпціх "Нясвіж. Формула мінуўшчыны" (1991—1992; колер, дамалёўка алоўкам). У далейшым мастак назаўсёды адмаўляецца ад "вытворчага" тыражу, свае творы сёння ён малюе алоўкам і ўручную (ці, як пэндзлем, — піша), "даматкана", штучна, аддаючы гэтай нялёгкай, карпатлівай "тэхнічнай" працы не адзін месяц на пэўны аркуш. Можна толькі здагадвацца, колькі думак, парыванняў душы, розных унутраных пытанняў-адказаў прапускае праз сябе Майстар за такі працяглы тэрмін добраахвотных творчых пакут, каб потым данесці гэтае светлае Нешта іншым людзям!

Вось такімі "асветленымі", душой народжанымі ды ніяк не рафінаванымі паўсталі перад наведнікамі выстаўкі арыгінальныя цыклы графічных карцін, прысвечаныя велічы архітэктурнага (наогул — мастацкага) генія нашых продкаў. Гэта вялікі па памерах трыпціх манахромных алоўкавых кампазіцый "Замак "Мір" (1997) у арганічным сінтэзе з выкарыстаннем прыгожых версэтаў Алеся Разанава і, безумоўна, сапраўдная сучасная беларуская графічная класіка —"Касцёл у Ішкальдзі" і "Каложа" (абедзве 1995, каляровы аловак). Высокая праява таленту мастака — і аркушы каляровых графічных карцін з яго бліскучай серыі "Вільня — крывіцкая Мекка". Між іншым, як у М. Багдановіча, у Р. Сітніцы-паэта таксама ёсць "глыбінны" верш пра старадаўнюю сталіцу нашага краю. Помніцца адна прыгожая яго страфа — нібыта эпіграф-рэфрэн да гэтай графічнай серыі: "О, Вільня каханая, — страта мая паміж страт! Ты — Госпада Бога пярсцёнак у безліч карат!"...

Значны след у творчай біяграфіі Р. Сітніцы пакінулі яго вандроўкі за мяжу, у якіх, вядома ж, пашыраўся кругагляд мастака, узбагачаўся ўласны творчы, эстэтычны багаж. І усё ж самымі ўзрушальнымі для яго сталіся, думаецца, дзве паездкі ў Грэцыю — старажытную калыску еўрапейскай цывілізацыі, непасрэднае знаёмства з культурай антычнасці. Вынікам сталася ўтвораная са шматлікіх маляваных аркушаў, цудоўная "класічная" серыя пад назвай "Ратаванне Грэцыяй" (чытай: "Выратаванне Прыгажосцю"!). Пра гэта немажліва напісаць, трэба проста ўбачыць...

Створаны ў апошнія гады, разгорнуты, вялізазны этнаграфічны цыкл серый каляровых графічных выяў — "Шпацыр уздоўж паркана", "Святло адвечнае", "Новы дом", "Безназоўнае", "Суб'ектыўная рэчаіснасць" — быў прадстаўлены на выстаўцы пад агульнай ёмістай "старасвецкай" назвай "Гаспода" (1993 — 2008). Прычым, у асобнай зале нашага галоўнага "храма выяўленчай творчасці". У гісторыі сучаснага айчыннага мастацтва "Гаспода" Р. Сітніцы — унікальны ўзор, калі простая сялянская (для мастака —бацькоўская) сядзіба, якіх у Беларусі незлічонае мноства, становіцца правобразам высокага **сапраўднага** мастацтва, **"допінгам"** для разважанняў і спрэчак гледачоў, своеасаблівай мастакоўскай "Адысеяй" ды "Іліядай" у новы час, на новы лад, наогул — нацыянальным мастацкім шэдэўрам!

Мяккае і цёплае, магічнае святло роднай Бацькаўшчыны, якое адчуваецца ў кожным творы мастака, ціха ззяе, грэе душу, надае сілы.

Аляксандр РУНЕЦ

На здымках: работы Р. Сітніцы "Нясвіж. Брама ў мінуўшчыну", "Палац у Ружанах", "Святло адвечнае IV".

№ 24 13 чэрвеня 2008 г. ЛіМ

Жыццё дае натхненне

Малады беларускі празаік Уладзімір Гаўрыловіч жыве ў Жыткавічах. Рэдагуе тут мясцовую раённую газету і адначасова з'яўляецца кіраўніком Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.



— Уладзімір, як здарылася, што вы з глыбінкі кіруеце ўсёй абласной пісьменніцкай арганізацыяй? Што, у Гомелі не знайшлося падыходзячай кандыдатуры?

— Па-першае, я ў гэтым "вінаваты" менш за ўсё. На гэту грамадскую пасаду сваёй кандыдатуры не прапаноўваў. Прапанавалі іншыя. Абралі з некалькіх кандыдатур. Але я тады ж і ўмову паставіў: з Жыткавіч нікуды на жыхарства не паеду. Тут мае карані, тут мая шматлікая радня, тут мая Прыпяць, якой захапляўся яшчэ Якуб Колас, калі пісаў сваю "Дрыгву". Памятаеце: "Спакойна і павольна нясе Прыпяць сваю багатую даніну сухадоламу Дняпру..."

А па-другое, я лічу, што нічога дзіўнага ў тым, што я кірую з Жыткавіч абласной пісьменніцкай арганізацыяй, няма. Такія прэцэдэнты здараліся ў гісторыі. Па натуры я мабільны, лёгкі на пад'ём, падоўгу сядзець без справы не магу. Таму часта бываю не толькі ў Гомелі, дзе знаходзіцца офіс нашай пісьменніцкай суполкі, але і ў раёнах вобласці, дзе пражываюць члены нашага саюза і тыя, хто спрабуе свае сілы ў літаратуры. У кожным разе мая, так бы мовіць, аддаленасць ад абласнога цэнтра ніякім чынам негатыўна не ўплывае на становішча спраў у нашым літаратурным асяродку. У адваротным выпадку мяне б проста перавыбралі.

— Што сабой уяўляе Гомельскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі?

— Гэта грамадская арганізацыя, якая аб'ядноўвае ў сваіх радах больш як трыццаць сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі. І па ўзросце, і па сваім грамадскім статусе гэта ўсе людзі розныя. З рознымі характарамі, здольнасцямі, укладам, калі хочаце, у нашу беларускую літаратуру. Мяркую, што так яно і павінна быць. Дрэнна, калі ўсе аднолькавыя. Тады губляецца сам чалавек, яго асоба. А для людзей творчых гэтага дапускаць нельга. Зірніце ў лесе — адно дрэва высокае, другое ніжэйшае за яго, трэцяе зусім ледзь ад зямлі адрасло. Але ўсім ім хапае сонца і паветра, усе яны растуць у біялагічнай згодзе. Вось так і ў нашай невялікай пісьменніцкай суполцы. Магчымасцей для творчасці хапае ўсім. Нікога ніхто не заціскае. Пішы, твары, здзіўляй суайчыннікаў сваёй творчай дзейнасцю.

— І як жа карыстаюцца гэтымі магчымасцямі члены вашай арганізацыі? Памятаецца, у савецкія часы Гомельшчына была прадстаўлена многімі гучнымі імёнамі ў літаратуры: Шамякін, Мележ, Макаёнак, Грачанікаў... Ім на змену прыходзяць такія ж моцныя ў творчым плане асобы, ці літаратура здрабнела, як сцвярджаюць іншыя?

— Разумееце, каб ацаніць пісьменніка, аднаго жыцця бывае недастаткова. Нездарма кажуць: вялікае бачыцца на адлегласці. Вам не выпадала перачытваць творы пісьменнікаў, з якімі вы былі знаёмыя раней, і адкрываць іх для сябе па-новаму? Я ведаю, што такі феномен існуе. Гэта якраз тое, што датычыць ацэнкі літаратара як творцы з пазіцыі часу.

Але, зразумела ж, не заўсёды трэба чакаць, пакуль мінуць гады, каб ацаніць творчасць паэта ці празаіка. Многія з іх, як кажуць, яшчэ пры жыцці заяўляюць пра сябе. Нямала такіх і ў нашай абласной пісьменніцкай арганізацыі. Узгадаю толькі драматурга Васіля Ткачова і паэта Юрыя Фатнева. З іх творамі чытачы знаёмыя нават за межамі Беларусі. У літаратурных колах важка гучыць таксама імя гомельскай паэткі Ніны Шкляравай. Ды што там казаць, пра кожнага свайго калегу я мог бы распавядаць доўга, яны гэтага заслугоўваюць. Іншая справа, што ў такіх выпадках некага можна незнарок абысці ўвагай ці штосьці не ўлічыць, і гэта будзе яму не зусім прыемна...

— Тады давайце пагаворым асабіста пра вас. Які ваш літаратурны плён?

— У свой час пачынаў як паэт, але неўзабаве перайшоў на прозу. Так бывае з многімі маімі калегамі-пісьменнікамі, у гэтым няма нічога дзіўнага. Творчасць павінна быць шматтраннай. Таму я пішу і нарысы. Выдаў восем кніг прозы. Усе яны пабачылі свет у дзяржаўных выдавецтвах. Наколькі цікавыя, запатрабаваныя чытачом — не мне меркаваць. Для пісьменніка, як дзеці для маці, усе кніжкі вартыя. Пісаў пра калектывізацыю, пра гістарычныя зрухі, што адбываліся ў жыцці нашай краіны. Апошняя мая кніжка — раман "Цяпло маладзіка" — прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Пішу ў сваім рамане пра каханне нямецкага салдата і беларускай дзяўчыны. Такія выпадкі падчас вайны здараліся, мне расказвалі пра іх тыя, хто быў сведкам ваенных падзей.

— Пра што пісаць, пісьменніку ніхто не загадвае. Урэшце, гэта яго асабістая справа. Але чаму вы і вашы калегі ігнаруеце нашу сучаснасць? Чаму няма ў літаратуры твораў пра наша сённяшняе жыццё?

— Пра тое, што няма, я з вамі не пагаджуся. Ёсць! Але мала. Недастаткова мы пішам пра сённяшні дзень нашай рэспублікі. Абыходзім увагай нашых сучаснікаў. Ужо пятнаццаць год наша Беларусь — суверэнная дзяржава. Але моцнага, узрушальнага твора пра яе станаўленне пакуль не нарадзілася. Што тут можна сказаць? Шкада. Будзем спадзявацца, што таленты для такой высакароднай справы ўсё ж яшчэ знойдуцца.

З другога боку (гэта я ні ў якім разе не ў апраўданне сябе і сваіх калег), паглядзіце, што робіцца ў суседняй Расіі. Там з сучаснага — найперш крымінал. Чалавек працы, сумленны, сціплы грамадзянін расійскіх пісьменнікаў таксама пакуль мала цікавіць. Таму будзем з вамі чакаць лепшых часоў.

Скажыце, вы задаволены тым, як карыстаюцца роднай мовай у паўсядзённым ужытку самі беларусы? Дзвюхмоўе на дзяржаўным узроўні — гэта ідэальны варыянт?

— Ідэальнага нічога няма. Да яго трэба імкнуцца, але дасягнуць практычна немагчыма. Што ж датычыць карыстання беларускай мовай у паўсядзённым ужытку, то згодны, існуе праблема. Але ж, з іншага боку, трэба падзяляць унармаваную беларускую мову і гаворку, якую мы чуем на вуліцы. Там толькі спрабуюць размаўляць па-руску, звычайна гэта трасянка, у якой пераважаюць русізмы. Такое было і да рэвалюцыі, і ў савецкія часы. Так што не варта палохацца.

Іншая справа, што калі ты сапраўдны беларус па духу і патрыёт сваей радзімы, то можаш размаўляць, дзе палічыш гэта неабходным, па-руску, але ў абавязковым парадку павінен валодаць беларускай мовай. Інакш які ж ты беларус?

Мушу заўважыць, нічога дрэннага ў тым няма, што адны пісьменнікі пішуць свае творы па-беларуску, другія — па-русску. Па мне няхай кожны піша на якой заўгодна мове, хоць па-старажытнаславянску, абы гэта была не проста пісаніна, а годныя ва ўсіх адносінах мастацкія творы.

— Вы не толькі пісьменнік, але і журналіст. Чаму, на вашу думку, змяншаюцца наклады газет?

— Тут шмат прычын, калі разбірацца. І кожная з іх, у той ці іншай ступені, уздзейнічае на гэтую бязрадасную для нас з'яву. Сярод галоўных прычын я б назваў магутную канкурэнцыю з боку тэлебачання. Яно, дзякуючы сваёй відовішчнасці і аператыўнасці, пацясніла нават радыё, што ўжо тут казаць пра газеты.

Але газеты таксама неабходныя. Проста ім таксама трэба мяняцца. Сёння, на жаль, яшчэ не ўсе з іх *перабудаваліся*, як казаў некалі Гарбачоў. Возьмеш пачытаць — нецікава. Нібыта пра нешта гаворыцца, але ўсё другаснае, не актуальнае. Навошта такое друкаваць, калі загадзя вядома, што яно не будзе запатрабавана чытачом? У гэтым сэнсе больш прэзентабельна выглядаюць расійскія газеты.

Жыткавіцкая раённая газета "Жыццё Палесся", якую рэдагую, у пэўнай ступені запатрабавана чытацкай аўдыторыяй. Безумоўна, нявыкарыстаных рэзерваў і ў нас яшчэ хапае. Але тое, што выданне на 80 працэнтаў самаакупнае, гаворыць пра многае.

— Працягнем гаворку пра пісьменнікаў: скажыце, наколькі проста ці складана ў матэрыяльным плане сёння вашаму брату?

— Сёння цяжка многім, і пісьменнікі тут не выключэнне. Калі мы ўспомнім савецкія часы, то гэта была залатая эпоха для пісьменніка. Калі ты толькі не дысідэнт, для твайго жыцця і творчасці былі створаны амаль ідэальныя ўмовы. І вялікія тыражы, і розная матэрыяльная падтрымка — кватэры, дачы, машыны. Цяпер усё гэта сышло ў нябыт. Але пра пісьменнікаў дзяржава тым не менш не забылася. Сёння, праўда, і ў яе магчымасцей паменшала, гэта таксама трэба ўлічваць. Нашай абласной пісьменніцкай арганізацыі вялікую падтрымку аказваюць абласныя выканаўчы камітэт і Савет дэпутатаў, асабіста старшыня аблвыканкама Аляксандр Якабсон. Мы гэта цэнім і імкнёмся аддзячыць за ўвагу новымі цікавымі творамі.

— Чым сёння жыве літаратурная Гомельшчына?

— Усімі тымі клопатамі, што і яе насельніцтва. Для больш дасканалага вывучэння жыцця выязджаем у працоўныя калектывы. Наведваем школы, установы, дзе прапагандуем літаратуру, набіраемся жыццёвай мудрасці. Чарговы такі літаратурны дэсант прыбудзе хутка ў Мазыр, дзе нас ужо чакаюць. Мяркую, і гэта паездка стане падставай для напісання маімі калегамі-літаратарамі новых цікавых твораў.

Гутарыў Алег ШВЕДАЎ

Фота аўтара

Хто такая Жана Капуста? Апошнім часам гэтае пытанне ўсё часцей павісае ў паветры рэдакцыйных калідораў. Цікаўнасць заканамерная: малады крытык, аўтар шэрага цікавых і палемічных рэцэнзій на старонках "ЛіМа" здолела застацца па-за межамі публічнасці і абсалютна не засвяцілася ў літаратурнай "тусоўцы". Таму мала хто ведае, што "бязлітасныя" агляды холдынгаўскіх часопісаў — справа сціплай дзяўчыны з пяшчотным голасам і строгім позіркам. Гэтым невялікім інтэрв'ю мы імкнуліся "вывесці з ценю" таленавітага крытыка для знаёмства з чытачамі і, канечне, пісьменнікамі, якія трапілі ці яшчэ патрапяць пад яе пільны і аналітычны разгляд.

Называць рэчы сваімі імёнамі

— Для знаёмства распавядзіце, калі ласка, сцісла вашу біяграфію. Адкуль вы родам, дзе вучыліся, у якіх выданнях друкаваліся?

— Я нарадзілася ў 1983 годзе ў маленькай вёсачцы амаль на самай беларуска-літоўскай мяжы, якая і назву мае адпаведную — з балцкім адценнем — Гірэйшы. Гэта Браслаўскі раён, які наўрад ці мае патрэбу ў дадатковай рэкламе. Вучылася ў Грыгунскай базавай школе, скончыла Браслаўскую гімназію (2000 г.), філалагічны факультэт БДУ (2005 г.). Цяпер на трэцім курсе аспірантуры пры гэтым жа факультэце (кафедра беларускай літаратуры і культуры).

— Творчасць якіх аўтараў вы разглядаеце ў сваёй дысертацыі? Чым быў прадыктаваны такі выбар?

— Мая літаратуразнаўчая праца прысвечаная паэтыцы прозы "Узвышша" — творчасці К. Чорнага, К. Крапівы, Л. Калюгі, З. Бядулі, А. Мрыя. Цікавасць выклікала найперш само згуртаванне як увасабленне свабоднай творчай прасторы, узор плённага літаратурнага супрацоўніцтва. Я спрабую даць характарыстыку не асобных твораў, але пэўнай эстэтычнай сістэмы, што ў дачыненні да прозы "Узвышша" яшчэ не рабілася.

— Па вашых артыкулах, якія выходзілі ў "ЛіМе" можна меркаваць, што вы даволі смелы і строгі крытык, які заўсёды адстойвае ўласнае меркаванне. Адкуль у вашым характары такая прынцыповасць: можа быць, яна перадалася вам ад бацькоў, ці вы перанялі яе ад сваіх выкладчыкаў, аўтарытэтных для вас крытыкаў?

— Найперш хацелася б адзначыць, што я адстойваю не ўласныя эстэтычныя густы, а пэўнае бачанне літаратурных прыярытэтаў. Прынцыповасцю як рысе характару я, безумоўна, абавязана свайму бацьку Вацлаву. Ад маці Алены мне перадалося адчуванне адказнасці за кожнае вымаўленае слова. Што ж да літаратуразнаўчых аўтарытэтаў, то я павінна ў каторы раз прызнацца ў сваёй прыязнасці да Міхася Іосіфавіча Мушынскага. Ад яго я вучуся (і, мяркую, не толькі я) *канцэптуальнасці і канструктыўнасці* ў падыходах да літаратурных пытанняў.

— У "ЛіМе" ўжо выйшла даволі шмат вашых матэрыялаў, але пакуль вы застаецеся такой загадкавай асобай, пра якую кажуць толькі, што гэта "выхаванка Лады Алейнік". Лада Віктараўна сапраўды паўплывала на вас як крытыка і на ваша ўспрыманне беларускага літаратурнага працэсу?

— Лада Віктараўна была маёй выкладчыцай, чытала курс па гісторыі беларускай крытыкі і літаратуразнаўства, і сваёй дасведчанасцю ў гэтым пытанні абавязана я ёй. Менавіта яна "прывяла" мяне ў "ЛіМ", а таму можа лічыцца хутчэй маёй "хроснай маці". На маё ўспрыманне літаратурнага працэсу больш паўплываў мой навуковы кіраўнік Павел Іванавіч Навуменка, які, дарэчы, навучыў мяне аднаму правілу: нейкай справай варта займацца толькі тады, калі ты здольны гэтым займацца, здольны называць рэчы сваімі імёнамі.

— У беларускай крытыцы існуе яркае сузор'е такіх моцных і рашучых лэдзі (напрыклад, Ірына Шаўлякова, Ганна Кісліцына, Лада Алейнік). Як вы думаеце, наогул ёсць у прафесіі крытыка нейкія гендэрныя прыярытэты?

Шчыра кажучы, літаратуразнаўчай заканамернасці ў гэтым не бачу. Магчыма, справа ў тым, што жанчыны паводле свайго светаўспрымання — асобы "канкрэтныя": нам заўсёды хочацца ведаць як гэта назваць, чаго ад гэтага чакаць, і чым гэта скончыцца.

— У многіх крытыкаў ёсць своеасаблівая "льготная група" пісьменнікаў, якім па розных прычынах трэба рабіць пэўную "зніжку", улічваючы іх сталы ўзрост, слабае здароўе, цяжкі лёс, прызнаны і непахісны аўтарытэт і г. д. Акрамя таго, даволі часта рэцэнзіі пішуцца па знаёмстве, нават па асабістай просьбе аўтара. І ў гэтым выпадку паўнавартаснага аналізу з указаннем на ўсе недахопы, зразумела, не атрымліваецца. Як вы ставіцеся да гэтага? Ці існуе ў вас такі ўмоўны спіс?

— Гэта называецца карпаратыўнай этыкай, а не літаратурнай крытыкай. У мяне ніякага спісу няма, затое ёсць прынцып "харошы чалавек — гэта не прафесія", а таму ў прафесійнай сферы я і не імкнуся адпавядаць вобразу "харошага чалавека". Калі чытаю мастацкі твор, увогуле нічога не хачу ведаць пра пісьменніка: зраблю выснову пасля прачытання, і ўжо тады буду мець на ўвазе этапы творчай эвалюцыі, але не факты біяграфіі. Я цвёрда перакананая: тое незайздроснае становішча, у якім цяпер знаходзіцца беларуская літаратура, не ў апошнюю чаргу з'яўляецца вынікам татальнага няўмення пісьменнікаў прызнаваць свае творчыя няўдачы. Наяўнасць "спісаў" і адсутнасць адэкватнай ацэнкі літаратурных твораў прыводзіць да дэпрафесіяналізацыі пісьменнікай працы, а ўслед за гэтым — да дыскрэдытацыі аўтарытэту пісьменніка ў сучасным грамадстве.

— Ці паспелі ўжо сутыкнуцца з непаразуменнем, з крыўдай "раскрытыкаваных" вамі аўтараў? І якой можа быць ваша рэакцыя на такое балючае ўспрыманне крытыкі?

— Асабіста пакуль яшчэ не сутыкалася, аднак я ведаю, што ёсць і крыўды, і абурэнне. Заканамерная чалавечая рэакцыя, мяне гэта не здзіўляе і не ўражвае. Здзіўляе іншае: абыякавасць "раскрытыкаваных мной аўтараў" да той справы, якой яны займаюцца, — ва ўсіх прэтэнзіях да неаб'ектыўнага крытыка гаворка вядзецца не пра літаратуру, але толькі пра закранутыя асабістыя амбіцыі. Складаецца такое ўражанне, што пра беларускіх пісьменнікаў, як пра нябожчыкаў: альбо добра, альбо нічога. Якой бы магла быць мая рэакцыя? Ёсць такая фантазія: прапанаваць "раскрытыкаванаму" мной пісьменніку выйсці на вуліцу і правесці апытанне "якія мае творы вы чыталі?". Хай ён (яна) паспрабуюць знайсці ў сабе дастатковую долю крывадушша, каб сказаць, што хаця б кожнаму пятаму будзе вядома яго (яе) прозвішча.

— Якой павінна быць кніга, каб вам было цікава яе рэцэнзаваць?

— Ёсць толькі адна катэгорыя кніг, якія мне нецікава рэцэнзаваць. Гэта кнігі, што не робяць аніякага ўражання — ні станоўчага, ні адмоўнага. Вельмі цяжка сказаць нешта пра тое, пра што няма чаго казаць.

Саша ДОРСКАЯ



Клецк — адзін са старэйшых гарадоў Беларусі. Амаль дзевяць стагоддзяў — узрост паважаны. А вось з помнікамі мінуўшчыны гораду не пашанцавала. Пра замак, які некалі ўзвышаўся на беразе Лані, нагадвае адно земляны вал. Ад палаца Радзівілаў (XVII ст.) і яўрэйскай сінагогі (канец XVIII ст.) не засталося нават следу. Фрагмент сцяны, які апынуўся на прыватным падворку, — вось усё, што захавалася ад Троіцкага касцёла (сярэдзіна XV ст.). На гэтым фоне лёс помніка, пра які пойдзе гаворка, выглядае проста зайздросна. Дык вось, самы старажытны будынак Клецка — былы дамініканскі касцёл, а цяпер праваслаўная Уваскрэсенская царква. Яе вежы, што ўзвышаюцца над цэнтральнай плошчай горада, здалёк відаць кожнаму, хто пад'язджае да Клецка.

Вежы над горадам

Плошча перад касцёлам у Клецку. *Фота пачатку XX ст.*

Першыя манахі-місіянеры ордэна дамініканцаў з'явіліся ў Клецку — цэнтры асобнай радзівілаўскай ардынацыі — на пачатку XVII ст. Тады ж яны пачалі хадайнічаць перад віленскім біскупам Валовічам аб дазволе заснаваць у горадзе свой манастыр. Але біскуп не надта падтрымліваў памкненні "псоў божых". На той час Клецк, які быў пераважна праваслаўным горадам, ужо меў адзін касцёл у гонар святой Троіцы, пабудаваны ў сярэдзіне XV ст. і перабудаваны праз сто гадоў паводле праекта слыннага архітэктара Яна Марыі Бернардоні. Пры ім была збудавана невялікая дамініканская капліца. Сродкі на ўтрыманне братоў-манахаў даў князь Альбрыхт Радзівіл, які ў сваім тастаменце ад 20 жніўня 1624 г. завяшчаў ім Міхнавіцкі фальварак і маёнтак Гарадок.

24 мая 1683 г. чацвёрты клецкі ардынат Станіслаў Казімір Радзівіл выдаў дамініканцам фундуш, якім абавязаўся вызначыць пляц для касцёла і манастыра, штогод выдаткоўваць на яго ўтрыманне па 1000 злотых і бясплатна — лес для будаўніцтва з Машукоўскай пушчы. Менавіта гэты дзень можна лічыць датай заснавання касцёла Звеставанне Найяснейшай Дзевы Марыі. Акрамя Радзівіла, падтрымку ордэну аказаў скарбнік Наваградскага ваяводства Юрый Казімір Булгак і яго жонка Кацярына Клара з дома Галтоўскіх, якія ахвяравалі для касцёла адразу ж 1000 злотых і перадалі для яго ўтрымання "на вечныя часы" маёнтак Навадворцы і вёску Даматканавічы.

4 ліпеня 1683 г. быў вымераны і перададзены пад забудову пляц у цэнтры горада шырынёй 70 і даўжынёй 551 метр. Будаўніцтва вялося надзвычай хуткімі тэмпамі. Праз 11 месяцаў пасля абмеру пляца драўляны касцёл ужо быў узведзены і ўрачыста асвечаны. Каля 1700 г. пачалося ўзвядзенне новага цаглянага касцёла, якое завяршылася да 1704 г. На той час гэта быў адзіны цагляны будынак у горадзе, усе астатнія — драўляныя. На Рынкавую плошчу выходзілі дзве вежы галоўнага фасада. З таго часу і да нашых дзён перад імі разгортваліся ўсе больш-менш значныя падзеі клецкай гісторыі. Ужо ў 1706 г. у цэнтры горада распачалася бітва паміж рускім войскам баярына Няплюева і атрадам шведскага палкоўніка Густава Крэйца. Сёння пра гэту бітву мала вядома ў Расіі, яшчэ менш у Беларусі, але яе добра памятаюць шведскія гісторыкі. І не дзіўна. Пад Клецкам 1,5-тысячны шведскі атрад ушчэнт разграміў 5-тысячны (па іншых звестках 9-тысячны) рускі корпус. Для кляччан жа вынікам тых падзей стала змяншэнне насельніцтва ў два разы.

Напэўна, перад касцёлам прымаў добраахвотнікаў у шэрагі свайго войска гетман Агінскі, які ў верасні 1771 г. з'явіўся пад Клецкам і адсюль паспрабаваў весці наступ на рускія гарнізоны ў Нясвіжы і Слуцку. У 1812 г. каля дамініканскіх муроў праходзіла саксонская брыгада генерал-маёра Цыгмейстра.

Пры касцёле дзейнічаў шпіталь, існавала школа, у якой навучалася "чытаць, пісаць, граматыцы і розным патрэбным навукам" 10 студэнтаў-шляхціцаў. Настаўнікам быў прыёр Беатус Міляноўскі. Акрамя яго, у Клецку знаходзілася тры ксяндзы і адзін просты манах.

Касцёл адразу ж выклікаў пільную цікавасць праваслаўнага (былога уніяцкага) духавенства. На той час адзіная праваслаўная царква Клецка з-за няўвагі з боку Радзівілаў апынулася ў непрыгодным для набажэнстваў стане і вымагала тэрміновага рамонту. Праваслаўныя іерархі настойліва патрабавалі ад Лявона Радзівіла пабудовы дзвюх новых цэркваў. Князь жа вырашыў пайсці найпрасцейшым (і таннейшым) шляхам і пачаў дабівацца перадачы дамініканскіх муроў для праваслаўных клецкіх прыходаў. Генерал-лейтэнант імператарскай арміі дзейнічаў праз сваю жонку Соф'ю, народжаную князёўну Урусаву. Соф'я звярнулася да ваеннага міністра з просьбай перадаць будынак праваслаўным і выказала гатоўнасць "за свой кошт адладкаваць у былым касцёле царкву". Справу разглядаў асабіста Мікалай I, які наклаў на просьбу рэзалюцыю: "Згодзен, калі княгіня Радзівіл дасць пісьмова абавязацельства зрабіць праваслаўную царкву ў двухгадовы тэрмін". У верасні 1852 г. храм пачалі перарабляць у праваслаўным стылі, а ўжо ў кастрычніку 1854 г. царква была перададзена ў праваслаўнае духоўнае ведамства. У кастрычніку храм быў асвечаны ў імя Уваскрэсення Гасподняга. Пачаўся новы этап гісторыі.

На пачатку XX ст. прыход Уваскрэсенскай царквы ўключаў палову Клецка і 11 навакольных вёсак, каля 3,5 тыс мужчын і жанчын. Пры царкве дзейнічала народнае вучылішча, у якім па стане на 1882 г. займалася 72 вучні. Цікава, што сярод іх былі і католікі. Мелася невялікая бібліятэка царкоўнай літаратуры. Галоўнай святыняй і каштоўнасцю храма была мясцова шанаемая ікона Маці Божай з Прадвечным Немаўлём, перанесеная з былой Пакроўскай царквы. Хто і калі яе напісаў — невядома, аднак захаваліся паданні пра цуды. Да абраза былі прымацаваны каштоўныя ўпрыгожанні як своеасаблівае сведчанне таго, што ікона вылечвала тых, хто звяртаўся да яе з верай і малітвай. Акрамя таго, "Апісанне цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі" 1879 г. сведчыць, што тут жа захоўвалася "надзвычай старажытнае Евангелле, без пачатку, старога славянскага пісьма... у страдаўнім медным высерабраным акладзе."

Падчас знаходжання Клецка ў складзе Другой Рэчы Паспалітай (1921 — 1939 гг.) Уваскрэсенская царква засталася праваслаўнай. У гады Вялікай Айчыннай вайны для царквы насталі цяжкія часы. Зрэшты, ужо ў 1939 г. з прыходам савецкай улады некаторыя гарачыя галовы патрабавалі разбурыць святыню, а калі гэта не ўдалося — прымусілі парафію выплаціць вялікую кантрыбуцыю. У перыяд акупацыі немцы занялі палову плябані, аднак царква дзейнічала. Час быў страшны, непадалёк ад царквы перыядычна ставілі шыбеніцы для пакарання смерцю. Насупраць яе вежаў фарміравалі 4-тысячную калону яўрэяў, якую гналі на расстрэл да гарадскіх могілак. У гэты перыяд настаяцелем царквы быў ураджэнец Белавежы айцец Канстанцін Байко, які ў свой час цярпеў моцны пераслед з боку польскіх улад за сваю адданасць праваслаўю. У 1937 г. лёс закінуў яго ў Клецк, дзе айцец Канстанцін знаходзіўся да канца акупацыі. Ён рабіў усё, што належала рабіць хрысціянскаму святару для аблягчэння лёсу прыхаджан. І нават больш за тое: хрысціў яўрэйскіх дзяцей, ратуючы іх ад знішчэння, дапамагаў цыганам, якіх шмат было ў навакольлі горада. Тым не менш, пасля вайны святар быў арыштаваны і асуджаны на 15 гадоў лагераў нібыта за супрацоўніцтва з немцамі падчас акупацыі Клецка.

Пасля вайны ў кляштарных будынках размясціўся райкам партыі. Уваскрэсенская царква яшчэ нейкі час дзейнічала. А ў пачатку 60-х гг. на хвалі антырэлігійнай кампаніі яе закрылі і разрабавалі. Замест крыжоў на даху ўсталявалі пяцікутныя зоркі, а ў будынку зрабілі гарадскую спортзалу. Праўда, ненадоўга. Неўзабаве старажытныя муры перадалі механічнаму заводу, там размясціўся адзін з яго цэхаў. У выніку знешні выгляд храма істотна змяніўся, цалкам быў страчаны інтэр'ер, надбудаваны вежы, знішчаны арыгінальны вонкавы дэкор сцен. Бясследна зніклі царкоўныя рэчы, якія згадваюцца ў старых апісаннях, сярод іх і цудатворны абраз Божай Маці.

Толькі на пачатку 90-х будынак вярнулі вернікам, а ў 1994 годзе, на свята Божага нараджэння, у адноўленай царкве адбылося першае набажэнства. З таго часу і да нашых дзён настаяцелем тут з'яўляецца айцец Мацвей Белавус. Сёння немагчыма ўявіць сабе цэнтр Клецка без Свята-Уваскрэсенскай царквы. Яе муры нібыта захоўваюць памяць пра апошнія тры стагоддзі гісторыі Клецка. Прыцягваюць да сябе гасцей і рэдкіх пакуль што турыстаў. Здавалася б, старажытны горад атрымаў галоўны турыстычны "аб'ект", але... Царква, якую руйнавалі дзесяцігоддзямі, вымагае капітальнага рамонту і значных фінансавых укладанняў. Праектна-каштарысная дакументацыя ўжо падрыхтавана, а самі работы пакуль не праводзяцца з-за адсутнасці сродкаў. Ужо некалькі гадоў у раёне вядзецца збор ахвяраванняў на царкву, звярталіся па дапамогу ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, але да разгортвання паўнамаштабных рэстаўрацыйных работ яшчэ далёка. Застаецца спадзявацца, што становішча ўсё ж зменіцца да лепшага і старажытны храм зробіцца сапраўдным сімвалам горада, якім кляччане змогуць ганарыцца.

Андрэй БАІНЕЦ

Здымкі з фондаў Клецкага краязнаўчага музея

Жанчына з вялікай літары

А яшчэ Ніна Лявонаўна Сняжкова была чалавекам глыбокай душы, мудрага сэрца, мілая і вельмі абаяльная ў жыцці, у якім у Яе былі і высокія дзяржаўныя пасады, і мноства сяброў, а галоўнае, Яе няўрымслівай натуры ўласціва было пачуццё любові да жыцця і звычайнага, простага чалавека ў гэтым жыцці. Яна заўжды камусьці імкнулася дапамагчы, ляцела на чыйсьці пільны клопат і вельмі часта апыналася менавіта там, дзе патрэбна была Яе дапамога, якой ад Яе чакалі. У сямідзесятыя гады мінулага стагоддзя мне даводзілася Ніну Лявонаўну бачыць здаля ў высокіх прэзідыумах на пленумах нашага творчага саюза, на пачатку дзевяностых, калі я пачала працаваць у рэдакцыі часопіса "Работніца і сялянка", надарылася некалькі разоў прыязна сутыкнуцца на нейкіх жаночых мерапрыемствах, калі Тамара Мікалаеўна Дудко намерылася стварыць Саюз беларускіх жанчын, а ў новым стагоддзі нечакана між намі ўсталявалася нейкая вельмі цёплая прыязнасць. Яна любіла забегчы ў "Маладосць" і затрымацца не на хвілінку, а, здаралася, на цэлую гадзіну і ўсё непакоілася: "Рая, ну, куды кінуцца, каб падтрымаць нашу літаратуру, я ж ведаю, як цяпер цяжка пісьменнікам!". І пачынала згадваць то перапіску, то шчырыя доўгія размовы пра літаратуру з многімі з нашых класікаў, успамінала сумесныя творчыя паездкі, расказвала пра ўражанне ад прачытаных кніг. Яе цікава было слухаць. А потым Яна захапілася працай над сваёй уласнай кнігай "Жанчына стагоддзя", прысвечанай Валянціне Церашковай, з якой сябравала многія гады. Кніга — пра Церашкову, а ўвогуле, пра Беларусь.

Згадваючы імя Ніны Лявонаўны Сняжковай, звычайна, многія і многія называюць Яе вядомым грамадскім дзеячам. Гэтак яно і было, але тыя, хто блізка Яе ведаў, хутчэй назавуць Анёлам-ахоўнікам і нашай беларускай літаратуры, і нашага мастацтва, ды і, увогуле, усёй культуры. Яна ўмела захапляцца, умела бачыць і цаніць у чалавеку талент і ўсяляк спрыяла росквіту таму айчыннаму палетку, дзе валадараць Музы. Пра гэта ведае і памятае не адно пакаленне творцаў. Будуць ведаць пра гэта і наступнікі, таму што зерне, кінутае руплівай рукою, прарастае. Усе добрыя справы Ніны Лявонаўны засталіся на зямлі людзям, як і застанецца добрая, светлая памяць пра Яе — зычлівага чалавека, Жанчыну з вялікай літары.

Раіса БАРАВІКОВА, пісьменніца, галоўны рэдактар часопіса " Маладосць"



Празаік, выдавец, жыццялюб

Пайшоў з жыцця пісьменнік Міхаіл Навумавіч (Майсей Беньямінавіч) Герчык. Гэта здарылася 3 чэрвеня. Цяжкая хвароба, з якой ён мужна змагаўся доўгія гады, узяла сваё. Смерць не пачакала нават некалькіх гадзін, каб спраўдзілася апошняе жаданне Міхаіла Навумавіча — убачыць кнігу, якую ён вельмі чакаў: дзень выхаду ў свет новага рамана "Погоня за миражом" містычна супаў з днём смерці. Кажуць, яго апошнія словы былі: "Якога колеру вокладка?". А яшчэ праз чатыры дні ён адзначаў бы свой дзень нараджэння.

Яго біяграфія ўкладаецца ў некалькі радкоў (у 1932 годзе нарадзіўся ў сям'і рабочага; педагог і журналіст па адукацыі; рэдактар па прафесіі — газета "Зорька", выдавецтвы "Беларусь", "Мастацкая літаратура"; пісьменнік па прызванні). Але гэта біяграфія чалавека пасляваеннага пакалення, з усімі цяжкасцямі і нядолямі таго часу, і таму яе хапіла Міхаілу Герчыку на некалькі раманаў і аповесцей. Сярод іх — "... Отдаешь навсегда", "Обретение надежды", "Оружие для убийцы", "Солнечный круг", "Ветер рвет паутину", "Повесть о золотой рыбке", "Дзе жывуць чараўнікі", "Вяртанне да сябе", дакументальна-публіцыстычная аповесць "Час гаспадароў" і іншыя. Ён заўсёды пісаў жыццё з натуры. У пачатку дзевяностых, каб прыглядзецца да новых беларусаў, што лавілі залатую рыбку ў каламутнай вадзе бізнесу, ён уладкоўваецца ў адно з прыватных выдавецтваў Мінска і збірае матэрыял для кнігі. Яна і стала яго апошняй кнігай — пра падзенне нораваў, пра матэрыяльнае накапленне як міраж чалавечага шчасця.

Міхаіл Герчык пісаў на рускай і беларускай мовах. Яго творы перакладзены на польскую, балгарскую, румынскую, латышскую, узбекскую мовы.

Многім з нас пашчасціла быць асабіста знаёмымі з Міхаілам Навумавічам. Адчуванне гумару і жыццялюбства дапамагала яму ва ўсім, а ў апошнія гады — нават перамагаць хваробу. Ён не дазваляў сабе адчаю, хоць добра ведаў, чым скончыцца няроўная барацьба.

Міхаіл Навумавіч Герчык назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Літаратары, калегі, знаёмыя, калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва"

№ 24 13 чэрвеня 2008 г. ЛіМ

Як вясновы прамень

Сёлетні год высакосны вярнуў у наш каляндар дзень 29 лютага, прымусіўшы згадаць, што роўна сто гадоў таму нарадзілася беларуская пісьменніца Ядвіга Бяганская. Відаць, з той нагоды, што ўбачыць свет давялося на ўзмежку зімы і вясны, ёй, паводле слушнага сцвярджэння А. Канапелькі, і наканавана было "ўсё жыццё пераадольваць, як холад зімы, пакутлівы холад чалавечых душ і саграваць словам, сэрцам, спагадаю іншых людзей — гэтым яна нагадвала сабой вясновы прамень".

Бацькі

Адну мясцінку ў ваколіцах былога засценка Лазіно, што пад Барысавам, старажылы і сёння называюць "Закут Бяганскага". Невялікі кавалак зямліцы (пачатак здзяйснення мары пра уласную гаспадарку) быў выкуплены старэйшым сынам малазямельнага селяніна Вінцэнта Бяганскага Іосіфам на самым пачатку мінулага стагоддзя. Каб прыдбаць гэты надзел, малады чалавек мусіў выехаць аж у Забайкалле і старанна збіраць капейку да капейкі.

У Верхне-Удзінску (цяпер Улан-Удэ) у 1906 годзе лёс падараваў яму сустрэчу з зямлячкай — Браніславай Іванаўнай Самковіч, якая належала да шляхетнага роду. Маладыя вянчаліся ў верхне-ўдзінскім касцёле, у ім жа хрысцілі Ядвігу-Юлію.

Пераезд на Радзіму зацягнуўся надоўга. Давялося перажыць на чужыне кастрычніцкія падзеі, грамадзянскую вайну... Вярнуліся ў Беларусь толькі ў 1922 годзе. Год пажылі ў Лазіно, яшчэ год у Пагулянцы, а калі Іосіф Бяганскі атрымаў месца машыніста на мінскай чыгунцы, сталі гарадскімі жыхарамі, здолеўшы пабудаваць дом.

У свой час Іосіф Бяганскі скончыў прыходскае вучылішча, Браніслава — польскую гімназію, і ён, і яна вельмі хацелі вучыцца далей. Іхняя былая мара ўвасобілася ў поспехах разумніцы Ядвігі. Яна набывала веды спачатку ў чыгуначнай школе, затым на аднагадовых курсах па падрыхтоўцы ў ВНУ, а яшчэ пазней паступіла і ў 1930 годзе скончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфакультэта БДУ, дзе ёй пашчасціла слухаць лекцыі прафесараў Замоціна, Барычэўскага, Пічэты. Бацькам было чым ганарыцца — у іх родзе нарэшце з'явілася асоба з вышэйшай адукацыяй.

Гэты час для Бяганскіх быў ціхамірна-сонечным, калі ўсталяваўся побыт, падраслі дзеці і думалася, што ўсё выкіроўваецца толькі да лепшага. Новыя радасці прынесла праца дачкі ў якасці настаўніцы-славесніцы ў школе, ды не абы-якой, а ўзорнай школе імя Чарвякова. Без выкладання роднай мовы і літаратуры, без сардэчнай увагі да кожнага выхаванца Ядвіга наогул "не ўяўляла свайго жыцця" і хутка заваявала "званне любімай настаўніцы". Дарэчы, вярнуўшыся ў Мінск пасля доўгіх васемнаццацігадовых блуканняў па пакутах, яна атрымала ўзнагароду — шчырую ўдзячнасць і павагу былых вучняў.

Сябры

Чым жа асабліва вабіў той сціплы дамок Бяганскіх па вуліцы Р. Люксембург будучую эліту нацыянальнай культуры — З. Бядулю і І. Жыновіча, А. Куляшова і М. Хведаровіча, П. Броўку і Кузёмку, як ласкава па-хатняму называлі тут К. Чорнага, паэтычна ўзнёслых і ўжо тады вядомых Ядзвізіных аднакурснікаў П. Труса, У. Галубка, П. Глебку, М. Лужаніна і іншых? Зразумела, не толькі пекнасцю чарнавокіх прыгажунь Галіны, Ядвігі і Ніны ці шчырай ветлівасцю негаваркой гаспадыні. Нездарма ж свае наведванні-сустрэчы таленавітая моладзь лічыла за літаратурна-музычныя вечарыны...

Ядвізе Іосіфаўне наогул шанцавала на сустрэчы з неардынарнымі і цікавымі асобамі. Асабіста ведала яна Чарота, Галавача, Гартнага, дзеці якога былі яе вучнямі. З удзячнасцю не адзін раз згадвала сваіх калег і дырэктара школы М. Р. Цмыга, які ўвесь свой талент педагога, усю душэўную шчодрасць аддаваў справе выхавання і адукацыі дзяцей. На жаль, не вытрымаўшы хлуслівых абвінавачванняў у прыхільнасці да трацкізму, ён у трыццатыя гады скончыў жыццё самагубствам.

Пасля рэабілітацыі і вяртання ў Мінск у 1955 годзе падтрымаў Ядвігу Іосіфаўну Алесь Якімовіч, паспрыяўшы ўладкаванцца на працу ў дзіцячую рэдакцыю Беларускага радыё. Самыя шчырыя сяброўскія адносіны склаліся з супрацоўнікамі рэдакцыі і захаваліся пасля выхаду Бяганскай на пенсію. У апошнія гады жыцця сардэчнай цеплынёй сагравалі тэлефонныя званкі А. Васілевіч, А. Пальчэўскага, С. Грахоўскага, С. Шушкевіча, А. Кобец-Філімонавай.

Першае каханне

Гасцінна прыняў дом Бяганскіх і першае каханне Ядвігі — Алеся Сака. Сын вясковага каваля з Навагрудчыны, дзякуючы высілкам бацькі, у свой час вучыўся ў Пецярбургскім

З малодшым сынам Яўгенам

З сёстрамі (Ядвіга ў цэнтры)

лесатэхнічным інстытуце, аднак з-за немагчымасці пабрацца шлюбам з каханай дзяўчынай, сям'я якой стаяла на адной з вышэйшых прыступак тагачаснай сацыяльнай лесвіцы, хлопец кінуў навучальную ўстанову і паступіў у каталіцкую семінарыю, збіраючыся даць абяцанне бясшлюбнасці.

Жыццё ж распарадзілася інакш. Ужо будучы супрацоўнікам Акадэміі навук БССР, старэйшы за сваю абранніцу на васемнаццаць гадоў, Алесь Мікалаевіч стаў для Ядвігі надзейным сябрам і духоўным дарадцам. Абое пісалі вершы, абое ў другой палове 1920-х друкаваліся ў перыёдыцы.

Першы раз беспадстаўна арыштаваны Сак быў у 1929 годзе і адразу ж адпраўлены на будоўлю Беламор-Балтыйскага канала, дзе працаваў у геалагічнай разведцы і куды Ядвіга двойчы наведвалася. Праз пяць гадоў Алесь вярнуўся, паспеў яшчэ парадавацца народзінам і першым крокам дачушкі, аднак у красавіку 1937-га зноў быў арыштаваны і загінуў, хутчэй за ўсё, у Курапатах.

Яе Галгофа

Чорны трыццаць сёмы пазбавіў Бяганскіх і бацькі. Доўга не ведалі пра яго лёс, але спадзяваліся і верылі, што жывы. Пазней меркавалі: свой апошні прытулак ён таксама знайшоў у Курапатах. І толькі пасля невялічкай газетнай публікацыі напрыканцы 1990-х, дзе паведамлялася пра жахлівую знаходку — могільніка амаль двух тысяч чыгуначнікаў, расстраляных за тое, што машыністы адмаўляліся весці саставы з раскулачанымі сялянамі за межы рэспублікі, найбольш верагодным месцам смерці падаўся паўночна-заходні мікрараён Мінска. Наўрад ці законапаслухмяны, памяркоўны і дысцыплінаваны працаўнік Іосіф Бяганскі быў з кагорты тых бунтоўных машыністаў, але трапіць у лік пакараных, безумоўна, мог.

А тады праўдалюбка Ядвіга куды і каму толькі не пісала (нават Сталіну і Кагановічу). Адказаў, вядома, не атрымала, але яе актыўнасць не засталася незаўважанай: у НКУС прапанавалі адмовіцца ад бацькі і выракчыся мужа. Яна ж працягвала ледзь не кожны дзень наведваць начальства Валадаркі, даказваючы невінаватасць сваіх блізкіх.

6 лістапада 1937 года перад тым, як пайсці на святочны школьны ранішнік, прысвечаны 20-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, чарговы раз зайшла туды (паабяцалі спатканне з бацькам), а адтуль ужо не вярнулася. Яе запісалі полькаю (пашпарт так і застаўся дома), прад'явілі абвінавачванне ў прыналежнасці да нацдэмаўскай арганізацыі, якой нібыта кіраваў Алесь Сак.

Я. Бяганскай наканавана было прайсці праз глумленні, гвалт, бязлітасную жорсткасць. Да фізічных пакут дадаваліся пакуты душэўныя — адчуванне прыніжанасці, усведамленне поўнай безабароннасці, а таксама штохвілінная трывога-боль за лёс маці, сёстраў, трохгадовай дачкі.

Знаходзячыся ў паўзабыцці, паміж кашмарнай явай і не менш кашмарнымі трызненнямі, яна пачала баяцца, што звар'яцее і тады падпіша ўсё, што загадаюць. Губляючы апошнюю надзею на справядлівасць, выратаванне, жанчына "вырашыла павесіцца на сваёй уласнай касе, балазе, што яна была <...> доўгая". Жудасны акт перапыніў чарговы выклік з камеры, як тады падумалася, выклік у небыццё. Праўда, аказалася, што для абвяшчэння прысуду: яе чакалі дзесяць лагерных гадоў.

Этапныя дарогі прывялі на Калыму.

Не счарцвеўшы душой, захаваўшы вялікую чалавечую годнасць, з узнятай галавой у кароне з залатой касы мужна прайшла Я. Бяганская выпрабаванні ГУЛАГа. Шыла на фабрыцы зэкаўскую абмундзіроўку, рукавіцы для рыбакоў, мяшэчкі для залатога пяску. Працавала на лесапавале разам з мужчынамі, начуючы, як і ўсе, у палатках, да сценак якіх пад раніцу прымярзалі валасы. Хуталася ў лагерныя транты, каб захінуць пастуджаныя грудзі, калі сіламі зняволеных будаваўся першы калымскі саўтас.

Як на святло пацягнулася яна да маладога чалавека, жыхара Беларусі Міхаіла Ліберфарба, які, нібы апраўдваючы сваё прозвішча (аматар фарбаў), сапраўды быў мастаком, здольным фатографам. Ён скончыў напрыканцы 1920-х віцебскае мастацкае вучылішча, а значыць, не мог не ведаць творчых здабыткаў К. Малевіча, М. Шагала, палотны прыхільнікаў школы Ю. Пэна — заснавальніка першай беларускай мастацкай студыі. Трапіў ён на Калыму са службы ў далёка-ўсходняй ваенна-марской частцы, куды быў мабілізаваны. Выконваючы заказ начальства, намаляваў "правадыра ўсіх народаў", але, як канстатаваў трыбунал, не ў належным ракурсе.

Гісторыя кахання Ядвігіных бацькоў быццам паўтарылася. Пад чужым небам, далёка ад Радзімы расцвіло непадуладнае ніякім забаронам светлае пачуццё. На жаль, нядоўга, вельмі нядоўга адчувала Ядвіга Іосіфаўна падтрымку роднаснай душы. Міхаіла адправілі з лагера на перагляд справы. Спадзяваліся, што вызваляць датэрмінова, але звезлі на Камчатку, пазбавіўшы права перапіскі.

Яна ж, верная сваёй клятве, працягвала выжываць. Працавала з дня ў дзень да поўнай знямогі і чула, як пад сэрцам б'ецца другое сэрца. Сынок Уладзік нарадзіўся 6 лістапада 1940 года. Яго змясцілі ў так званы дзіцячы камбінат, куды некалькі разоў на дзень прыводзілі калону парадзіх для кармлення.

Дата 6 лістапада знакава паўтарылася ў жыцці Ядвігі Іосіфаўны тройчы. У гэты дзень 1947 года яна атрымала даведку пра доўгачаканае вызваленне. Кінулася ў Магадан па сына, з якім урэшце дабралася ў "забароненую зону" — чукоцкі пасёлак Певек, дзе знаходзіўся Міхаіл Якаўлевіч. І толькі праз год, калі ў Ядвігі Іосіфаўны моцна абвастрылася хвароба сэрца, ёй з сям'ёй дазволілі выехаць на Радзіму.

Мінск сустрэў пякучымі слязьмі пасівелай маці, зусім сталай сястры Галіны і ўжо дарослай дачкі. Сустрэў і напаўразбураным фашысцкай бамбёжкай бацькоўскім домам, які ажывіўся звонкім галаском народжанага ў канцы лістапада 1948 года другога сына — Жэні. Аднак лёс вымушаў як мага хутчэй пакінуць сталіцу. Сям'я, апрача дачкі, якой трэба было заканчваць школу і паступаць у інстытут, пераехала да знаёмых у Рэчыцу. Там Міхаіл Ліберфарб працаваў мастаком, а Ядвіга Іосіфаўна "заставалася дома з малымі". Канчатковае вяртанне адбылося праз восем гадоў пасля поўнай рэабілітацыі.

Яе слова

Першыя вершы Я. Бяганскай з'явіліся ў часопісе "Малады араты" (1926), газеце "Беларуская вёска" (1927) у часы яе шчаслівай маладосці. З нізкай жа вершаў "Над Калымой ні воблачка, ні хмаркі..." чытач змог пазнаёміцца на старонках "ЛіМа" (1997), калі аўтаркі, на вялікі жаль, ужо не стала. Ядвіга Іосіфаўна Бяганская памерла 3 красавіка 1992 года. Немаведама як захаваныя, ацалелыя пры вобысках лагерных баракаў, гэтыя творы даносяць да нас сённяшніх сум па Бацькаўшчыне, па родных і блізкіх людзях, сведчаць пра непахісную веру Чалавека, Жанчыны, Маці ў перамогу святла і дабра ў свеце.

Заходні вецер зноўку мне прынёс
Ад любае Радзімы прывітанне
Цяпло яе зямлі, блакіт яе нябёс
І песню жаваранка на світанні.
Я чую зноў напеўны шум бароў,
Удыхаю водар чабароў духмяных.
О Беларусь, я плоць твая і кроў.
З табою сэрцам назаўжды з'яднана.

Надзея, Любоў, Вера ды жаданне менавіта праз гэтае Богам блаславёнае трыадзінства дастукацца да чалавечых сэрцаў прымусілі былую настаўніцу пачаць пісаць для дзяцей. Шчыра, з зайздроснай мэтанакіраванасцю раскрывала яна таямніцы навакольнага свету, заўсёды ведучы маленькага чытача да сапраўдных маральных вышыняў. У яе літаратурнай спадчыне ёсць творы, прысвечаныя самым маленькім, дзе ў фабульныя структуры арганічна ўплецены казачныя элементы і забаўляльныя гульні ("Пра казачных чалавечкаў", "Маленькі капітан"). Ёсць творы для дзяцей школьнага ўзросту, змешчаныя ў кнігах апавяданняў і аповесцей "Далёка на Поўначы" (1954), "Жэнеў галубок" (1958), "Сустрэча з морам" (1962), "Кожны марыць стаць Калумбам" (1968), "Над ракой Шушай" (1977), "Нечаканая сустрэча" (1978), "Зосіна зорачка" (1980), "Сланечнікі" (1980), "Ля самага сіняга мора" (1982), "Сонцу і ветру насустрач" (1988).

Разважаючы пра ідэйна-мастацкія задачы і спецыфічныя сродкі юнацкай аповесці, А. Адамовіч падкрэсліваў, што ў ёй у першую чаргу павінна падкупляць "наіўнасць прастаты, непасрэднасці". Менавіта такой "наіўнасцю прастаты, непасрэднасці" паланяць аповесці і апавяданні Я. Бяганскай, бо яе яшчэ неспрактыкаванаму ў жыцці герою і чытачу патрэбна ісці крок у крок за падзеямі, вывяраючы пры гэтым уласныя ўчынкі.

Карціна ж мастацкага свету, якую мадэлюе пісьменніца ў сваіх творах, — яркая, шматколерная. Выхоўваючы эстэтычны густ чалавека, які расце, аўтарка прывучае яго быць уважлівым да той ці іншай прыроднай з'явы, ацэньваць яе прыгажосць, незвычайнасць, атрымліваць асалоду ад бачанага.

Даходлівыя, ясныя па форме выказвання творы Я. Бяганскай для дзяцей і пра дзяцей скіраваныя на тое, каб выклікаць у маленькага чытача самыя лепшыя пачуцці, выхоўваць дабрыню і спагаду, таварыскасць і справядлівасць, адданасць Бацькаўшчыне і любоў да жывой прыроды, навучыць паважаць і засвойваць сістэму адвечных агульначалавечых каштоўнасцей.

Нельга не адзначыць, што высокамастацкай якасцю вызначаюцца шматлікія пераклады Я. Бяганскай. Дзякуючы яе бездакорнаму веданню моў, чуйнаму стаўленню да слова, загаварылі па-беларуску героі польскіх і славацкіх пісьменнікаў (А. Ажэшкі, Я. Корчака, Г. Паўшар-Кляноўскай, Г. Мушынскай-Гофман, Г. Ажгароўскай, Д. Бянькоўскай, А. Багдая, М. Крно, А. Мінача, К. Ярункавай, Я. Грушоўскага і інш.).

Пройдзе час і, падсумаваўшы пражытае і здзейсненае, Ядвіга Іосіфаўна напіша галоўную кнігу свайго жыцця — аўтабіяграфічную аповесць "Мая Галгофа" (1978, 1990). Гэта моцны і глыбока кранальны твор, шчырая споведзь мужнай жанчыны, якая трапіла ў пякельны калаўрот сталінскага ГУЛАГа і здолела выстаяць. Гэта споведзь душы, якая не мела спакою, бо павінна была расказаць людзям праўду пра тыя завейныя часы, каб ведалі, каб не забываліся, а яшчэ, каб верылі ў трыумф Дабра на Зямлі. Яна свята верыла.

Людміла КАРПАВА

Блакітны спадман, альбо Пагаворым пра душу

Працяг тэмы

У штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" за 21 снежня 2007 года быў надрукаваны артыкул Таццяны Шамякінай "Пра месячык, тэлеэкран і газетную паласу", дзе ўзнімаліся сур'ёзныя пытанні адносна некаторых аспектаў адлюстравання ў СМІ грамадскага жыцця. Рэдакцыя газеты да гэтага часу атрымлівае водгукі на артыкул. Сёння прапануем увазе чытачоў адзін з такіх допісаў.

Тэлебачанне без усялякага перабольшвання з'яўляецца адным са сродкаў уздзеяння на людскія душы, на фарміраванне чалавечага светапогляду, як і ўся наша культура. Тым больш, што хадзіць далёка не трэба: націснуў на клыпажок — і перад табой увесь белы свет, свой і чужы.

У гэтай бяскрайняй прасторы знойдзеш усё, пачынаючы ад рэкламы новага гатунку мыла і заканчваючы міжнароднай панарамай. Глядзі кожны, што каму падабаецца, — выбар свабодны. Як свабодны ён і ў тых, хто робіць наша з вамі тэлебачанне — забароненых тэм няма. Толькі часта, на маю думку, у слодыч свабоды падмешваецца нешта пачварнае, калі не сказаць больш.

У прыватнасці, на адным з каналаў нашага тэлебачання закончыўся паказ чарговага расійскага серыяла "Брэжнеў". Мала нам, аказваецца, лаціна-амерыканскіх "мыльнікаў", прынамсі ў большасці сваёй бяскрыўдных для розуму і душы: прыгожае жыццё, такія ж людзі, асабліва жанчыны, каханне ва ўсіх яго праявах, амаль райская прырода — глядзі і "адцягвайся", як сёння гаворыць моладзь. Не, нашых тэлевяшчальнікаў нібыта за руку хто цягне, каб волакам валачы на свае экраны такія суседскія тварэнні (дзе агульнае наша былое не такое ўжо і змрочнае, а калі паглядзець цвяроза, то куды больш духоўнае і душэўнае), раўняецца з зямлёй. А як тады быць з пушкінскім — павагай да бацькоўскіх трунаў?

Дык пра чужое кажаш, запярэчыць чытач. Пры чым тут беларускае? А пры тым, што культурнае бязмежжа дазваляе ўсё непатрэбнае і нават шкоднае перасаджваць на сваю родную глебу, не клапоцячыся пра тое, якія будуць усходы. На жаль, яны пустазельныя. Не паспеў сысці з тэлеэкранаў агідны ва ўсіх адносінах фільм "Цялец" (героем якога стаў адзін з дзеячаў свайго часу, Ульянаў-Ленін), як на змену яму прыйшоў Іосіф Вісарыёнавіч. Да яго яшчэ не дабраліся. Але абавязкова дабяруцца. Падчэпяць на свой тэлевізійны кручок і Міхаіла Сяргеевіча разам з "царом" Барысам , хоць апошнія два і далі якраз тую свабоду, пра якую казалася вышэй, свабоду ва ўсім — легальным і нелегальным, законным і крымінальным, сваім і варожым... І пацягнуліся на экраны бясконцыя "Браткі", "Брыгады", "Вуліцы разбітых ліхтароў", "Жмуркі". У апошнім фільме, дарэчы, адну з галоўных роляў сыграў Аляксей Панін, які нядаўна ў размове на беларускім тэлеэкране рэзка адмоўна выказаўся пра гэты фільм, як шкодны і злосны, і што сваёй дачцэ глядзець яго ён не дазволіць. А нашым дзецям і ўнукам, аказваецца, можна...

Сімптаматычна: зруйнаваць, перакруціць сапраўдны лад і ўклад жыцця ў нейкі віртуальны, выдуманы, усімі праўдамі і няпраўдамі даказаць, як хораша і бесклапотна жывецца пасля, так бы мовіць, ельцынскага пераваротаў ўсяму люду — сэнс творчасці і нават жыцця стваральнікаў такіх фільмаў, закупленых расійскай элітай з тым, каб зняважыць і апаганіць усё бацькоўскае, славянскае, хрысціянскае, нарэшце, дэмаралізаваць моладзь — першачарговая задача тэле- і кінарэжысёраў, сцэнарыстаў, акцёраў, якія дзеля кан'юнктуры ідуць на ўсё (яны здольныя нават са светлых чэхаўскіх "Трох сёстраў" зрабіць нейкіх путан). Не верыце? Сачыце тады за расійскімі пастаноўкамі, адна з якіх такое і прэзентуе.

Нехта задаецца пытаннем: пры чым тут чужое тэлебачанне? Адказваю: па-першае, такое чужое ўжо даўно стала без усялякага разбору і адбору нашым, далёка не першагатунковае, а з душком, што ламае чалавечую псіхіку. Па-другое, як было ўжо сказана, культурнае бязмежжа, як мне здаецца, нікім не кантралюецца. І па-трэцяе, наша родненькае тэлебачанне можа "згатаваць" падчас такое... Ці глядзелі вы, напрыклад, на адным з нашых каналаў "Паўлінку-нью"? Так, тую, купалаўскую. Калі адкажаце адмоўна, то вы шчаслівыя, калі станоўча — няшчасныя. Ніяк не магу пасля прагляду такога "варыва" заставацца абыякавым. Крыўдна за вялікага песняра, за яго бессмяротны твор, які ў сённяшняй інтэрпрэтацыі стаў нейкім балаганам, базарам у поўным сэнсе слова. І ў страшным сне не магу ўявіць Паўлінку з такімі "габарытамі", асабліва прабачце, вышэй за станік, не магу ўявіць беларускае асяроддзе такім разцугляным, бяздумным. Ці падумалі творцы "нью", што рабіць пасля студэнтам і школьнікам, якія вывучаюць класічны твор? І ў дадатак яшчэ "фільм" — на рускай мове. Навошта, з якой мэтай робіцца апошняе, не магу ўцяміць. Няўжо мала тэлеперадач па-руску? Згодна нашай Канстытуцыі ў нас двухмоўе. Вось і добра, на думку многіх. Але ж навошта там, дзе трэба і не трэба, укараняць толькі рускае?! Няўжо і нашых класікаў трэба перакладаць? Прыгадайце, на былым, савецкім, тэлебачанні панавала беларуская мова і ўсім усё было зразумела! Дазвольце задаць яшчэ адно пытанне: а што, калі нашы суседзі пачнуць размаўляць, скажам, на англійскай мове? Тады, выходзіць, і нам імчацца за імі наперадзе Еўропы ўсёй? Не смейцеся з мяне, бо вельмі сумны той смех.

Дзякуючы намаганням усяго нашага народа, нас ужо ведаюць у свеце. А каб нам сапраўды, па-купалаўску людзьмі звацца, трэба будаваць і сваю культуру — неад'емную частку ідэалогіі. Нам дадзена ў спадчыну адна з самых багатых і прыгожых еўрапейскіх моў. І калі мы ўсе ў радасці і бядзе, у будні і ў святы загаворым на ёй, то нас яшчэ больш будуць паважаць. Калі ж хто спачатку не зразумее, то ёсць перакладчыкі.

Як прасветлена пачуваеш сябе, напрыклад, калі глядзіш тэлеперадачы "Тэлебарометр", "Падарожжа дылетанта", у час якіх дасведчаныя, дасціпныя, разумныя іх стваральнікі і вядучыя на роднай мове далучаюць нас да яе, да харства нашай прыроды, багацця гісторыі, абрадаў, звычак, святаў. Або едзе тэлежурналіст у аддалены куточак — вёсачку, мястэчка і вядзе адтуль сваю перадачу, размаўляе з народам, распавядае з дапамогай яго пра сапраўднае, а не гламурнае, будзь яно няладна, жыццё. І не пасля ідылічных, размаляваных перадач хочацца, каб яно стала лепшым, а менавіта пасля такіх. Хораша, калі вядомы музыка гутарыць з вядучай на матчынай мове і з дапамогай апошняй старацца перадаць сваёй субяседніцы яе харство і адначасова ўвесці ў свет сапраўднага мастацтва.

Крыху адступлю ад тэмы, можа, калі зноў задам адно пытанне: хто ў нас герой нашага часу — маладзенькі спевачок ці спявачачка, хто не паспее нешта піскнуць і ўжо — глядзіце — новая зорка? Зноў жа, на вялікі жаль, адзін з тэлевядучых зусім сур'ёзна заявіў шматтысячнай аўдыторыі, маўляў, ты (у дадзеным выпадку ягоны суразмоўца — эстраднічак) сапраўды "настоящий герой нашего времени"...

Нязводныя на нашым экране гараскопы, лахатроны, бла-бла-шоу і яшчэ чорт ведама што, якое нават самай тоўстай дратвай не прышыеш да рэальнага жыцця. Выходзіць, народ нас корміць хлебам, а мы яго байкамі?

Звернемся да аднаго такога шоу — "бла". Ну, няма там аніякага гумару апроч гусінага гагатання і закуліснага падгатаўвання. Разумовае і духоўнае ўбоства, гумар ніжэй за калена, даруйце, чуецца калі-нікалі і ў перадачы "Анекдоты", дзе юнакі і дзяўчаты спаборнічаюць у так званым досціпе. Чаму ім, дарэчы кажучы, не паехаць у тую ж вёску, калгас, сельскі кааператыў, на фабрыку ці завод — называю ўсё, зразумела, без абрэвіятур грувасткіх, каб твар у твар сустрэцца з народам, паглядзець яму ў вочы і на ўсю краіну распавесці пра яго праблемы, яго паўсядзённае жыццё. Менавіта такія перадачы былі б карысныя для ўсіх і для маладога пакалення ў першую чаргу.

Куды падзеліся з блакітнага экрана механізатары, даяркі, настаўнікі, дактары? Эфірнага часу мала? Тады чаму яго хапае розным жванецкім, гальцавым, петрасянам, што за адну сваю перадачу ці канцэрт зарабляюць столькі, колькі не заробяць за ўсё сваё жыццё тыя, пра каго толькі што было сказана? У дадатак яны сваім банальным гумарам і сатырай затопчуць у бруд усё святое — працу, каханне, натхненне, душу і мазгі.

Чаму з перадачы ў перадачу мы цягнем размаляваных вядомых і пачаткоўцаў поп і топ-дзіў, мадэлей? Ніхто не задумваўся, што і пасля такіх перадач, здавалася б, зусім бяскрыўдных, і нашы маладзенькі зрываюцца з родных мясцін і падаюцца на пошукі лёгкага жыцця аж да самага далёкага замежжа, а потым слёзна просяць свае консульствы і пасольствы, каб дапамаглі вярнуцца на радзіму, якую, па сутнасці, самі і па сваёй ахвоце страцілі?..

Усё, пра што тут сказана, толькі маленькая частка айсберга, натыкаючыся на астатнюю, нябачную, нават "Тытанікі" ідуць на дно. І не будзе ўсяленскага інфармацыйнага патопу, калі на нашых тэлеэкранах заспяваюць на ўвесь свой непаўторны голас самадзейныя і прафесійныя калектывы з розных куткоў Беларусі, калі замест віяграў, стрэлак, бліскучых і рознай іншай пасы ва ўсю моц разгуляюцца Цярэшкі, Валачобнікі, Калядкі, Купаллі, калі на змену франкенштэйнам і рознаму іншаму смеццю прыйдзе сваё, нацыянальнае мастацтва, то можна будзе з упэўненасцю сказаць, што страчана яшчэ не ўсё. А народ наш, цярплівы і мудры народ усё бачыць і разумее, здольны адрозніць праўду ад маны, дабро ад зла.

Зноў жа, знойдуцца такія, хто скажа, маўляў, новы час — новыя песні. Так-то яно так, толькі крыўдна і незразумела, чаму мы гэтыя песні пяём без разбору і зноў з чужога голасу. Няўжо сваіх няма, спрадвечных, родных, сардэчных, і голасу свайго няма?.. Ёсць у нас усё. І ў нашых электронных сродкаў інфармацыі ёсць усё для таго, каб яны азірнуліся і ўбачылі, дзе мы жывём, навошта і з чаго жывём. З задавальненнем пачуў анонс новай цікавай, пазнавальнай перадачы "Аддік зваротнага часу". Толькі чаму яна будзе дэманстравацца пасля 23 гадзін, незразумела. Што, для астатняга часу зноў тыя ж "Лічбы", "Дачка садоўніка", "Сэрцу не загадаеш", "Жанчына з водарам кавы", "Час суда"?..

Алег САЛТУК

Фота Кастуся Дробава

«Мой родны кут...»

Многія чытачы ведаюць пра існаванне "Этнашколы", а, магчыма, і ўдзельнічаюць у гэтым цікавым руху, які ў Беларусі набывае ўсё большую моц і аб'ядноўвае людзей розных узростаў і прафесій. Гэта вывучэнне, а часам і адкрыццё гістарычнага мінулага родных мясцін.

Гісторыя "малой радзімы" — тая невычэрпная тэма, якая натхняе члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомага краязнаўцу Ігара Пракаповіча на стварэнне серыі кніг пра родную Пастаўшчыну, дзе ён жыве і працуе настаўнікам геаграфіі. Толькі ў мінулым годзе пабачылі свет шэсць яго кніжак.

Калі вы любіце легенды, казкі і паданні, "Белая панна" закране ваша сэрца лёсам нарачанскай дзяўчыны, якая была замуравана ў слуп па загадзе злодзея-пана. Але ўсё ж засталася ў памяці нарачанскага краю, каб праз вякі расказваць пра сваю любоў да роднай зямлі. Зборнік "Калядны ранак" — пра час і вечнасць, чысціню душы, неабходнасць вернасці вытокам. Аўтар перадае чытачу тонкае ўспрыманне прыроды роднай Пастаўшчыны і харства навакольнага свету. Кніга дыхае ўдзячнасцю за жыццё, якое мы павінны навучыцца берагчы...

Аматары прыгожага пісьменства, якія адчуваюць харство роднай мовы, атрымаюць асалоду пры знаёмстве з кнігай "О Беларусь, мая шыпшына. На радзіме Уладзіміра Дубоўкі". Чытачы даведаюцца пра краявіды і гісторыю родных мясцін вядомага беларускага паэта, пазнаёмяцца з хронікай яго жыцця і творчасці, пачуюць словы землякоў пра Майстра, пра літаратурныя семінары "Даўжанскія вячэры". У кнізе змешчаны вершы маладых паэтаў, якія зацікавяць чытача сваім непадабенствам, арыгінальнасцю.

"Гута-Голбія" — гісторыка-геаграфічны нарыс Галбейскага краю, аднаго з прыгажэйшых куткоў Пастаўшчыны, зацікавіць вучняў і настаўнікаў, краязнаўцаў, а таксама турыстаў. Турысты адкрыюць для сябе рэдкія мясціны, "дзе на невялікай адлегласці можна было б пабачыць прасторы выраўняных прыродай і людзьмі нізін і чароды стромкіх град і асобных узгоркаў, чаргаванне вясёлых змешаных лясоў з маўклівымі і змрочнымі масівамі сапраўднай хваёвай тайгі, суседства глыбокіх і вузкіх далін, імклівых ручаёў з шырокімі паплавамі задуменных "флегматычных" рэк. Шматлікія ж азёры ўвабралі ў сябе безліч колераў і сімпатычных асаблівасцей. Такая прырода нараджае паэтаў, мастакоў, музыкаў, якіх і сапраўды многа на нашай зямлі". Кніга "Гута-Голбія" створана разам з настаўнікам гісторыі Гуцкай СШ Міхаілам Арэхам.

Выйшла ў свет другое выданне кнігі "Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна", у якім значна павялічана доля геаграфічнай інфармацыі. У працы над рукапісам аўтар карыстаўся ўласным досведам 20-гадовай краязнаўчай дзейнасці, калі падчас вандровак і экспедыцый з вучнямі давялося наведаць амаль усе цікавыя куткі раёна. Другой крыніцай з'явіліся даследаванні беларускіх навукоўцаў, кансультацыі з вучонымі, у тым ліку і з універсітэцкімі выкладчыкамі.

Гістарычная хроніка "Паставы" пазнаёміць чытача з цікавай і своеасаблівай гісторыяй невялікага, адметнага сваёй архітэктурай горада. Падарожжа ў гісторыю пачынаецца ад часу сыходу ледавіка і вядзе да пачатку трэцяга тысячагоддзя.

Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення СПБ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ. *Нарадзілася ў 1982 годзе ў Мінску. Скончыла СШ № 51, філалагічны факультэт БДУ і аспірантуру пры гэтым жа універсітэце па спецыяльнасці "тэорыя літаратуры". Выступае ў беларускім друку як перакладчыца мастацкай літаратуры з англійскай, польскай, чэшскай і ўкраінскай моў. Эсэістка. Журналістка. Жыве ў Мінску.*

Нядаўна выйшла ў свет яе першая кніга **"ЦМОКІ ЛЯТУЦЬ НА НЕРАСТ": эсэ ў вершах і прозе** (Мінск, 2008, выдавец І. П. Логвінаў, куратар І. Бабкоў, рэдактар А. Хадановіч, 110 стар., 300 экз.)



"Наша эпоха паступова стварыла не толькі новую мову, але і новае "адчуванне мовы". Прычына гэтага падвойная: "ідэалагізм"... і, больш банальна, адарванасць культуры ад жыцця, творчасць з нічога — і таму з "нічога" і складзеная, безадказная гульня форм і структур."

Аляксандр ШМЕМАН

Гэтая кніжка Марыі Мартысевіч напісана з бязмежнай любоўю да сваёй Айчыны, да ўсіх праяў яе культурнага і грамадскага стану, як пазітыўнага, так і негатыўнага характару. Здаўна вядома, што нянавісць — пачуццё часовае, а вось любоў — паняцце ўстойлівае і нязменнае. Яна не бывае дзіцячай, юнай, сталай ці старэчай. Любоў, як жыццё, — аднойчы і назаўжды. Усё спрадвечнае трымаецца на ёй.

Гэтак прыкладна і мастацкая творчасць, літаратурная, прынамсі.

У яшчэ маладой істоце Марыі Мартысевіч месціцца не толькі дух творцы, але і яго апанента... У ёй ідзе няспынная барацьба за новыя чалавечыя сэнсы, напісаныя старымі, але неўміручымі словамі. Яна стварае тэкст, а яе ўнутраны апанент супрацьпастаўляе яму свой падтэкст, яна піша твор, а апанент яго аналізуе і крытыкуе... Аднак сам стваральны працэс пайшоў, і мастацтва, урэшце, змушана будзе выявіцца...

Цяпер шмат *бачнасці* літаратурнага жыцця і не менш калялітаратурнага шуму, але чамусьці бракуе высокамастацкіх літаратурных твораў, вартых нашага часу (ці наш час варты менавіта такіх нашых твораў?)... Не хапае такой літаратуры, якая б заварожвала, прыцягвала, давала надзею, патаемна прарочыла будучае... Маладыя літаратары нярэдка апраўдваюцца: маўляў, вы, старэйшыя, не разумееце новых глабальных (у тым ліку і ў сэнсе маштабных) павеваў у творчасці літаратараў *апошняга* пакалення... Ну, не скажыце, усё сапраўднае мастацтва якраз дастаткова *зразумелае*, больш за тое, даступнае і даходлівае тым ці іншым сваім бокам (светлым ці зацененым, негатыўным ці пазітыўным) і пазнавальнае ўсімі без выключэння адэкватнымі яго прыхільнікамі. Такая ўжо яго боская прырода.

Іншая рэч, што творчая моладзь, якая ўбіралася ў сілу ў перыяд перабудовы (праяўлення дэмакратыі, галоснасці і плюралізму) і ўсталявання незалежнасці, не развіла і не займела тонкага прыроднага пачуцця гармоніі, самага галоўнага кампанента мастацкай творчасці. Як мне думаецца, *не праяўленне*, а **перавага** свавольства (і самавольнасці) над унутранай свабодай і грамадскай воляй падрэзала крылы для высокамастацкіх палётаў творцам апошняй генерацыі...

Марыя Мартысевіч, на мой погляд, уключыла ў свой тэкставы зборнік усю сябе — былую, існую і магчымую... Адсюль — няроўнасць і неаднароднасць выяўленага душэўнага і разумовага матэрыялу. Не ўцяміўся я ў празмерныя мудрошчы вершаванага цыкла "Сястра Зоя і канец свету". Прасталобнае, як выдатнае школьнае сачыненне на зададзеную тэму, эсэ "Мае беларусіцы". Неблагія ў сваёй шчырасці вершы, на якія, як друкарскія віньеткі, накінуты розныя запазычанасці чужога стылю, а падчас і вобразнасці. Ужо гадоў пятнаццаць вершы маладых паэтаў дыхаюць інтанацыямі і пакутуюць на творчую манеру Бродскага, нераўнуючы як мая істота настальгуе па дурманным паху кавы колішняга бара Дома літаратара. Бара даўно няма, а ўспамін застаўся, і тое "лёгкае дыханне" — таксама... Але *гэтым* смагу не спатоліш і жыццёвы тонус не падымеш...

Апранацца трэба штодня,
нібы сёння плануецца праход
непрыхільнага фэйс-кантролю
ля Райскай Брамы,
а то раптам усё —
а ў цябе недарэчны дрэс-код,
а то раптам фінал —
а ты не па модзе ўбраны;
бо ведаеш Б'ёрк,
што караскаецца на сопку Гекла, —
не найлепшы прыклад жыхаркі
сапраўднага Раю,
за такое належыць гібець у сэканд-хэндзе пекла,
хэпі-энду такога й табе, мой вораг, не раю...

А хацелася б чуць уласны голас паэткі М. Мартысевіч. І трэба сказаць, у асобных вершах і эсэ ён праяўляецца. Як сваё ўласнае — жывое, трапяткое, натуральнае — успрыняўся мной каларытны дзённік "Палеская хроніка", сутнаснае сведчанне Бацькаўшчыны ў пераламленні некалькіх родавых кален. У натуральным сэнсе перажытым, а не віртуальным, падаўся мне цыкл з трох вершаў "Памежныя гісторыі". Гэта ўжо даволі арыгінальныя і ў нечым самабытныя праявы вулканічных выкідаў накопленай паэтычнай энергіі. Іх эратычная падсветка надае тэкстам прыцягальную афарбоўку і сэнсавую таямнічасць. Вядома, не без іранічных пасылаў. Ну вось, хоць бы гэта:

Яна сказала сабе: "Вось прыкол! Апішу ў ЖЖ!"
і вязала яго тэмбрам голасу — слуцкім пасам,
а ён адчуў ціск у пахвіне: "Ну вот, ужэ..." —
і адчайна шукаў нагоды застацца сам-насам.

Думаецца, аўтару трэба больш пэўна вызначыцца ў сваіх літаратурных прыхільнасцях, таму што паэзія — прызванне даволі аўтаномнае па сваім унутраным вызначэнні і, як вядома, патрабуе ўсяго чалавека. Бо хабістаў (ад слова **хобі**) у нас зашмат і дылетантаў дастаткова. Не так даўно ў часопісе "Арион" вычытаў у артыкуле сучаснага рускага крытыка Ганны Кузняцовай "Пир и хор: поколенье ноль" такое: *"Усе гэтыя грувасткія метафары, кучай зваленыя на прымітыўную думу, навязлівыя парадоксы ды іншыя мандрагоры іманентныя засталіся ў сімвалістаў у часы вучнёўства... (...) Звычайны ж сучасны маладзён (ці дзяўчына), што пераадолелі* ***графафобію*** *і засвоілі вялацякучы верлібр, атрымліваюць доступ да асаблівага роду элітарных зносін — пасядзелак сярод мудратварых культуртрэгераў у "прасунутых" кавярнях"*. На мой погляд, *соль* у гэтым выказванні ёсць, і яна характэрная і для нашага літаратурнага працэсу. Хочацца верыць, што М. Мартысевіч усё гэта прайшла і пераасэнсавала, выруліўшы на магістральны шлях мастацкай творчасці. Засталася дробязь: аддацца *свайму* і скончыць *па-свойму*, як тое здаралася з усімі сапраўднымі Паэтамі.

Некаторыя тэксты, артыкулы і эсэ напісаны з палемічным ухілам, гэта значыць, не з адкрытай прымальнасцю некаторых ідэй і рэчаў, а з праявай калі не знешне-выяўнага, дык затоена-ўнутранага пратэсту. Праўда, у гэтых тэкстах яшчэ шмат маладой задзірыстасці і вучнёўства. Адчуваецца "філасофская рука" В. Акудовіча: і там, дзе яна (вядома, віртуальна) дапамагала выводзіць "азы, букі і ведзі", усё прэсна і правільна, а там, дзе маналог дыялагізуецца і пачынае вымежвацца за паняцці "про і контра", праяўляцца "туманная значнасць сэнсаў", і замоўлены *тэкст* набывае рысы арыгінальнага, хоць падчас і няскончанага, **твора**. Скажам, у апісанні Мінска непрыхаванае ёрнічанне з яго савецкасці *перакошвае* любоў аўтара да сваёй сталіцы... Пра Б. Тарашкевіча напісана сцёбным моладзевым стылем, можа, таму і сама яго постаць вымалявалася не зусім адпаведнай апазіцыйнаму і энцыклапедычнаму афіцыёзу (зрэшты, улічваючы цяперашнія мітрэнгі з яго правапісам, тут могуць быць розныя погляды)... Цікава абыграны ў свой час "разрэкламаваны" тэкст У. Арлова *"Незалежнасць — гэта..."* ў эсэ *"Прыгажосць — гэта..."* Непрыхаваныя алюзіі на папярэдніка выклікаюць з сённяшняга погляду горкую іранічную ўсмешку: *"Прыгажосць — гэта незалежнасць", — сказаў, адказваючы на пытанне, порнафатограф Кышштаф Паняводзкі, дысідэнт."* І г. д. У эсэ "Бег, альбо Нацыя эмігрантаў" ёсць не менш цікавыя пасажы, да прыкладу, такі: *"Каб прыдумаць сваю Беларусь, неабавязкова стаяць нагамі на глебе пост-Беларусі, якая дасталася нам у спадчыну. (...) "Не хачу чужога хлеба, радасцяў чужых", — праспяваў калісьці Сокалаў-Воюш — і спакайнютка з'ехаў. Славамір Адамовіч, мусіць, занудзіўшыся без скандалаў, папрасіў палітычнага прытулку ў Нарвегіі і цяпер дасылае ў "Нашу Ніву" з лагера ўцекачоў няхай слабыя, але ўсё-ткі беларускія вершы. Васіль Быкаў за апошнія некалькі год змяніў шэраг краін жыхарства, аднак ад гэтага не перастаў быць беларусам. Святлана Алексіевіч... Хаця Святлана Алексіевіч, для мяне, — якраз з той атары, што памкнулася ў заходнія краі на покліч страўніка. Зрэшты мяне больш цікавяць тыя, хто застаўся тут, а не апынуўся там"*.

Толькі вось чаму ж гэта ўсім беларускамоўным асобам знайшліся важкія прычыны для выезду за кардон, а вось рускамоўная С. Алексіевіч, на думку аўтара, рванула туды толькі дзеля таго, каб не памерці з голаду (?!)... Дзіўна. Па-першае, яна нікуды на зусім не выязджала, а бывае за мяжой па запрашэннях, як, дарэчы, і А. Разанаў. Па-другое, уся гэтая фактура занадта выразна прышпілена аўтарам да "сурдута шчырага беларуса". Бо ўжо праз колькі абзацаў М. Мартысевіч піша, што *"ў краіне пост-Беларусь я — эмігрантка, якая пры першай-лепшай нагодзе ўцякае ад рэчаіснасці"*. Вось якраз падобныя ўцёкі (туташнія, амаль віртуальныя) найбольш антынацыянальныя, яны паказваюць на нашу беларускую няпэўнасць і нетрываласць: крона яшчэ шуміць пад ветрам палітычнага часу, але вось-вось можа рухнуць, бо гістарычныя карані, што яе трымаюць, высахлі на сухім жвіры нашага бяспамяцтва...

У вершаваным інтэрнет-дзённіку "Barbara Radziwil's Livejournal" ёсць такія радкі:

Мой Жыктімонт саромеецца слоў
"аральны секс", і так баіцца маці...
.....
бо ёсць адно, што болей не міне,
пра што пакуль што думаецца ўпотай:
мой Жыктімонт ужо жыве ўва мне
маленькай сарамлівай зыкготкай.

І што гэта за *"маленькая сарамлівая зыкготка"*? Біялагічны наватвор Мартысевіч? Эмбрыён, пачатак чалавечага жыцця ва ўтробе жанчыны?

І хоць Мартысевіч часта высмейвае такія аўтарскія жаночыя "штучкі", аднак частка і яе кніжкі "населена" "чэлесамі" і "похвамі", асабліва ў раздзеле "Частка і цэлае". Прыкрываючыся Бахціным і Рабле, яна спрабуе адной з першых жанчын (В. Морт, В. Бурлак) парушыць табу саромнага і схаванага, а можна сказаць, і маральнага — беларускай лаянкі.

"Нічога дзіўнага няма ў тым, што сучасная моладзь так актыўна занураецца ў глябальнае павуцінне. Гэта ж самая мілая справа — залезці ў Інтэрнет, узяць красамоўны нік (чытай — нацягнуць карнавальныя апранахі), са смакам паразважаць на тэму чэлеса, похвы і іх узаемадачынення, а на развітанне віртуальна арасіць суразмоўцу прадукцыяй матэрыяльна-цялеснага нізу. Show must go on — душа прагне карнавалу! — піша яна. Пры гэтым не забывае зрабіць абсалютна правільную выснову, што пры сучасным ладзе жыцця *"калі ўсё пераварочваецца з* ***ног*** *на* ***галаву****, матэрыяльна-цялесны ніз робіцца вярхоўнай часткай цела"*. Аж бач, у адным месцы яна называе мужчынскі полавы орган "стручком", а ў другім "стручочкам"... Ёсць, як кажуць, адчуванне *меры*. (Ну магу ж, чорт пабяры, і я павысцёбвацца!) Няўжо некаторыя аўтары ўсур'ёз думаюць, што агаліўшы *непатрэбнае*, яны адкрыюць неабходнае, тую сутнасць, без якой *свет няпоўны*? Што праўда, у кароткім курсе айчыннага брыдкаслоўя "Пашлі мяне па-беларуску" М. Мартысевіч выводзіць сябе, як жанчыну, за кантэкст ёй жа напісанага: *"Калі ідзе гаворка пра лаянку, я не за і не супраць яе — я па-за ёю. Праблема цікавіць мяне як феномен"*. У гэтым эсэістычным раздзеле сустракаюцца даволі смешныя, а падчас і парадыйныя дзявочыя развагі, кшталту: *"Самы распаўсюджаны ўсходнеславянскі аналаг* ***трахаць****, шчыра кажучы, абрыд. Душа патрабуе разнастайнасці"*. Заўважце, наколькі блізка і небяспечна тут душа суседнічае з цялесным нізам. Па-другое, няўжо і напраўду аўтару так часта даводзіцца ўжываць гэты тэрмін, што ён пачынае муляць ёй да абрыдлівасці? Разумеючы многія рэчы, Мартысевіч усё часцей ідзе на літаратурную правакацыю, каб прыцягнуць увагу такіх абыякавых і мляўкіх сучаснікаў да маральных і сацыяльных праблем у культурным і духоўным жыцці грамадства. У апошнім міні-эсэ "Мужчыны, якіх мы выбіраем" яна спрабуе *зганьбіць* беларускіх мужчын (вядома, нехта ж павінен несці адказнасць за жаночую бездапаможнасць): *"Няўдачнік — універсальная карма любога мужчыны, на якім стаіць акцыз Belarus, яна ахоплівае як інтэлектуальную сферу, так і матэрыяльна-побытавую. І аналізуючы іх вершы, і прыбіраючы з падлогі іх шкарпэткі, і слухаючы іхнія перадвыбарчыя выступы, разумееш: лузерства той паловы жыхароў Беларусі, якую чамусьці называюць "моцнаю", — з'ява генетычная. Я ўвогуле не ведаю ніводнага беларускага мужчыны, за якога Божаньку можна паставіць заклік па працоўным навучанні"*.

Разумеючы, што ў тэксце больш наўмыснага і намысленага (бо па сваёй прыродзе ён правакацыйны), пажадаем, каб у новым сваім артыкуле "Фемініstкі", над якім цяпер працуе аўтар, было больш прыўкраснага і ўзвышанага, чым гідлівага і нізкага. Ёй жа яе ж словамі скажам:

"Даруй фемініstцы, каторая кажа: усе мужыкі казлы, й канкуруе з нябёсамі
сінню сваіх панчох."

І ўсё ж, шаноўнае спадарства, высновы мае ад прачытання кніжкі, як ні дзіўна, будуць парадаксальныя. Зрабіўшы столькі суб'ектыўных заўваг, я змушаны прызнаць сюжэтную і змястоўную неардынарнасць зборніка, а самога аўтара адоранай творчай асобай. Яе мужная ўласная пазіцыя адносна сучасных рэалій жыцця, самабытнасць, вылучнасць з літаратурнай шараговасці, пазнавальнасць, шчырасць, сумленнасць, прастата і бясхітраснасць, што ў звязку і з'яўляецца праявай творчай натуральнасці, — схіляюць мяне да веры ў яе, няхай і небязвоблачную, але арыгінальную і па-мастацку вартую літаратурную будучыню. Не, не прылізваю сваю крытычную яршыстасць, а як літаратар літаратару аддаю таленавітаму аўтару належнае.

ЛеГАЛ

Літ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:

220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:

галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73

Аддзелы:

публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3567
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 11.06.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 3060

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686